WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 ЛІПЕНЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 140
(27004)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

З 1 ЖНІЎНЯ ПАВЫШАЮЦЦА ПРАЦОЎНЫЯ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕНСІІ

Адпаведны ўказ № 327 «Аб павышэнні пенсій і ўнясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 кастрычніка 2010 г. № 544» 26 ліпеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Указам прадугледжана правесці перараразлік працоўных пенсій у жніўні і лістападзе 2011 года, а таксама павысіць памеры сацыяльных пенсій.

З 1 жніўня перараразлік працоўных пенсій будзе праведзены зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў за II квартал 2011 года. У выніку перараразліку пенсіі павялічацца ў сярэднім на 13 працэнтаў — з Br669 тыс. да Br757 тыс.

Таксама з 1 жніўня павялічацца памеры сацыяльных пенсій: інвалідам I групы (у тым ліку інвалідам з дзяцінства) — з 85 працэнтаў да 100 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму (БПМ); інвалідам з дзяцінства II групы — з 75 працэнтаў да 95 працэнтаў БПМ; інвалідам II групы, дзецям па прычыне страты карміцеля на кожнае дзіця — з 65 працэнтаў да 85 працэнтаў БПМ; інвалідам III групы (у тым ліку інвалідам з дзяцінства) — з 55 працэнтаў да 75 працэнтаў БПМ; дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў пры ступені страты здароўя: першай — з 60 працэнтаў да 80 працэнтаў БПМ, другой — з 65 працэнтаў да 85 працэнтаў БПМ, трэцяй — з 75 працэнтаў да 95 працэнтаў БПМ, чацвёртай — з 85 працэнтаў да 110 працэнтаў БПМ.

З 1 лістапада 2011 года перараразлік працоўных пенсій будзе праведзены зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў за III квартал гэтага года. У выніку перараразліку пенсіі павялічацца ў сярэднім на 7,9 працэнта — з Br757 тыс. да Br817 тыс.

Дадатковыя расходы на выплату працоўных і сацыяльных пенсій з 1 жніўня складуць Br220,6 млрд, а з 1 лістапада — Br370,6 млрд у месяц.

У цэлым для рэалізацыі названых мер спатрэбіцца Br1,4 трлн. Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Мінпрацы і сацабароны мае фінансавыя сродкі ў неабходным аб'ёме.

ПАДЗЯКА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ АБ'ЯЎЛЕНА РАБОТНІКАМ РОЗНЫХ СФЕР

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 25 ліпеня падпісаў распараджэнне, у адпаведнасці з якім Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена работнікам розных сфер.

За высокія дасягненні ў выкананні асноўных прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена калектыву работнікаў ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».

За шматгадовую плённую працу, прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у развіццё і ўдасканаленне Беларускай энергетычнай сістэмы Падзякай Прэзідэнта адзначаны 5 работнікаў гэтай сферы. Сярод іх — начальнік падстанцыі ў Баранавічах Віктар Васілеўскі і токар ААТ «Белаазёрскі энергамеханічны завод» Андрэй Сычык.

Таксама 4 чалавекі ўдастоены Падзякі Прэзідэнта за шматгадовую плённую працу ў падатковых органах, узорнае выкананне службовых абавязкаў і высокія паказчыкі ў прафесійнай дзейнасці.

Дваім работнікам аб'яўлена Падзяка за шматгадовую плённую працу ў сферы землеўпарадкавання, высокі прафесіяналізм і выдатныя якасныя паказчыкі.

Рэктару прыватнай установы адукацыі «Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут» Тамары Алпеевай Падзяка аб'яўлена за шматгадовую плённую працу ў сферы адукацыі, значны асабісты ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Падзяка Прэзідэнта за высокі прафесіяналізм і актыўны ўдзел у рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Беларусь — гэта мы!» аб'яўлена 8 работнікам эстрады, у тым ліку Ірыне Дарафеевай, Іне Афанасьевай, Вікторыі Алешка і Ганне Шаркуновай.

Акрамя таго, Падзякі Прэзідэнта за шматгадовую плённую працу ў сродках масавай інфармацыі ўдастоены 9 работнікаў, у тым ліку кіраўнік дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Ігар Пазняк і палітычны аглядальнік гэтага тэлеканала Алеся Высоцкая, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Рэспубліка» Мая Шэндрык, галоўны рэдактар газеты «Знамя юности» Яўген Мялешка і рэдактар аддзела газеты «Советская Белоруссия» Дзмітрый Крат.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 27.07.2011 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	4 945,00	1 чэшская крона	293,93
▲ 1 еўра	7 167,28	1 польскі злоты	1 792,87
1 латвійскі лат	10 105,24	▲ 1 расійскі рубель	179,52
1 літоўскі літ	2 076,12	1 украінская грыўня	618,55

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	27,5460
10 UAH	34,4583
10000 BYR	55,5251
EUR	39,9389

ЧАСНАКОВЫЯ ШАЛІ

Фота А. Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пенсіянерка з Жодзіна Надзея Дзмітрыеўна ВАШКЕВІЧ аглядае прысядзібны ўчастак. Працавала шмат, таму і ўрадзілі агуркі, бульба, цыбуля, часнок (на фотаздымку). Чакаецца добры ўраджай памідораў, яблыкаў і неблагая капуста.

ЦЭНЫ НА ПАЛІВА ДЛЯ СЕЛЬГАСАРГАНІЗАЦЫЙ НЕ ЗМЯНІЛІСЯ

У цэнах на паліва для сельгасарганізацый не плануецца ніякіх змяненняў, звязаных з прыняццем пастаноў Мінэканомікі № 105 і № 107, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе канцэрна «Белнафтахім», каментуючы інфармацыю ў СМІ аб адмене льготных цэн на паліва для арганізацый аграпрамысловага комплексу.

Як растлумачылі ў прэс-службе Міністэрства эканомікі Беларусі, пастановы ад 12 ліпеня 2011 года № 105 і ад 13 ліпеня 2011 года № 107 «Аб прызнанні страціўшымі сілу некаторых пастаноў Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь» не адмяняюць цэнавае рэгуляванне на нафтапрадукты, а прыводзяць нарматыўныя акты ў адпаведнасць з дзеючым заканадаўствам па цэнаўтварэнні. Дакументы прадугледжваюць адмену раней прынятых Мінэканомікі нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць пытанні цэнаўтварэння на нафтапрадукты. Пастановы Мінэканомікі № 105 і № 107 уступаюць у сілу пасля іх афіцыйнага апублікавання ў газеце «Рэспубліка» 27 ліпеня 2011 года.

У адпаведнасці з указам ад 25 лютага 2011 года № 72 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання цэн (тарыфаў) у Рэспубліцы Беларусь» права рэгулявання цэн па пазіцыі «нафтапрадукты (за выключэннем нафтапрадуктаў, што рэалізуюцца ЗАТ «Беларуская нафтавая кампанія» па пераліку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь)» прадастаўлена канцэрну «Белнафтахім» і жыццяўляецца ім шляхам устанаўлення адпускных і рознічных цэн на нафтапрадукты (у тым ліку рэалізуемыя сельскагаспадарчым арганізацыям), а таксама гранічных і фіксаваных узроўняў аптовых надбавак.

Спажывец

ПРАЛЬНЫЯ МАШЫНЫ, ХАЛАДЗІЛЬНІКІ І ЦУКАР — ЛІДАРЫ ПРОДАЖАЎ У МІНСКУ

Пральныя машыны, халадзільнікі і цукар сталі лідарамі продажаў у Мінску ў студзені—чэрвені 2011 года. Як паведамілі БЕЛТА ў галоўным статыстычным упраўленні Мінска, аб'ёмы іх рэалізацыі ў натуральным выражэнні ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ўзраслі на 83,1 працэнта, 68,1 працэнта і 50 працэнтаў адпаведна.

У цэлым аб'ём рознічнага тавараабароту гандлю праз усе каналы рэалізацыі ў Мінску за студзень—чэрвень гэтага года склаў Br11784,7 млрд і павялічыўся ў супастаўных цэнах на 14,6 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2010 года. Доля продажу тавараў айчыннай вытворчасці гандлёвымі арганізацыямі ў рознічным тавараабароце гандлю склала 61,8 працэнта, у тым ліку прадуктаў харчавання, напіткаў і тытунёвых вырабаў — 77,4 працэнта, нехарчовых тавараў — 45,9 працэнта.

БЕЛАРУСБАНК

С 1 августа 2011 года ОАО «АСБ Беларусбанк» УСТАНАВЛИВАЕТ ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ в иностранной валюте «ВАШ ВЫБОР» основной доход в следующем размере:

- в долларах США, евро:

до 2000 (включительно)	- 9,0 процентов годовых;
более 2000-15000	- 9,5 процентов годовых;
более 15000	- 10,0 процентов годовых:

- в российских рублях:

до 50000 (включительно)	- 9,0 процентов годовых;
более 50000-350000	- 9,5 процентов годовых;
более 350000	- 10,0 процентов годовых.

Установленный размер применяется по ранее действующим и вновь принимаемым вкладам.

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам, опубликована в газете «Звязда» № 106 (26970) за 9 июня 2011 г., а также размещена на сайте

www.belarusbank.by

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ГРУЗАВІК ТАРАНІЎ ЦЯГНІК

Аўтааварыі на чыгуначных пераездах на Гродзеншчыне адбываюцца рэдка. З пачатку года было здзейснена толькі адно такое ДТЗ з цяжкімі наступствамі. Чарговае здарылася ў Зэльвенскім раёне: «КАМАЗ» урэзаўся ў цягнік.

Дваццацішасцігадовы вадзіцель машыны вёз асфальтабетон на будаўнічы аб'ект. У вёсцы Савічы на чыгуначным пераездзе ён праігнараваў светлавую і гукавую сігналізацыю. Адразу ўрэзаўшыся ў першы вагон, «КАМАЗ» у выніку апынуўся паміж дванаццатым і трынаццатым. Таварняк, што рухаўся з Ваўкавыска ў Баранавічы, паспеў праехаць ад месца сутыкнення каля двухсот метраў. Вадзіцель аўтамабіля цудам застаўся жывы. Са шматлікімі раненнямі ў шокавым стане ён змешчаны ў бальніцу. Затрымка ў руху цягнікоў перавысіла дзве гадзіны.

Алег ДУК, старшы інспектар ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Валянцін ВЕРАЦІЛА:

У эпіцэнтры дзяржаўнай палітыкі

«ІНВЕСТАР ПРЫЙДЗЕ ДА ТАГО, ХТО САМ ПАСПЯХОВА ПРАЦУЕ»

З краснасельскага цэменту будавалі сталічны метрапалітэн і Нацыянальную бібліятэку, «Мінск-Арэну» і новыя гарады. А яшчэ раней — Асуанскую плаціну і Суэцкі канал у Егіпце, Астанкінскую тэлебашню ў Маскве, стартавыя пляцоўкі Байканура. Зараз «хлеб індустрыі» з гарадскога пасёлка Краснасельскі ідзе на аб'екты Беларускай атамнай станцыі і на Гродзенскую ГЭС. Аднойчы распачаўшы ў сябе сапраўдную тэхнічную рэвалюцыю, гэты калектыў і сёння працягвае гонку за лідарам, дзе лідар — навукова-тэхнічны прагрэс. Журналісты «Звязды» гутараць з генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Краснасельскбудматэрыялы» Валянцінам Алегавічам ВЕРАЦІЛАМ.

Генеральны дырэктар ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» Валянцін ВЕРАЦІЛА.

— Мы не бачыліся крыху больш за год. На фоне тых 97 гадоў, якія пражыў калектыў, гэта малая часцінка. Тым не менш. Год для вас быў насычаны на падзеі. Што, на погляд генеральнага дырэктара, можна выдзеліць галоўнага?

— На мой погляд, самае важнае, што ўдалося за гэты час — не спыніцца і працягваць рухацца наперад. Нешта не атрымліваецца, не без таго. Нешта адсоўваецца на больш дальнюю перспектыву. Але рух працягваецца, і ранейшая дынаміка захавалася, нават набрала большы тэмп. Менавіта гэта — самае галоўнае сёння. Бо не кожнаму калектыву, які да гэтага дынамічна развіваўся, удалося захаваць і прымножыць такую дынаміку. Некаторыя калектывы «ўзялі паўзу», абдумваюць наступныя крокі, накопліваюць сродкі. У нас не было магчымасці на паўзу, мы рухаемся, рухаемся...

Мяркуйце самі: летась на развіццё асноўных фондаў накіравалі 269 мільярдаў рублёў. На гэты год запланаваны 445 мільярдаў. Калі аглянуцца трохі назад, то на працягу апошняга дзесяцігоддзя, якое ніяк нельга назваць лёгкім для айчыннай эканомікі, увялі адзін пускавы комплекс па цэменце, потым другі пускавы комплекс па цэменце, пабудавалі сучасную вытворчасць па выпуску сухіх будаўнічых сумесяў, тратуарнай плітак, а зусім нядаўна яшчэ і блокаў з ячэістага бетону. А зараз інтэнсіўна вядзецца будаўніцтва новага цэментнага завода па сухім метадзе і паралельна асвойваем новую лінію (па сутнасці — завод) па вырабе вапны, таксама сухім метадам. Калектыў нагадвае стаера, які ўзяў высокі тэмп і ніяк не можа спыніцца.

— Не можа ці не жадае спыняцца?

— Сапраўды, не жадае. Апошнія нашы праекты простымі і лёгкімі не назавеш, але яны будуць рэалізаваны, мы атрымаем яшчэ адну сучасную вытворчасць і найвышэйшую якасць прадукцыі, якая будзе карыстацца попытам не меншым, чым зараз, а нават і большым. Пры адной важнай умове: калі мы будзем інтэграваны ў сусветную эканоміку. Інтэграваны сваімі тэхналогіямі, сваёй вытворчасцю, сваёй прадукцыяй. Бо можна мець высакаякасны, канкурэнтаздольны прадукт, у тым ліку і па цане (што мы дасягнём дзякуючы сухому метаду і іншаму, больш таннаму віду паліва), але, не інтэграваўшыся ў сусветную эканоміку, звузіўшы рынак рамкамі толькі Беларусі, не зможаш вывесці праект у тыя межы акупляемасці, якія былі намечаны бізнэс-планам. Вось гэта — звышзадача, вырашаць якую патрэбна адначасова з рэалізацыяй сумеснага беларуска-кітайскага праекта па будаўніцтве новага цэментнага завода.

Зараз будаўніцтва на такой стадыі, якая дазваляе быць упэўненымі ў паспяховай рэалізацыі. А вось пра інтэграцыю ў сусветную эканоміку варта паклапаціцца. Ужо сёння наш рынак — гэта рынак не толькі Беларусі і краін Еўразэс, але і Еўрасаюза: Прыбалтыка, Польшча, іншыя суседнія краіны.

Інтэграцыя ў сусветную эканамічную супольнасць мае на ўвазе і наяўнасць сур'ёзнага інвестара. Маюцца на ўвазе не абавязкова інвестыцыі ў асноўны капітал. Інвестыцыі могуць ажыццяўляцца і прадастаўленнем рынку збыту прадукцыі, што не менш важна, чым укараненне сусветных тэхналогій. Інтарэс да нашага прадпрыемства сёння праяўляюць некалькі знакамітых замежных фірмаў, па зразумелых прычынах не будзем іх пакуль называць.

Рэалізуючы беларуска-кітайскі праект, карыстаючыся крэдытнымі рэсурсамі кітайскага і айчынных банкаў, мы разумеем, што прыйдзе час, калі спатрэбіцца іх вяртаць. Пакуль мы плацім працэнты. І каб мінімізаваць нагрузку на эканоміку прадпрыемства ў будучыні, нам патрэбен інвестар.

На адгрузачнай пляцоўцы цэментнага завода.

— Наколькі мы разумеем, з увядзеннем у строй новага цэментнага завода далейшае ваша развіццё не завяршаецца.

— У нас 18 працэнтаў агульнага аб'ёму вытворчасці займае вытворчасць вапны. І той праект па яе мадэрнізацыі, які мы зараз таксама рэалізуем, — гэта толькі маленькая доля таго, што патрэбна зрабіць у будучыні. У тым ліку і па зніжэнні энергазатрат. Задача не менш важная, чым цэментны праект. Значыць, сюды таксама патрэбны інвестыцыі.

Мы выпускаем шыфер і азбестацэментныя трубы. Гэта прадукты, якія паступова сыходзяць з рынку. І каб захаваць рабочыя месцы, патрэбна арганізаваць вытворчасць іншага прадукту. Магчыма, таксама дахавага матэрыялу, але іншага. Магчыма, гэта таксама будуць трубы, але іншыя. І патрэбны інвестыцыі для новых тэхналогій, каб забяспечыць работай граматны, адмабілізаваны калектыў. Вось таксама накірунак дзейнасці для зацікаўленага інвестара.

Мы хацелі б стварыць (і маем пэўныя задумкі) яшчэ нейкія тэхналогіі, якія б дазволілі напоўніць рынкі рэспублікі і сумежных краін патрэбнай на гэтых рынках прадукцыяй. Бо, дзякаваць Богу, нараджальнасць у пасёлку Краснасельскі павышаецца, значыць, на перспектыву спатрэбіцца яшчэ большая забяспечанасць насельніцтва рабочымі месцамі.

Клапоцімся і пра напаўненне раённага бюджэту за кошт падаткаў, што важна як для раёна, так і вобласці, нават рэспублікі.

Дзяржава дастаткова дапамагала і дапамагае нам развівацца. Патрэбна больш актыўна зарабляць і ўкладваць у сваё развіццё ўласныя сродкі. Але іх будзе яўна недастаткова. Таму максімальна актыўна займаемся пошукам і прыцягненнем інвестыцый.

Так, мы сёння дастаткова ўстойлівыя фінансава. Стабільна выплачваем дастойную заработную плату. Фінансуем праграмы сацыяльнага характару. У нас на балансе інтэрнат, дзіцячы садок, спартыўныя збудаванні, цудоўны санаторый. Дарэчы, наш губернатар, Сямён Барысавіч Шапіра, пастаянна цікавіцца станам спраў на прадпрыемстве, ходам новага будаўніцтва. Нядаўна ён прысутнічаў на традыцыйнай пятнічнай нарадзе з будаўнікамі з удзелам намесніка міністра архітэктуры і будаўніцтва. Потым мы паказалі яму свой санаторый, і гэтая лячэбная ўстанова атрымала з яго вуснаў станоўчую адзнаку.

— Такім чынам, ваш сацыяльны сектар не з'яўляецца для прадпрыемства непадымным цяжарам...

— Што яшчэ раз сведчыць пра нашы магчымасці. Прадпрыемства ўстойлівае і ў новых для ўсіх нас умовах. Калектыў з разуменнем адносіцца да таго, што робіцца ў краіне, каб выйсці з крызісу. Людзі бачаць, што ў таварыстве пастаянна будуюцца новыя магутнасці, бачаць агульную і сваю ўласную перспектыву. А гэта вельмі важна. Спажывецкі попыт на нашу прадукцыю расце. На тым жа цэментным заводзе людзі разумеюць, што яны не засталіся сам-насам са старой тэхналогіяй, пры якой выкарыстоўваецца дарагі газ. Таму і цана на цэмент такая, што ён у будучыні наўрад ці будзе запатрабаваным... Альбо завод азбестацэментных вырабаў. Яго калектыў не застаўся ў новых умовах адзін на адзін з рынкам толькі са сваім шыферам. Ёсць іншая, куды больш запатрабаваная прадукцыя, і ў першую чаргу — газасілікатныя блокі. Ёсць сухія будаўнічыя сумесі. Усё гэта знаходзіць шырокі збыт. І ёсць магчымасць для хуткай пераналадкі на іншыя вытворчасці. Значыць, ёсць задзел на будучыню.

Вапнавы завод. Там зараз запускаецца абсалютна новая тэхналогія — вытворчасць вапны высокай актыўнасці па сухім метадзе. Спачатку было шмат скептыцызму адносна гэтай тэхналогіі. (Як некалі адносна гідратнай вапны, зараз вельмі запатрабаванага прадукту.) А сёння аператары ўжо ў асноўным навучыліся ўпраўляць працэсам.

І людзі разумеюць, што патрэбна заставацца ў калектыве і працаваць тут. А гэта ў асноўным высокапрафесійныя кадры, у захаванні якіх мы напрамую зацікаўлены.

Калі прыходзіць любы інвестар, то ён, безумоўна, спачатку цікавіцца сыравіннай базай. Завод можна пабудаваць, калі ёсць на чым. Тут у нас усё ў парадку: сыравіна практычна ўся свая, побач з асноўнай вытворчасцю, і высокай якасці. Яе дабычу вядуць некалькі ўласных шагаючых экскаватараў. Але наступнае, чым цікавіцца кожны інвестар, — гэта кадры, наколькі яны падрыхтаваныя і абучаныя. Так што тут у нас таксама ўсё як мае быць. І ўсё, што мы зараз робім на перспектыву, дае права спадзявацца, што ў любых рынкавых рэаліях захаваецца самае галоўнае — калектыў. Калектыў высокага ўзроўню інтэлекту. «Якасць пачынаецца з кадраў» — такі лозунг вы можаце ўбачыць на тэрыторыі прадпрыемства.

Абпальвальшчык Дзмітрый БУДРЭВІЧ, машыніст пнеўмакамерных насосаў Андрэй ПАШКОЎСКІ і абпальвальшчык Сяргей ЦЕЛЕШ працуюць на ўстаноўцы па вытворчасці вапны сухім метадам.

— Такім чынам, ваша сённяшнюю нашу размову можна разглядаць як запрашэнне інвестару?

— Можна разглядаць як нашу гатоўнасць размаўляць з інвестарам. Тым больш, што на ўзроўні кіраўніцтва краіны, урада такое рашэнне прынята. І мы яго падтрымліваем. У Беларусі ёсць станоўчы вопыт работы з інвестарамі, і ў мяне на гэты конт больш аптымізму, чым песімізму. Яшчэ і таму, што любы інвестар разумее: чым хутчэй ён укладзе сродкі ў развіццё перспектыўнай вытворчасці, тым хутчэй яны акупяцца.

За спінай намесніка генеральнага дырэктара Расціслава КУЦАЛАЯ панарама новага будаўніцтва.

СТАР. 4-5

ISSN 1990 - 763X

Кампетэнтна

СЯРЭДНЯЯ ПЕНСІЯ ПА ЎЗРОСЦЕ Ў БЕЛАРУСІ СКЛАДЗЕ Ў ЖНІЎНІ BR798 ТЫС., МАКСІМАЛЬНАЯ — BR1,2 МЛН

Сярэдняя пенсія па ўзросце ў Беларусі з 1 жніўня складзе Br798 тыс., максімальная (для непрацуючых пенсіянераў) — Br1,2 млн. Аб гэтым паведаміла ўчора журналістам міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна, каментуючы ўказ № 327, які прадугледжвае комплекс мер матэрыяльнай падтрымкі атрымальнікаў пенсій у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, перадае БЕЛТА.

Мар'яна Шчоткіна нагадала, што ў ліпені гэтага года ў рэспубліцы была выплачана аднаразовая дапамога пэўнай катэгорыі пенсіянераў — у якіх памер пенсіі быў меншы за два бюджэты пражыткавага мінімуму (не больш за Br150 тыс.). «Сёння Прэзідэнт падпісаў указ, згодна з якім з 1 жніўня будзе праведзены перараразлік усіх працоўных пенсій, выходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў за другі квартал. Пенсіі павысяцца ад 13 працэнтаў да 17 працэнтаў. Пры гэтым сярэдні памер працоўнай пенсіі па ўзросце складзе Br798 тыс., максімальны памер пенсіі для непрацуючых грамадзян — каля Br1229 тыс.», — сказала міністр.

Гаворачы аб сацыяльных пенсіях, яна адзначыла, што ў 2010 годзе было прынята рашэнне і па ўказе Прэзідэнта ажыццяўлялася даплата ў памеры Br40 тыс. да сацыяльных пенсій інвалідаў. З прыняццем указа № 327 пенсіі для інвалідаў, дзяцей-інвалідаў, дзяцей, якія страцілі бацькоў, устаноўлены ў новых, больш высокіх памерах. У прыватнасці, дзецям-інвалідам з 4-й ступенню страты здароўя і інвалідам (у тым ліку з дзяцінства) I групы памер сацыяльных пенсій з 1 жніўня павышаны з 85 працэнтаў да 110 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму; дзецям-інвалідам з 3-й ступенню страты здароўя, інвалідам з дзяцінства II групы — з 75 працэнтаў да 95 працэнтаў БПМ; дзецям-інвалідам з 2-й ступеню страты здароўя, інвалідам II групы (акрамя інвалідаў з дзяцінства), дзецям, якія страцілі бацькоў, — з 65 працэнтаў да 85 працэнтаў БПМ.

Акрамя таго, паводле слоў Мар'яны Шчоткінай, адначасова з 1 жніўня «будзе перагледжаны БПМ у большы бок, таму ўсе сацыяльныя пенсіі будуць таксама пераразлічаны». Кіраўнік ведамства падкрэсліў, то ўказ мае комплексны характар і прадугледжвае яшчэ адно павышэнне пенсій у гэтым годзе. «Ва ўказе адразу, каб не прымаць дадатковы нарматыўны акт, прадугледжаны пераразлік з 1 лістапада працоўных пенсій, выходзячы з сярэдняй зарплаты работнікаў за III квартал», — сказала міністр.

Пры гэтым яна звярнула ўвагу, што памер пенсіі ў кожным канкрэтным выпадку будзе залежаць ад індывідуальнага каэфіцыента і стажу работы пенсіянера, і запэўніла, што ўсе выплаты будуць праведзены своечасова. Дадатковыя расходы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ў сувязі з павышэннем пенсій складуць у жніўні Br240,4 млрд, у цэлым на выплату пенсій будзе зрасходавана Br1,9 трлн. У Беларусі пенсіі з Фонду абароны насельніцтва атрымліваюць 2,5 млн чалавек.

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ПАДЫМУЦЦА ДА НЕБА

Магілёўскае прадпрыемства «Трансмаш» вырабіла два эксперыментальныя ўзоры пажарнай тэхнікі — аўталесвіцу і аўтапад'ёмнік, незаменныя ў справе выратавання людзей у шматпавярховых дамах. «Лесвіцы ў неба» — на 52 і 48 метраў разгортваюцца ў лічаныя секунды.

Раней падобная тэхніка набывалася за межамі Беларусі. Айчынныя аналагі, мяркуецца, будуць на трэць таннейшыя. У бліжэйшы час аўтамабілі будуць праходзіць расійскую сертыфікацыю.

Ілона ІВАНОВА.

Кватэрнае пытанне

ПРАВІЛЫ І ВЫКЛЮЧЭННЕ

Я працую ў саўгасе, жонка — у дзіцячым садку. Жывём мы ў саўгаснай кватэры. Адкажыце, калі ласка, ці выселяць з яе нашу сям'ю ў тым выпадку, калі я перайду на іншую работу?

Аляксандр, *Дубровенскі раён.*

Згодна з п. 2 Палажэння аб уладанні, карыстанні і перадачы ва ўласнасць грамадзянам жылых дамоў (кватэр), пабудаваных сельскагаспадарчымі арганізацыямі (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 студзеня 2006 г. № 59), такія жылыя памяшканні, пабудаваныя за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, мясцовых мэтавых бюджэтных жыллёва-інвестыцыйных фондаў, інавацыйных фондаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, а таксама за кошт ільготных крэдытаў, падлягаюць уключэнню ў вызначаным парадку ў лік службовых жылых памяшканняў. Карыстанне такімі жылымі памяшканнямі вызначаецца правіламі дагавору найму службовага жылога памяшкання.

Што да высялення з такога памяшкання, то, у адпаведнасці з п. 2 вышэйназванага Палажэння, яно ажыццяўляецца на падставах, прадугледжаных Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь і іншымі заканадаўчымі актамі.

Згодна з артыкулам 96 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, работнікі, якія спынілі працоўныя адносіны (прычым, незалежна ад падстаў) з прадпрыемствам, установай, арганізацыяй, падлягаюць высяленню з гэтага жылога памяшкання з усімі грамадзянамі, якія пражываюць з імі, без выдзялення іншага жылога памяшкання, акрамя выпадкаў, прадугледжаных Кодэксам.

У сілу часткі 2 арт. 96 ЖК асобныя льготныя катэгорыі грамадзян, якія пражываюць у службовых жылых памяшканнях, не падлягаюць высяленню без выдзялення іншага жылога памяшкання. У прыватнасці, са службовага жылога памяшкання не могуць быць выселены без выдзялення іншага жылога памяшкання грамадзяне, якія прапрацавалі на прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі, што выдзелілі ім службовае жылое памяшканне, не менш як 10 гадоў. Пры гэтым улічваецца толькі стаж працы наймальніка службовага жылога памяшкання менавіта на гэтым прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі.

Акрамя таго, дзейнае заканадаўства не змяшчае нормаў, якія дазваляюць змяняць дагавор найму займаемага службовага жылога памяшкання (пры звальненні наймальніка і пераходзе на іншую працу) у сувязі з прызнаннем наймальнікам члена сям'і (у гэтым выпадку жонкі наймальніка, якая працуе ў арганізацыі сацыяльна-культурнай сферы, што абслугоўвае работнікаў сельскагаспадарчай арганізацыі) замест першапачатковага наймальніка службовага жылога памяшкання.

Віктар САВІЦКІ.

СВЯТА СНАПА-ГАСПАДАРА

Услед за Гомельшчынай і Брэстчынай першыя камбайны выйшлі на палі Мінскай вобласці. Але якое жніво без «зажынак»? Нашы продкі лічылі, што без гэтага свята збіраць ураджай нельга. Таму аграрыі СПК «Шчомысліца» Мінскага раёна адзначылі свята снапа-гаспадара. Сёлета тут збіраюцца сабраць больш за дзесяць тысяч тон зерня. Галоўнае, каб было такое ж добрае надвор'е, як і на «зажынках».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара. *Мінскі раён.*

Па традыцыі, каб ураджай быў добры, гаспадару трэба падкінуць першы сноп уверх і злавіць. На здымку: старшыня праўлення Васіль ЦІШКОЎ.

Камбайнер Павел ЮРКОЙЦЬ з памочнікам Віктарам РУДКОЎСКІМ.

Зваротная сувязь

Выязныя прыёмы даюць магчымасць дапамагчы канкрэтнаму чалавеку і атрымаць аб'ектыўную інфармацыю аб рабоце сістэмы

ВЫЯЗНЫЯ ПРЫЁМЫ грамадзян даюць магчымасць дапамагчы канкрэтнаму чалавеку і атрымаць аб'ектыўную інфармацыю аб тым, як працуе сістэма на практыцы, выявіць яе недахопы. Такую думку выказаў учора журналістам у Гродне старшыня Вярхоўнага суда Беларусі Валянцін Сукала, які правёў асабісты прыём грамадзян у абласным выканаўчым камітэце, перадае БЕЛТА.

На прыём з пытаннямі, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі судовых органаў, запісаліся 15 чалавек. У асноўным да старшыні Вярхоўнага суда звярталіся з просьбай адмяніць або перагледзець пакаранне па той ці іншай крымінальнай справе. Усе пытанні, што паступілі ў час выязнога прыёму, узяты старшынёй Вярхоўнага суда пад асабісты кантроль. На працягу месяца тыя, хто звярнуўся з пытаннямі, атрымаюць адказы.

Як адзначыў Валянцін Сукала, практыка рэгулярнага правядзення выязных прыёмаў прадстаўнікамі Вярхоўнага суда зарэкамендавала сябе са станоўчага боку. «Задаволены людзі, і мы атрымліваем важную, аб'ектыўную інфармацыю», — сказаў ён пасля прыёму. На думку Валянціна Сукалы, такія сустрэчы даюць магчымасць убачыць, што адбываецца ў судовай сістэме на месцах, у чым яе слабасць. Даволі часта ў выніку выязных прыёмаў Вярхоўны суд уносіць карэктывы ў судовыя рашэнні. Гэта работа таксама дапамагла выявіць, якія змяненні неабходны ў судовай сістэме ў цэлым.

Старшыня Вярхоўнага суда адзначыў, што сёння судовая сістэма Беларусі асвойвае новыя шляхі, накіраваныя на агульнае павышэнне эфектыўнасці правасуддзя. Паводле слоў Валянціна Сукалы, у бліжэйшыя 5 гадоў у правасуддзі будуць ставіцца акцэнты на змяншэнне карных працэдур на карысць прымірыцельных. У такім кантэксце выпрацаваны канкрэтныя задачы ў частцы адміністрацыйнага, крымінальнага, грамадзянскага правасуддзя.

У Гродне старшыня Вярхоўнага суда Беларусі таксама правёў рэгіянальную нараду, на якой былі вызначаны задачы перад судамі ўсіх узроўняў у сувязі з удасканаленнем судовай сістэмы.

Хто стане студэнтам БДУ?

У сёлетнюю ўступную кампанію на 2094 месцы дзённай бюджэтнай формы навучання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта падаў свае дакументы 4051 абітурыент.

У вядучай навучальнай установе агульны конкурс склаў 1,93 чалавека на месца (у 2010 — 1,8). 1060 чалавек (а гэта 33 працэнты) прэтэндэнтаў на «пасаду» студэнта БДУ маюць сумарны бал вышэй за 300. Сярод абітурыентаў 596 чалавек скончылі школы з медалямі ці маюць дыпломы каледжаў з адзнакай.

Найбольш папулярнымі ў абітурыентаў сёлета сталі такія спецыяльнасці, як «Дызайн» (накірунак — камунікатыўны дызайн) — конкурс 14,6 чалавека на месца, «Дызайн» (накірунак — дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя) — конкурс 7,7; «Праваznаўства» (на скарочаны тэрмін навучання для выпускнікоў юрыдычных каледжаў) — 6,1; спецыяльнасці Інстытута бізнэсу і менеджменту тэхналогій — 4,4; «Міжнародныя адносіны» — 4,1; «Журналістыка» (накірунак — аўдыявізуальная журналістыка) — 3,9; «Менеджмент» (гуманітарны факультэт) — 3,8.

Дарэчы, сёння, каб даведацца пра вынікі ўступнай кампаніі, зусім не абавязкова ехаць ва ўніверсітэт. 27 ліпеня на інтэрнэт-сайце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ўпершыню ў нашай краіне будзе праводзіцца прамая відэатрансляцыя пасяджэнняў прыёмнай камісіі. Такім чынам, абітурыенты, а таксама іх бацькі змогуць убачыць, як адбываецца залічэнне ў вядучую вышэйшую навучальную ўстанову, не толькі знаходзячыся ў галоўным корпусе БДУ, дзе на насценным экране арганізавана відэатрансляцыя з залы Вучонага савета ўніверсітэта, але і ў інтэрнэт-сетцы. Відэатрансляцыя пачынацца з 15.00.

Першымі пра свой лёс даведаюцца абітурыенты, якія падалі дакументы на бюджэтную форму навучання. Да 1 жніўня стануць вядомымі прозвішчы ўсіх, хто паступіў на бюджэт. А 3 жніўня пра свой лёс даведаюцца і абітурыенты, якія прэтэндуюць на бясплатнае завочнае навучанне.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой» извещает своих акционеров о том, что выплата дивидендов по итогам 1 полугодия 2011 года будет осуществляться с 15 августа по 13 октября 2011 года путем перечисления средств на счета акционеров в отделениях ОАО «АСБ Беларусбанк» (согласно решению общего собрания акционеров — протокол № 14 от 26 марта 2011 года). Справки по телефону 245 61 41.

УНП 100068131

Крымінал

Узяў, колькі трэба

Жыхар Брагіна пакінуў свой незачынены «Фальксваген-Пасат» днём на тэрыторыі мясцовага камбіната бытавога абслугоўвання, а ў ім — партаманет з грашыма, дакументамі на машыну, пашпартам і банкаўскай карткай.

Невядомы скарыстаўся сітуацыяй і выкраў партаманет. Яго міліцыя знайшла за 20 метраў ад машыны. Цікава, што «высакародны» злодзей узяў далёка не ўсё — толькі Br650 тысяч і 300 расійскіх. Астатнія Br500 тысяч, $5, €5 і ўсе дакументы засталіся на месцы.

Вока ды вока

Раскладную дзіцячую каляску ля паліклінікі пакінула бестурботная маці ў Гомелі ўсяго на 15 хвілін. Гэтага часу было дастаткова для злодзея, які выкраў сродак перасоўвання дзіцяці.

Нядоўга прабыла ў спецыялізаванай краме гамяльчанка, але змагла прыхапіць дзве пары абутку. Калі спрацавала супрацькрадзежная сігналізацыя, яна не разгубілася і пабегла далей разам са здабычай, хоць яе пераследвалі супрацоўнікі магазіна. 32-гадовая, раней судзімая грамадзянка паспела схавацца, аднак усё ж яе разам з выкрадзеным абуткам знайшла міліцыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Абзац

У Беларусі сёлета плануецца здабыць 1,68 млн тон нафты. Аб гэтым ішла размова на нарадзе «Белнафтахіма» і «Беларуснафты» па пытаннях здабычы нафты ў Беларусі, перадае БЕЛТА.

Учора ў Мінску адбыўся выбух на помпавай станцыі. У 9.15 на каналізацыйнай помпавай станцыі № 9 вытворчасці «Мінскачыствад» унітарнага прадпрыемства «Мінскводаканал» (раён праспекта Пераможцаў) выбухнула газапаветраная сумесь без наступнага гарэння. Пацярпелі пяцёра супрацоўнікаў рамонтнай брыгады «Мінскачыствада». З траўмамі рознай цяжкасці яны шпіталізаваныя. Магчымай прычынай выбуху называюць парушэнне правілаў тэхнікі бяспекі пры правядзенні рамонтных работ.

Навальнічны фронт з парывамі ветру да 14 м/с, які прайшоў увечары 25 ліпеня па тэрыторыі краіны, прывёў да абясточвання і падтаплення многіх населеных пунктаў. У Валожынскім раёне з-за разраду маланкі загарэўся цялятнік — на пажары загінулі 55 цялят. У Віцебску за гадзіну выпала 39 мм ападкаў, што адпавядае дэкаднай норме. Моцны ліверь прывёў да падтапленняў падвальных памяшканняў і прыватных падворкаў.

Поўны абзац

Аднагадовы хлопчык з Індыі па імені Акшат Саксена ўстанавіў новы сусветны «рэкорд». Ён нарадзіўся з 34 пальцамі на нагах і руках. У дзіцяці, што жыве з бацькамі на поўначы Індыі, па сем пальцаў на кожнай руцэ і па дзесяць — на кожнай назе. Такія звесткі прыводзяцца ў Кнізе рэкордаў Гінэса. З моманту нараджэння ён пераважу ужо некалькі аперацый, з дапамогай якіх ампутуюцца лішнія пальцы. Хірургі імкнуцца прывесці яго канечнасці ў норму. Пры гэтым у хлопчыка няма вялікіх пальцаў. Іх урачы збіраюцца рэканструяваць з матэрыялу выдаленых. Дагэтуль найбольшая колькасць пальцаў была ў хлопчыка з Кітая — 31 (15 пальцаў на руках і 16 — на нагах). Падчас паслядоўных аперацый усё лішняе выдалілі.

Жыхар ПАР прачнуўся ў моргу, куды яго адправілі родзічы, вырашыўшы, што ён памёр. Мужчына, імя якога не называецца, моцна заснуў у сваім доме. Яго доўга спрабавалі пабудзіць, аднак зрабіць гэта не ўдалося. Тады яго палічылі мёртвым і пазванілі ўладальніку прыватнага морга. Той выслаў машыну, кіроўца праверыў у старога чалавека (80 гадоў) пульс і сэрцабіццё, аднак не заўважыў ніякіх прыкмет жыцця і забраў цела. Праз суткі дзядуля прачнуўся. Ён стаў крычаць, патрабаваць, каб яго выпусцілі з ячэйкі морга. Двое дзяжурных супрацоўнікаў, пачуўшы крыкі «ўваскрэслага», палічылі яго за прывід і кінуліся бегчы. На вуліцы яны сталі клікаць на дапамогу, аднак потым супакоіліся і вярнуліся. «Экс-пакойніка» адправілі ў бальніцу з падазрэннем на пераахаладжэнне, аднак медыкі адпусцілі яго дадому. Там якраз ішло абмеркаванне дэталяў пахавання...

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Объявление о проведении Минским городским судом торгов по продаже недвижимого имущества

Квартира № 54 в доме 11 по ул. Карбышева в г. Минске, двухкомнатная, общей площадью 46,5 кв. м, принадлежащая Лущу А. Д.

Начальная стоимость реализуемого имущества — 294 000 000 (Двести девяносто четыре миллиона) рублей.

Время проведения торгов — 08.08.2011 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Дунина-Марцинкевича, д. 1, корп. 3.

По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться к старшему судебному исполнителю Минского городского суда Кашкан Наталье Леонидовне по телефону 207 24 09 с 9.00 до 18.00 или по адресу: г. Минск, ул. Д. Марцикевича, д. 1, корп. 2, каб. 122 (здание суда Фрунзенского района г. Минска).

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АХВЯРАМІ АВІЯКАТАСТРОФЫ Ў МАРОКА СТАЛІ 78 ЧАЛАВЕК, ТРОЕ ВЫЖЫЛІ

Ахвярамі крушэння ваенна-транспартнага самалёта Lockheed C-130 Hercules на поўдні Марока ў аўторак сталі 78 чалавек, яшчэ трое атрымалі цяжкія раненні, паведамляе інфармацыйнае агенцтва Maghreb Arabe Presse.

Паводле інфармацыі афіцыйных крыніц, на борце самалёта знаходзіліся 60 вайскоўцаў, 12 грамадзянскіх асоб і 9 чалавек экіпажа. Трое параненых пасажыраў ужо дастаўлены ў ваенны шпіталь горада Гулімін, недалёка ад якога адбылася авіякатастрофа: самалёт урэзаўся ў гару.

«Інцыдэнт адбыўся ў пустэльнай горнай мясцовасці», — паведаміў раней прадстаўнік міністэрства ўнутраных спраў Марока. Паводле яго слоў, ваенна-транспартныя самалёты такога тыпу звычайна выкарыстоўваюцца для перавозкі вайскоўцаў і іх сем'яў.

Ён таксама адзначыў, што прычынай авіякатастрофы магла стаць смуга і дрэнныя ўмовы надвор'я.

АБАМА ЎВЁЎ САНКЦЫІ СУПРАЦЬ «БРАТВЫ» З СНД

Прэзідэнт ЗША Барак Абама падпісаў распараджэнне, якое ўводзіць санкцыі ў дачыненні да буйных сусветных злачынных груповак, у тым ліку з краін СНД. Распараджэнне змешчана на сайце Белага дома.

Актывы злачынных груповак у ЗША ў адпаведнасці з дакументам будуць замарожаны. У распараджэнні пералічваюцца чатыры буйныя злачынныя супольнасці, у дачыненні якіх уводзяцца санкцыі. Гэта «братва» (The Brothers' Circle), якая дзейнічае галоўным чынам на тэрыторыі былых савецкіх рэспублік, неапалітанская «Камора», японская якудза і мексіканская групоўка «Зетас» (Los Zetas).

На сайце міністэрства фінансаў ЗША гэтым групоўкам даецца кароткая характарыстыка. Як высветлілася, у «братву» ўваходзяць не толькі прадстаўнікі груповак з постсавецкіх рэспублік, але і злачынцы з Блізкага Усходу, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Як гаворыцца ў распараджэнні прэзідэнта ЗША, дзейнасць буйных злачынных груповак дасягнула такіх маштабаў, што стала пагражаць стабільнасці сусветнай эканамічнай і палітычнай сістэмы.

БЕЛЫЯ АМЕРЫКАНЦЫ АКАЗАЛІСЯ БАГАЦЕЙШЫМІ ЗА «КАЛЯРОВЫХ» У 20 РАЗОЎ

Фінансавая яма, якая аддзяляе белых амерыканцаў ад прадстаўнікоў расавых меншасцяў, дасягнула рэкордных памераў за ўсю гісторыю. Інфармацыя была атрымана на аснове аналізу звестак, атрыманых падчас апытання Бюро перапісу ЗША. Белая сям'я мае ў 20 разоў большы капітал, чым афраамерыканская, і ў 18 разоў — чым лацінаамерыканская.

ЖЫХАРЫ БЕДНЫХ КРАІН БОЛЬШ ШЧАСЛІВЫЯ

Парадокс, але людзі, якія жывуць у багатых краінах, менш шчаслівыя і больш прыгнечаныя, чым у бяднейшых. Такую інфармацыю падае Сусветная арганізацыя аховы здароўя, якая апытала 89000 чалавек у рамках глабальнага даследавання, піша The Independent.

Так, у Францыі, Нідэрландах і ЗША на дэпрэсію скардзіліся больш за 30% рэспандэнтаў, у параўнанні з 12% у Кітаі. У цэлым у краінах з высокім прыбыткам хоць раз у жыцці з дэпрэсіяй сутыкаўся кожны сёмы (15%). А ў краінах з сярэднім і нізкім узроўнем прыбыткаў — кожны дзявяты (11%).

Рэкардсменам жа па колькасці прыгнечаных жыццём людзей з'яўляецца Індыя. Тут самы высокі ўзровень дэпрэсіі ў свеце — 36%. Паводле меркавання экспертаў, гэта звязана з тым, што краіна перажывае беспрэцэдэнтныя сацыяльныя і эканамічныя змены, якія часта выклікаюць у грамадстве ўпадніцкія настроі.

Таксама даследаванне паказала, што жанчыны пакутуюць ад дэпрэсій удвая часцей, чым мужчыны. Псіхолагі папярэджваюць: дэпрэсія можа адмоўна адбіцца на працаздольнасці чалавека, яго ўзаемаадносінах з навакольнымі, а таксама на якасці жыцця. У найбольш цяжкіх выпадках расстройства настрою пагражае самагубствам. Штогод у свеце фіксуецца 850 тысяч такіх выпадкаў.

І ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯМ СЭРЦА НЕ СУЦЕШЫЦЬ

Леанід Рубінштэйну гэтыя хвіліны вяртаўся думкамі ў жудаснае мінулае.

ЗНОЎ рэха самай жудаснай вайны: на нашай шматпакутнай зямлі знойдзены яшчэ некалькі месцаў масавага знішчэння мірнага насельніцтва. Сем дзесяцігоддзяў гэтыя сведкі фашысцкіх злачынстваў маўчалі, зарастаючы лесам і травою. У выніку працы камісіі па ўвекавечванні памяці ахвяр Халакосту ў Беларусі — архіўных звестак і паказаннях жывых сведак — убачыць свет яшчэ адна невядомая старонка вайны. Цяпер гэтую праўду не знішчыць, не схаваць, не забыць. Урочышча Ялаваста, вёска Ахоцічы, вёска Жылічы... Сціплыя помнікі-абеліскі нагадваюць пра тое, чаго забываць мы не маем права.

Вёска Жылічы Кіраўскага раёна вядомая цяпер сваім палацавым комплексам і вялікім паркам. Некалі ў палацавых пакоях месціліся аўдыторыі саўгаса-тэхнікума, а сярод рэліктавых дрэў бегала навучэнская моладзь, не ўяўляючы, што ў яе пад нагамі. Толькі некаторыя старэйшыя жыхары Жылічаў жылі з памяццю, як пасля акцыі знішчэння насельніцтва тут літаральна варушылася зямля. Адна з жыхарак вёскі, якой на пачатку вайны было толькі шэсць гадкоў, прыгадала: «...У час вайны я жыла ў панскім доме. Адночы немцы прыгналі аднекуль яўрэяў, хоць у нас яны не жылі. Гэта былі ў асноўным маладыя мужчыны. Я бачыла ўласнымі вачыма, як іх расстрэльвалі. Я залезла на гарышча і праз дзіркі назірала, як мужчын прымушалі капаць ямы, а потым ставілі да краю і страляліі...»

У мінулую нядзелю ў жыліцкім парку было сумна і балюча ад успамінаў. На цырыманіі адкрыцця помніка ў памяць аб 200 забітых яўрэях-бежанцах з Заходняй Беларусі сваімі жудаснымі ўспамінамі дзяцінства дзяліўся жыхар Кіраўска Рыгор Каган. Ён, 11-гадовы яўрэйскі хлопчык, быў адзіны, хто застаўся жывым пасля знішчэння рагачоўскага гета. Вязняў гета расстрэльвалі 20 сакавіка 1942 года. Тады ў Рыгора загінулі бацькі, брат, сястра, бабуля. Хлопчык не разумеў, за што была наканавана гэткая цяжкая кара. Гэта цяпер яму вядома, што толькі за тое, што яны мелі яўрэйскую нацыянальнасць, іх забівалі, а то і закопвалі жывымі. Хлопчыка выратавалі беларускія жанчыны-сялянкі, якім праз шмат гадоў прысвоена ганаровае званне «Праведнікаў народаў свету».

Сціплы абеліск у жыліцкім парку абуджае і памяць, і сэрца.

Жыхар Бабруйска Леанід Рубінштэйн нарадзіўся ў пасёлку Свіслач пад Асіповічамі. Калі прыйшлі немцы, ягоны дзед, адчуўшы нядобрае, выправіў з хаты сваю дачку з трыма малымі дзецьмі. Дзякуючы гэтаму хлопчык і застаўся жывы. А яўрэйскае насельніцтва Свіслачы чакаў гэткі ж жудасны прысуд, як і яўрэяў Рагачова, мінскага гета, Бабруйска і соцен іншых гарадоў, мястэчак і вёсак.

Ціха гарэлі ля помніка свечкі, прамаўляўся кадзіш — яўрэйская малітва, сумна іграла скрыпка. Плакала. Не хавалі слёз ні моладзь, ні людзі старэйшага ўзросту. У гэткія хвіліны нельга быць моцным. Колькі помнікаў бязвінных ахвяр ужо аплакана нашчадкамі і колькі яшчэ будзе праліта слёз?!.

— За сем гадоў Камісіяй па ўвекавечванні памяці ахвяр Халакосту ўстаноўлена 55 знакаў-помнікаў, — кажа каардынатар праекта помніка ў Жылічах Ігар Краверскі. — Цяпер за год адкрываем да дзесяці і невядомых раней месцаў трагедыі, і старых мемарыялаў пасля рэстаўрацыі.

Вялікую дапамогу ў рэалізацыі праекта памяці ўжо не першы год аказвае фонд сям'і Лазарусаў з Вялікабрытаніі, сем'і Клетэр і Гейслер з ЗША. Майкл Лазарус, які заўсёды прыязджае ў Беларусь на жалобныя цырымоніі, сказаў: «Я гляджу на свет праз прызму Халакосту. Мемарыяльны праект — гэта магчымасць дакрануцца да памяці загінулых і нагадаць, што мы пра іх помнім».

Яшчэ адно месца непапраўнай трагедыі вайны ў Кіраўскім раёне — амаль бязлюдная вёска Ахоцічы. На граніце пліты я прачытаў: «У памяць аб 130 яўрэях, пазверску закатаваных фашыстамі ўвосень 1941 года».

— Дакладнага месца гібелі людзей не ўстаноўлена, бо часта акцыі забойства адбываліся ноччу альбо наогул без сведкаў. Але ёсць факт, што ў вёску Ахоцічы яўрэяў прывялі ці прывезлі з Любонічаў і знішчылі недзе ў навакольлях гэтай вёскі, — патлумачыў Ігар Краверскі, кладучы да падножжа абеліска маленькі каменьчык — яўрэйскі сімвал таго, што магіла не забыта, што яе наведваюць.

Не забытымі былі месцы Халакосту і ў Івацэвіцкім раёне — у лясным урочышчы Ялаваста побач з пасёлкам Косава і каля вёскі Святая Воля. У панядзелак там таксама ўзгадвалі сотні ахвяр. У Святой Волі (нават назва не дапамагала, не ратавала) свой апошні прыстанак знайшлі больш за чатырыста ні ў чым не вінаватых людзей.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Кіраўскі раён.

Не дай Бог гэтай дзяўчынцы звед аць тое, што перажылі яе бабулі.

Для Майкла і Дзіяны Лазарусаў з Вялікабрытаніі вельмі важна, што на месцах Халакосту паўстаюць, нарэшце, помнікі.

ВЫПАЛІЛІ ГЕРБІЦЫДАМІ

Ля вёскі Ведрыч Рэчыцкага раёна была знойдзена плантацыя канопляў памерам 300 на 40 метраў (12 000 кв.м). Каб знішчыць 2 тоны гэтай расліны, міліцыянерам прыйшлося звярнуцца да аграрыяў. Канопліе былі выпалены з дапамогай гербіцыдных хімічных рэчываў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«Вагон цукру — 20 тон, або месячную норму — разабралі за два дні»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

НЕ ПАСПЕЛІ мы даць адказ на скаргу жыхара Радашковічаў, які наракаў на адсутнасць на працягу некалькіх дзён у гандлі цукру («Звязда» ад 22 ліпеня), як літаральна на наступны дзень па «гарачай лініі» паступіў аналагічны зварот. Толькі на гэты раз тэлефанавала чытачка з Пінскага раёна.

Паводле яе слоў, цукру няма ў крамах каля тыдня. Прынамсі, яна згадвала гандлёвыя прадпрыемствы ў гарпасёлку Лагішын, вёсцы Цялесніца. «Набыла вядро абрыкосаў, дык давялося выкінуць іх, бо дома няма ні кілаграма цукру, а ў крамах — паліцы з-пад гэтага тавару пустыя. Спрабавала патэлефанаваць у раённае спажывецкае таварыства, даведацца, у чым справа, дык там слухаўку кідаюць, толкам нічога не гавораць. Я разумею, што зараз ажыятаж, аднак і гандлю, лічу, трэба было б загадзя паклапаціцца пра стварэнне якіх запасаў. Або абмежаванні нейкія ўводзіць: пэўную колькасць кілаграмаў «у адны рукі», распавяла нам пра сваю праблему заяўніца.

Пра ажыятаж мы ўжо паведамлялі ў мінулы раз, пацвердзіла яго наяўнасць на тэрыторыі, у прыватнасці, і Пінскага раёна **таваравед харчовых тавараў Лагішынскага гандлёвага філіяла «Янтар» Пінскага раённага спажывецкага таварыства Іна КАМЯК**. Ці можна было да яго падрыхтавацца, як пра тое зазначыла наша чытачка?

— Гэты ажыятажны попыт — цалкам штучна створаная сітуацыя. Людзі, напалоханыя чуткамі пра магчымае (як яны ўпэўнены, чакаецца падаражанне цукру да больш чым 8 тысяч рублёў за кілаграм), кінуліся скупляць яго мяхамі. Мяркуйце самі. Апошнімі днямі мы атрымалі вагон цукру (а гэта 20 тон!), а разабралі яго літаральна за два дні! Гэта пры тым, што нават у сезон нарыхтовак, калі попыт на салодкі пясок традыцыйна некалькі павялічваецца, такой колькасці хапіла б на месяц гандлю. Гэта я кажу пра той жа леташні ліпень, — паведаміла Іна Сяргееўна. — Пэўныя часовыя абмежаванні — прадаваць аднаму чалавеку па 2-4, не больш за 5 кілаграмаў цукру, — мы спрабавалі ўводзіць. Каб была магчымасць кожнаму, і вашай чытачцы ў тым ліку, набыць кілаграм-другі салодкага пяску для тэрміновай патрэбы. Аднак пакуль спахапіліся, той цукар амаль што ўжо расхапалі. Магу толькі сказаць, што мы чакаем паступлення яшчэ 20 тон цукру, якія будуць размеркаваны сярод крам раёна згодна з колькасцю людзей, якія пражываюць у канкрэтных населеных пунктах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ЧАКАННІ ВАДЫ

Зварот у рэдакцыю

Да нас патэлефанаваў жыхар вёскі Прысушына Віцебскага раёна, інвалід другой групы Мікалай Цімафеевіч БОНДАР, які расказаў аб праблеме з водазабеспячэннем свайго населенага пункта.

Па словах пенсіянера, водаправод у вёсцы Прысушына, дзе сёння пражывае каля 200 чалавек, быў пакладзены яшчэ ў савецкі час, яго абслугоўваннем займаўся мясцовы калгас. Пасля развалу Саюза калгасную гаспадарку ўзяў у арэнду фермер, у тым ліку — і свідравіну. Нараканняў на водазабеспячэнне ў людзей не было, хоць магутнасцяў адной свідравіны і для абслугоўвання мясцовага жывёлагадоўчага комплексу, і на патрэбы вёскі ўжо не хапала. Некалькі гадоў таму водаправод перадалі на баланс ЖКГ. «Яны збіраліся зрабіць новую свідравіну, але вынікаў іх работы не відаць», — патлумачыў Мікалай Цімафеевіч, — а мы другі год сядзім без вады. З трубы ў асноўным цячо пясок. Раней мы бралі ваду ў крыніцы, але яна апошнім часам перасохла. Камунальнікі ўсё абяцаюць, ды абяцаюць. Калі ж, нарэшце, у вёсцы з'явіцца нармальная вада?»

Каб атрымаць адказы на гэтыя пытанні, мы звярнуліся ў Задубраўскі сельвыканкам, на чыёй тэрыторыі знаходзіцца вышэйназваная вёска.

— Пытанне водазабеспячэння знаходзіцца на стадыі вырашэння, — запэўніў нашага журналіста **старшыня сельвыканкама Сяргей МАКУХА**.

Паколькі адна свідравіна несла на сабе вялікія нагрузкі, бо забяспечвала вадой і жыхароў вёскі, і жывёлагадоўчы комплекс, падчас існавання Савецкага Саюза было вырашана зрабіць там яшчэ адну — менавіта для задавальнення патрэб насельніцтва, патлумачыў кіраўнік сельвыканкама. Планы нават пачалі ажыццяўляцца, але з-за развалу СССР давесці работы да канца не паспелі. Недабудаваная воданапорная вежа разам са свідравінай так і засталіся «замарожанымі», а для прамысловых і грамадскіх патрэб мясцовыя жыхары па-ранейшаму выкарыстоўвалі ваду з першай свідравіны.

Спадчыну калгаса — з усімі камунікацыямі, у тым ліку водаправоднымі сеткамі і дзвюма свідравінамі — узяў у арэнду фермер. Падачу вады ў вёску ён забяспечваў, але, натуральна, дабудоўваць «замарожаную» вежу фермер не ўзяўся з-за вялікага кошту работ. Потым, у адпаведнасці з Указам № 21, водаправодныя сеткі былі перададзены на баланс ЖКГ. Аднак фермер адмовіўся перадаваць дзейную свідравіну, якая забяспечвала патрэбы яго фермы. Такім чынам, камунальнай службе трапілі самі водаправодныя трубы і недаробленая свідравіна. Пасля правядзення ацэнкі затрат было ўстаноўлена, што прасцей зрабіць новую свідравіну і ўзвесці вежу, чым займацца рамонтам старой.

Асноўны аб'ём будаўнічых работ ужо завершаны (свідравіна і вежа ёсць). Цяпер ЖКГ займаецца пракладкай неабходных інжынерных камунікацый для падключэння новай свідравіны да цэнтральнага водаправода. Кіраўніцтва камунальнай службы абяцае завяршыць усё да канца лета.

— Увогуле, гэта праблема «з барадой», але асноўную работу на яе вырашэнні мы ўжо зрабілі, — дадаў Сяргей Віктаравіч. — Для ЖКГ гэта прыярытэтная задача, бо пытанне знаходзіцца на асабістым кантролі старшыні райвыканкама.

Як патлумачыў старшыня сельвыканкама, пакуль што вёска па-ранейшаму сілкуецца ад фермерскай свідравіны. Яе магутнасцяў не хапае, таму перыядычна здараюцца перабоі з падачай вады ў хаты. Людзі пра гэта добра ведаюць, таму запасаюцца вадой загадзя, ці бяруць ваду з крыніцы.

Нават пасля ўвядзення ў эксплуатацыю новай свідравіны цэнтральны водаправод не будуць «адразаць» ад фермерскай. Яна застанецца «рэзервам» для вёскі на выпадак чарговага «форс-мажору».

Інга МІНДАЛЁВА.

МУС прапануе забараніць продаж алкаголю асобам маладзейшым за 21 год

Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі выступае за ўвядзенне забароны на продаж алкаголю асобам маладзейшым за 21 год. Аб гэтым заявіў учора журналістам намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі МУС Алег Каразей, перадае БЕЛТА.

Прапанова аб павелічэнні ўзросту, пасля дасягнення якога можна набываць спіртное, ужо аформлена ў выглядзе законапраекта, і, як сцвярджае прадстаўнік МУС, гэты дакумент «бурна абмяркоўваюць у Савеце Міністраў». У падтрымку ініцыятывы выказваюцца Міністэрства аховы здароўя і МУС, у той час як большасць іншых міністэрстваў займаюць нейтральную пазіцыю па гэтым пытанні, а Мінгандаль лічыць гэту прапанову дачаснай. Як растлумачыў Алег Каразей, праваахоўнікі разглядаюць забарону на набыццё алкаголю асобамі да 21 года як адну з мер прафілактыкі п'янства і алкагалізму, а адпаведна і мноства правапарушэнняў, якія ўчыняюць нецвярозыя грамадзяне.

Прадстаўнік МУС таксама праінфармаваў, што на ўзроўні ўрада разглядаецца пытанне аб неабходнасці ўвядзення адказнасці бацькоў за тое, што пакінулі дзяцей без нагляду. Падставай сталі шматлікія выпадкі, калі па халатнасці або няўважлівасці бацькоў гінуць малалетнія дзеці. Напрыклад, сярод 211 чалавек, якія патанулі ў гэтым годзе на вадаёмах Беларусі, 13 — непаўналетнія, узрост якіх пераважна не перавышаў 10 гадоў.

МУС пачало выкарыстанне GPS-бранзалетаў

Міністэрства ўнутраных спраў укараняе сістэму электроннага маніторынгу для кантролю месцазнаходжання асуджаных. Электронныя бранзалеты прызначаны для вызваленых з месцаў пазбаўлення волі асоб, якія маюць патрэбу ў дадатковым кантролі.

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, падобная практыка будзе спрыяць значнаму скарачэнню расходаў на ўтрыманне асуджаных у месцах пазбаўлення волі за кошт прызначэння альтэрнатыўнага віду пакарання — абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Мера павінна паўплываць і на зніжэнне рэцыдыўнай злачыннасці.

Крымінальна-выканаўчыя інспекцыі Ленінскага і Першамайскага РУУС сталіцы, а таксама Мінскага РУУС, прыступілі да доследнай эксплуатацыі сістэмы электроннага маніторынгу за асуджанымі без накіравання ў папраўчыя ўстановы. У бліжэйшы час гэтую сістэму пачнуць выкарыстоўваць і ў Дэпартаменце аховы МУС. Укараненню практыкі папярэднічала вывучэнне адпаведнага досведу ў Расіі, Ізраілі і Вялікабрытаніі. Сістэма складаецца з базавай станцыі, якая ўстанаўліваецца па месцы пражывання асуджанага, і лёгкага электроннага бранзалета. Чалавек свабодна можа перасоўвацца на невялікія адлегласці ад станцыі, якая будзе фіксаваць час уваходу-выхаду чалавека з зоны яе дзеяння, а таксама спробы вынішчэння апошняй або бранзалета. У будучыні праваахоўнікі, верагодна, змогуць сачыць і за фізічным станам асуджаных.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Бяспека на дарозе

СМЯРОТНАЯ ХУТКАСЦЬ

Магілёўская ДАІ звяртае ўвагу кіроўцаў на хуткасць руху. Штодзень да адміністрацыйнай адказнасці прыцягваюць у сярэднім 160 парушальнікаў хуткаснага рэжыму.

У Кіраўскім раёне паблізу вёскі Пархімкавічы аўтамабіль «БМВ» з'ехаў у кювет і перакуліўся. На месцы загінуў 35-гадовы вадзіцель, а 45-гадовы пасажыр шпіталізаваны.

У Клімавіцкім раёне 28-гадовы жыхар вёскі Барсукі на аўтамабілі «Фальксваген Каравела» на закругленні дарогі не выбраў бяспечную хуткасць і апынуўся ў кювеце. Ён атрымаў смяротную траўму.

Падобная аварыя здарылася і ў Бабруйскім раёне. Вадзіцель «Мазды» перавысіў хуткасць, страціў кантроль над аўтамабілем, які перакуліўся. За рублём быў 27-гадовы бабруйчанін, ён памёр на месцы.

За паўгода ў рэгіёне адбылося тры дзясяткі ДТЗ з прычыны перавышэння хуткасці, у якіх 7 чалавек загінулі і 30 атрымалі траўмы, паведаміла інспектар аддзела прапаганды і агітацыі Магілёўскай ДАІ Вольга Вяршубская.

Ілона ІВАНОВА.

Фота Магілёўскай ДАІ.
ДТЗ у Кіраўскім раёне.

«АБМЫЛІ» АЎТО — І ЗА РУЛЬ

Чатыры разы раней судзімы, у тым ліку і за кіраванне транспартам у нецвярозым стане, 25-гадовы жыхар Віцебскага раёна зноў сеў за руль «пад мухай».

Купіў аўто і, не маючы вадзіцельскіх правоў, прыехаў у вёску да сябра «абмыць» пакупку. Выпілі, і кіроўца вырашыў пакатацца сябру клас ваджэння па сельскіх вулачках. Катаўся, праўда, нядоўга, бо супрацоўнікі ДАІ спынілі машыну.

Як паведаміла «Звяздзе» памочнік пракурора Віцебскага раёна Наталля Сеўрукова, вадзіцель без правоў на гэты раз прыгаворам суда арыштаваны на шэсць месяцаў. Яго прымусова будуць лячыць ад хранічнага алкагалізму.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДЗЕЦІ Ў КЮВЕЦЕ

На мінулым тыдні ў Магілёўскай вобласці дзеці і падлеткі 4 разы станавіліся ўдзельнікамі ДТЗ.

23 ліпеня ў Клічаўскім раёне пацярпела 4-гадовае дзіця, якое ехала разам са сваім бацькам у аўтамабілі «Грэйт Вол». Мужчына не справіўся з кіраваннем на прасёлачнай дарозе, і ў выніку іншамарка з'ехала ў кювет, а потым у меліярацыйны канал.

У гэты ж дзень у Крычаве 9-гадовая дзяўчынка, якая каталася на веласіпедзе, сутыкнулася з «Фальксвагенам». Сама веласіпедыстка не пацярпела, затое яе двухгадовы пасажыр атрымаў траўмы.

20 ліпеня ў вёсцы Вейна Магілёўскага раёна на дарогу раптам выбегла 8-гадовая дзяўчынка і трапіла пад колы «Міцубішы». На наступны дзень у Бабруйску ў двары дома на 4-гадовага хлопчыка наехаў «Форд Мандэа», які рухаўся заднім ходам.

Ва ўсіх выпадках дзеці атрымалі траўмы. Магілёўская ДАІ заклікае ўсіх удзельнікаў руху, дарослых і дзяцей, быць пільнымі.

— На жаль, летняя статыстыка ДТЗ з удзелам непаўналетніх бязрадасная, — адзначае інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Таццяна Старасотніка-ва. — 16 дзяцей пацярпелі на дарогах Магілёўскай вобласці. У кожнай аварыі ёсць віна дарослых, недастатковы бацькоўскі кантроль.

Ілона ІВАНОВА.

Фота Магілёўскай ДАІ.
Здарэнне ў Клічаўскім раёне, у выніку якога пацярпела 4-гадовае дзіця.

ПАД КОЛЫ ТРАПІЎ ТРАКТАРЫСТ

Як паведаміў Андрэй Бародзіч, інспектар АДАІ Мядзельскага РАУС, інцыдэнт адбыўся на полі каля вёскі Воўчына ў гадзіну дня.

24-гадовы трактарыст ААТ «Мядзельаграсэрвіс» паставіў свой «Амкадор» пад ухілам на «ручнік». Сам вылез з кабіны. Побач знаходзіўся 23-гадовы работнік таго ж сельгаспрадпрыемства, які аглядваў свой «МТЗ». Раптам «Амкадор» «пасунуўся назад», на трактарыста «МТЗ», які стаяў спінай да тэхнікі. Зразумела, што малады чалавек не паспеў нічога зрабіць, каб уратавацца ад «жалезнага волата» — «Амкадор» прыціснуў яго да суседняга трактара. Мужчына страціў прытомнасць і на «хуткай» са шматлікімі траўмамі быў дастаўлены ў раённую бальніцу. На момант напісання артыкула стан пацярпелага ацэньваўся як стабільны, ён выпісаны з бальніцы. Па гэтай справе вядзецца разбор.

Аляксандр СЯНЮЦЬ.

Пяць на пяць

5 ПОМНІКАЎ КУЛЬТУРЫ, ПРА ЯКІЯ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ БЕЛАРУС

(5 суб'ектыўных меркаванняў)

КУЛЬТУРА складана падаецца тлумачэнню. Бо, па сутнасці, культура паўсюль. Культура сярод нас. Культура над намі. Культура — гэта не толькі выяўленчае мастацтва, як недальнабачна могуць лічыць многія. Гэта яшчэ і культура жыцця, культура мыслення, культура паводзін, гэта, разам з тым, яшчэ і кінематограф, архітэктура, музыка, літаратура і нават тэлебачанне. Скептыкі могуць не прызнаваць значнасці культуры і яе ўплыву на жыццё грамадства... Але, калі б не было культуры, нас не было б таксама. Альбо, прынамсі, мы былі б зусім іншымі... У гісторыі сусветнай культуры шмат рэчаў, з'яў, твораў і працэсаў, якія неверагодна паўплывалі на ход гісторыі, на фарміраванне светапогляду і перакананняў, на норавы і паводзіны.

«Звязда» вырашыла даведацца, якія ж помнікі (артэфакты) культуры важныя для беларусаў, што паўплывала на фарміраванне нашага менталітэту і нацыянальнага характару, на нашу ўнікальную нацыянальную культуру. Свае топ-5 помнікаў культуры, пра якія павінен ведаць кожны беларус, назвалі пяць вядомых у галіне культуры Беларусі і свету людзей. Выбар стракаты, суб'ектыўны, незвычайны ў кожнага з апытаных. Творцы кіраваліся сваім жыццёвым і творчым мастацкім досведам, выбіраючы важныя для беларусаў артэфакты. Вось у скульптара з Віцебска Валерыя Магучага вельмі «скульптурная» падборка —- акцэнт на матэрыю і форму. У паэта Віктара Шніпа — літаратурацэнтрычная. У мастака Вячаслава Паўлаўца — выбар засяроджаны на візуальным сімвалічным успрыманні. Рэжысёр-аніматар Ірына Кадзюкова, аўтар вядомага мультфільма пра Святых Пятра і Фяўронню, рэкамендуе помнікі хрысціянскай культуры. Спявачка Ірына Дарафеева кіравалася сваім уласным досведам і ўспамінамі пра падарожжы па Беларусі — выбрала важныя, на яе думку, культурныя мясціны. Цікавыя меркаванні цікавых людзей заўжды цікава параўнаць са сваімі ўласнымі. Насамрэч, выбраць важныя для беларусаў помнікі культуры не так ужо і лёгка. А якой была б вашая пяцёрка?

Ірына КАДЗЮКОВА, рэжысёр-аніматар:



1. Каложская царква ў Гародні. Таму што гэта насамрэч рэдкая прыгажосць. І такі ўнікальны старажытны помнік у нас. Гэта не можа не хваляваць...

2. Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку. Я, дарэчы, не бачыла яе вельмі даўно. Зараз чытала цэлую кнігу пра раскрытыя фрэскі і ўзгадала, як адзін святар-іканапісец мне паказваў гэтую кнігу далёка ў Расіі і казаў: «Вы разумееце, што раскрыццё і публікацыя гэтых фрэсак ставіць вашу Беларусь (ён так казаў, хоць ён расійскі святар!) у адзін шэраг з фрэскамі ў Равэне. То боК, гэта такі ўзровень, што ўвогуле проста неверагодна! Потым я купіла гэтую кнігу ў нас. І думала: Божа мой, які сорам, я тут пра яе не ведала, пра гэтую кнігу, хоць, натуральна, ведала пра царкву.

3. Вострая Брама. Я дастаткова часта бываю ў Літве. І Вострая Брама — гэта месца, дзе проста трапеча сэрца. Я вельмі люблю прыходзіць туды, асабліва вечарам, калі наверсе ззяе ікона Маці Божай Вастрабрамскай. І людзі ідуць пад гэтай аркай. Калі пад'язджаю да Вільні, мне абавязкова трэба ў вузкую шчылінку паміж дамамі ўбачыць Вострую Браму з іншага боку. Так чароўна, што да яе проста прымыкаюць жылыя дамы. Там побач знаходзіцца Свята-Духаў манастыр, дзе захоўваюцца мошчы Трох Віленскіх Мучанікаў. Для мяне гэта адно з такіх значных месцаў.

4. Сафійскі сабор у Кіеве. Сафія Кіеўская — гэта нешта неверагоднае! І вельмі кідаецца ў вочы: гэтая Сафія і наша Спаса-Еўфрасіннеўская царква — сёстры. Нашы і кіеўскія фрэскі — гэта па абліччах, тварах бачна — як родныя. Гэта абсалютна такі свой вобраз, адрозны ад расійскага. Тут заўжды нешта адбываецца з сэрцам. Я асабіста гатова туды вяртацца і вяртацца. Там можна стаяць гадзінамі. Калі я прыязджаю ў Кіеў, я проста іду ў Сафійскі сабор і, колькі ў мяне ёсць часу, — знаходжуся там. Можна проста заплюшчыць вочы і дыхаць гэтым паветрам. Для мяне гэта неабходны жыццёвы фермент — прыязджаць у такія месцы.

5. Горад Суздаль. У гэтым горадзе я гатова бываць бясконцую колькасць разоў. Там столькі прыгажосці! Абсалютна незвычайнае месца! Колькі я туды ні езджу, колькі ні бачу — увесь час быццам наноў для сябе адкрываю! Гэта вельмі старажытны горад. Увесь горад — усяго тры кіламетры прыблізна. І на іх 56 ці 58 манастыроў і цэрквяў. Там ідзеш і бачыш: дом, дрэва, царква; дом, дрэва, царква. Там нельга будаваць высока, вышэй за два паверхі. І ты бачыш усю гэтую прыгажосць, не загароджаную ніякімі новабудоўлямі. Там практычна няма транспарту. Ну, ездзяць машыны, а гарадскога няма. Там і арыентуешся так: вось мне трэба ды тых купалоў, альбо да гэтых. І пайшоў. І гэта яшчэ пакуль захаваная (але, на жаль, і яна пачынае ўжо знікаць) чырвоная лінія дамоў, калі ўсе фасадамі стаяць на вуліцу. Чароўныя вокны распісныя! Ну і, безумоўна, манастыры, якія глядзяць адзін на аднаго. Там такая цішыня, небывалы пейзаж! І цікава, што колькасць насельніцтва там сёння такая ж, якая была ў XI стагоддзі! У Суздалі Таркоўскі здымаў «Андрэя Рублёва». Мне нават паказвалі месца, дзе Барыска адліваў звон — там застаўся яшчэ такі след, канаўка. Калі гляджу кіно, я цудоўна бачу, з якіх месцаў гэта здымалася і што за манастыры адтуль бачныя. Нават вядомы італьянскі сцэнарыст Таніна Гуэра, калі яго спыталі, дзе ён хацеў бы жыць, адказаў: «Там, дзе я жыву, альбо ў Суздалі». Яго, дарэчы, туды завабілі мае калегі-аніматары. Ён сябруе з Андрэем Хржаноўскім, які здымаў па сцэнарыі Гуэры фільм. Гуэра, наогул, любіць анімацыю, піша для анімацыі.

Вячаслаў ПАЎЛАВЕЦ, мастак:

Пяць помнікаў культуры, якія зрабілі ўплыў на мой асабісты духоўны свет і якія я прапаную ведаць свядомым беларусам.

1. Фрэскі Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы ў Полацку ўражваюць індывідуальнай манерай выканання, якая не падобна ні на старажытнарускі, ні на візантыйскі сакральны жывапіс і якая вызначае асаблівасці духоўнага нараджэння беларускага этнасу.

2. Арнамент беларускага ручніка сведчыць пра глыбокі і складаны духоўны свет нашых продкаў, якія ўкладалі вялікі сэнс у геаметрычныя знакі, ператвараючы іх у сімвалы сувязяў пакаленняў, пра высокае тэхнічнае майстэрства беларускіх жанчын.

3. Абарончы храм у Сынкавічах — унікальны помнік беларускай готыкі. Спалучэнне двух супрацьлеглых вектараў у чалавечай існасці — рэлігія і вайна. Гэткі востраў духоўнага ў жорсткім навакольным свеце.

4. Мастацтва Фердынанда Рушчыца нарадзілася з узаемадзеяння мастацкай адукацыі, атрыманай у расійскай сталіцы XIX стагоддзя, і польскіх культурных традыцый. Вынікам сталі творы, што вызначылі духоўны сэнс зямлі, якая зараз называецца Беларусь.

5. Архітэктурная забудова вёскі Гальшаны захавала тыповыя рысы беларускага мястэчка. Разам існуюць касцёл, царква, замак, кірмашовы пляц, старажытнае гарадзішча, капліца, вадзяны млын, кляштар... Машына часу пераносіць у свет, амаль не кануты ўладай Саветаў.

Ірына ДАРАФЕЕВА, спявачка:

1. Сафійскі сабор у Полацку. Калыска Беларусі... Адзін з найстаражытнейшых храмаў у Беларусі, першы мураваны храм. Пабудаваны ў 1040-я—1060-я гг. у незалежным Полацкім княстве Усяславам Чарадзеем. Храм неверагоднай прыгажосці, ён мае вялікае значэнне для беларускай гісторыі. Таму пра яго трэба ведаць усім. У Сафійскім саборы я нават спявала. Там зала з такой незвычайнай акустыкай! Там «Белвідэацэнтр» здымаў фільм «Дарогі Ірыны Дарафеевай». Таму для мяне гэты помнік культуры важны яшчэ і асабіста. Адмыслова хочацца назваць такія не заезджаныя месцы, каб было больш цікава. Самае прыемнае тое, што гэтыя мясціны зараз знаходзяцца ў такім еўрапейскім, даведзеным да ладу стане, што насамрэч любому чалавеку, які прыехаў і хоча пазнаёміцца з Беларуссю, трэба там пабываць. Ну а беларусам сам Бог загадаў ведаць такія месцы, удыхаць пах старажытнасці, шанаваць нашу культурную спадчыну.

2. Брэсцкая крэпасць. Гэты помнік культуры і гісторыі павінен ведаць кожны беларус. Па-першае, гэта надзвычайна важнае месца для беларусаў — сімвал Перамогі, бо падчас Вялікай Айчыннай у Беларусі загінуў кожны трэці. І сёння ў Брэсцкай крэпасці ёсць цудоўны музей, які распавядае пра жудасныя першыя дні вайны... Па-другое, Брэсцкая крэпасць — выдатны прыклад велічнай абарончай архітэктуры.

3. Лідскі замак. Найцудоўнейшы замак у горадзе Ліда. Пабудаваны ў 1330-ыя гг. па даручэнні вялікага князя Гедыміна. У мінулым меў вялікае значэнне, бо ўваходзіў у лінію замкаў супрацькрыжацкай абароны. Сёння гэта цудоўны помнік культуры, гісторыі, архітэктуры. Такое не заезджанае выдатнае месца. Сёння яго рэстаўруюць. Спадзяюся, Лідскі замак, як і многія іншыя адрэстаўраваныя помнікі культуры Беларусі, набудзе еўрапейскую дагледжанасць і лоск.

4. Палацава-паркавы ансамбль Румянцавых-Пашкевічаў у Гомелі. Гэта адно са шматлікіх цікавых месцаў у Беларусі, дзе я таксама пабывала. І хочацца называць тыя месцы, якія пакінулі прыемныя ўражанні. Там не проста архітэктурны комплекс, там ёсць музеі, экскурсаводы вельмі цікава распавядаюць пра гісторыю гэтага выдатнага будынка, яскравага ўвасаблення беларускага дойлідства.

5. Нясвіжскі замак. Літаральна гады тры таму я была там, рабіла фотасесію, рыхтавалася да канцэрта ў Мірскім замку. І тады ў замку вялікіх Радзівілаў ішла вялікая рэканструкцыя. Я была ўражана, наколькі прыгожы замак, наколькі добра рэстаўруюць. Зараз, калі рэстаўрацыя ўжо, напэўна, скончана, там ёсць на што паглядзець. Пра Нясвіжскі замак павінен ведаць кожны беларус, бо гэта неад'емная частка нашай гісторыі, архітэктурны помнік, які сведчыць пра велічны беларускай шляхты.

Валерый МАГУЧЫ, скульптар:

1. Піраміды Хеопса. І наогул, піраміды, як нешта створанае чалавецтвам ці іншымі істотамі і дасюль не зразумелае. На маю думку, піраміды сведчаць пра тое, што чалавек у гэтым космасе не адзінокі. Насамрэч, пра гэта аднолькава важна ведаць як беларусам, так і іншым насельнікам Зямлі, таму што такія помнікі культуры важныя для эвалюцыі ўсяго чалавецтва.

2. Даліна Наска. Гэта такая старажытная рытуальная пляцоўка ў Перу, памерам з касмадром. На яе паверхні можна ўбачыць знакі гіганцкіх памераў, прычым толькі зверху. Гавораць, што яны незразумелага паходжання. Існуе безліч версій, якія тлумачаць, адкуль гэта ўзялося і для чаго было патрэбна. Але загадка даліны Наска таксама сведчыць пра тое, што чалавек у гэтым свеце не адзін і што жыццё не зацыкліваецца на зямным існаванні.

3. Парыж. Выдатны французскі горад, які сведчыць пра тое, што згуртаванне людзей дало магчымасць развіцця мастацтва і стылю ў еўрапейскім кантэксце. Парыж — гэта сімвал усяго, што звязана з культурай адукаваных людзей.

4. Віцебск. Горад, у якім я жыву. Прыгожы загадкавы беларускі горад з велічнай культурнай гісторыяй. Віцебск — як зародак сучаснай культуры Беларусі, які дае магчымасць паказваць на прыкладзе развіцця віцебскай мастацкай школы, як гэта ўсё пачалося. І ў Беларусі сёння існуюць мастацкія школы, акадэміі. Але нараджалася беларуская мастацкая адукацыя ў Віцебску. Горад сам па сабе мае вельмі шмат містычных метафарычных рыс.

5. Валуны. У Беларусі вельмі шмат валуноў, камянёў з адзнакамі, якім у мінулым пакланяліся язычнікі альбо з якімі звязаны нейкія факты нашай гісторыі. Таму я называю не нейкі канкрэтны валун, а беларускія валуны ў прынцыпе. Напрыклад, Рагвалодаў камень. І падобныя валуны ёсць у інкаў і іншых народаў... Я скульптар, я працую з матэрыяй, матэрыяльнымі рэчамі. А камяні — гэта жывыя прадметы, гэта сляды вечнасці. На камянях засталіся адбіткі стапы, рукі... Пра валуны трэба ведаць, каб лепш зразумець чалавецтва. Беларускае і агульначалавечае — усё звязана. Бо чалавек адзіны.

Віктар ШНІП, паэт:

1. Статуты Вялікага Княства Літоўскага. Бо яны былі напісаны на беларускай мове. Яна была дзяржаўнай ў ВКЛ. І гэта было стагоддзі таму. Гэта наша гісторыя, наша культура, таму пра гэта павінен ведаць кожны беларус.

2. Крыж Еўфрасінні Полацкай. Гэта знак таго, што яшчэ ў сівыя стагоддзі Беларусь была еўрапейскай дзяржавай. І Бог жыў на Беларусі заўсёды.

3. Белая вежа ў Камянцы. Яна як сведка таго, што нашы продкі былі мужнымі ваярамі, якія баранілі свае землі. Белая Вежа — помнік гэтаму, сімвал. Белая Русь — Белая Вежа. Кожны павінен ведаць пра мужнасць, годнасць і смеласць беларусаў.

4. Нясвіжскі замак. Тут, зразумела, Радзівілы. Пра іх ведае ўвесь свет, таму павінен ведаць і кожны беларус. Вядомы шляхетны род, які шмат зрабіў для Беларусі.

5. «Вянок» Максіма Багдановіча. Сведчанне таго, што беларуская мова заўсёды была прыдатнай для стварэння паэзіі еўрапейскага ўзроўню. Тое, што было напісана Максімам Багдановічам сто гадоў таму, і сёння не страціла ні актуальнасці, ні хараства. Сапраўдная паэзія.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Кватэраздатчыкі Мінска ў I паўгоддзі заплацілі Br7,76 млрд падаходнага падатку

У Мінску за студзень—чэрвень гэтага года ад фізічных асоб, якія атрымліваюць даходы ад здачы ў наём памяшканняў, у бюджэт горада паступіла Br7762,7 млн падаходнага падатку. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-цэнтры інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Мінску.

Сума добраахвотных паступленняў ад гэтай катэгорыі плацельшчыкаў павялічылася ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на Br1191,1 млн. На 1 ліпеня ў сталіцы ў якасці плацельшчыкаў фіксаваных сум падаходнага падатку з даходаў ад здачы памяшканняў у наём зарэгістравана 33730 кватэраздатчыкаў. Іх колькасць у параўнанні са справаздачнымі данымі на 1 ліпеня мінулага года павялічылася на 5387 плацельшчыкаў, або на 19 працэнтаў.

У першым паўгоддзі адносна фізічных асоб, якія атрымліваюць даходы ад здачы ў наём памяшканняў, праведзена 370 выніковых праверак. Па выніках кантрольных мерапрыемстваў даналічана Br103,5 млн, у тым ліку падаходнага падатку Br84,4 млн, у бюджэт паступіла Br99,7 млн, што складае 1,3 працэнта агульнай сумы добраахвотных паступленняў за названы перыяд ад гэтай катэгорыі плацельшчыкаў.

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельагроэнергосервис» (продавец)

извещает о проведении 29 августа 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1.	Здание административно-бытовое с инвентарным номером 340/С-27065, склад-ангар с инвентарным номером 340/С-27066, гараж на две автомашины с инвентарным номером 340/С-27067, автомобильная площадка площадью 3216 кв.м. и благоустройство	Гомельская обл., Речицкий район, д. Пригородная, ул. Урожайная, 5	852 134 000	85 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельагроэнергосервис», Индустриальный проезд, 11, 246027, г. Гомель.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Гомельагроэнергосервис») р/с 3012200550013 в Гомельском обл. упр. ОАО БЕЛ АПБ, МФО 151501912, УНН 400068169 **по 25 августа 2011 года включительно.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по **25 августа 2011** включительно.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой

ЗВЯЗДА 27 ліпеня 2011 г.

Валянцін ВЕРАЦІЛА:

«ІНВЕСТАР ПРЫЙДЗЕ ДА ТАГО, ХТО САМ ПАСПЯХОВА ПРАЦУЕ»

Культура вытворчасці пачынаецца з прыгожа прыбранай тэрыторыі навокал галаўнога офіса акцыянернага таварыства.

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

«ПАСТАЯННА ДУМАЦЬ І ШУКАЦЬ, ЦЕРАБІЦЬ НАВУКУ»

Нашым гідам па новабудоўлях ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» стаў **намеснік генеральнага дырэктара па тэхнічным пераўзбраенні і энергазберагальных тэхналогіях Расціслаў КУЦАЛАЙ**. Спачатку Расціслаў Уладзіміравіч коратка ўвёў нас у курс спраў.

— Зараз самы разгар будаўніцтва новай лініі (можна смела сказаць, цэлага завода, такія тут аб'ёмы) па вытворчасці клінкеру, з якога атрымліваецца цэмент, сухім спосабам. Хутка пяройдзем «экватар». Разліковы агульны бюджэт праекта — 1 трыльён 80 мільярдаў беларускіх рублёў у цэнах 2006 года. Гэта так званы звязаны крэдыт кітайскіх партнёраў і крэдыты, якія мы ўзялі ў беларускіх банках.

Напачатку дамаўляліся так: вось тут будзе зона адказнасці кітайскіх партнёраў, а там — зона адказнасці ААТ «Краснасельскбудматэрыялы». Але асабіста я, шчыра кажучы, для сябе ніяк не магу падзяліць і лічу, што ўсё гэта — зона адказнасці акцыянернага таварыства. Таму што мы — зацікаўлены бок у тым, каб мець новыя магутнасці па вытворчасці цэменту. І новыя не толькі таму, што ўзводзяцца сёння, а яшчэ і таму, што яны будуць больш эканамічныя і больш сучасныя па тэхналогіі. Гэты праект пераходны, мы пераходзім з мокрага спосабу вытворчасці клінкеру на сухі, адначасова замяняем асноўную масу паліва (газа) пры вытворчасці клінкеру на больш танны вугаль.

І побач будуем пляцоўку з фундаментам і ўсімі камунікацыямі пад ГТУ — газатурбінную ўстаноўку магутнасцю 15 мегават. Згодна з дагаворам з вытворцамі, а гэта швейцарская фірма «Турбамах», у канцы жніўня павінны прайсці яе выпрабаванні, і ў верасні яна паступіць да нас. Праект курыруюць вучоныя Беларускага цеплаэнергетычнага інстытута.

ГТУ будуем не таму, каб аддаць даніну модзе. Гэта нам выгадна фінансавава, бо прынясе значную эканомію сродкаў: электрычная энергія, якую мы спажываем для вытворчасці клінкеру і цэменту з яго, абыдзецца больш танна. Вопыт беларускіх цэментнікаў сведчыць, што свая электраэнергія танней працэнтаў на 60. Тым больш што цяпло пасля ўтылізацыі паступіць у дзейныя агрэгаты. Будзе задзейнічаны таксама газагенератар. А эканомія энергарэсурсаў дасягаецца менавіта за кошт сухога метаду вытворчасці: менш вільгаці спатрэбіцца выпарваць з сыравіны.

— Раней лічылі, што сухі метад рэальны пры вільготнасці сыравіны 12 працэнтаў і ніжэй.

— Сучасная тэхніка робіць сухі метад магчымым пры 20 працэнтах і нават крыху вышэй. Мы знаходзімся быццам на самым «парозе» магчымага: вільготнасць нашага мелу набліжаецца да 24-26 працэнтаў. Вядомы прыклад расійскага «Мардоўцэмента», у якога вільготнасць сыравіны нават больш высокая — да 28 працэнтаў. Гэта надае нам аптымізму. І нават большага настрою працаваць, каб захаваць канкурэнтаздольнасць і каб на рынку нас не абагналі тыя ж расіяне, якія зараз пачынаюць актыўна ўкараняць сухі спосаб.

Асноўнае, дзеля чаго мы распачалі такую вялікую работу, — захаванне сябе на рынку, захаванне свайго іміджу. І ў выніку адкрываюцца новыя магчымасці зарабляць валюту для краіны і для ўласнай вытворчасці.

У параўнанні з тым, што вы бачылі на нашых новабудоўлях леташняй вясной, перамены вельмі вялікія. Тады вы бачылі ў асноўным чыстае поле, бо толькі распачыналася падрыхтоўка пляцовак. Зараз на іх поўным ходам вядуцца самі работы, таму высяцца дзясяткі вежавых кранаў, штодня працуе больш за тысячу (1070 — 1080) будаўнікоў і мантажнікаў з буйных будаўнічых арганізацый краіны — такіх, як знакамітае ААТ «Гроднапрамбуд», ААТ «Прамтэхмантаж», будаўнічыя трэсты з Баранавічаў, Ліды і іншых гарадоў. Мы не можам сказаць, што ўсё атрымліваецца вельмі гладка, сустракаюцца нейкія чыста рабочыя моманты, але заўсёды знаходзім агульную мову са сваімі партнёрамі-будаўнікамі, і працэс ідзе.

Слесар-газазваршчык Аляксандр СУСЛІН.

Прынцыпова важна, што новая лінія па вытворчасці клінкеру будзе працаваць не на дарагім газе, а на больш танным вуглі. Ужо пабудаваны млын для вугалю і практычна гатовы склад для яго.

— Дзе будзеце браць людзей на новы, па сутнасці, завод? Патрэбны ж спецыялісты экстракласа.

— З яго пускам мы спыняем дзве «малыя» печы (дыяметр 4х150 м), таму камплектавацца будзем за кошт уласных магчымасцяў.

— Гэта па цэменце, Расціслаў Уладзіміравіч. А што датычыць новых магутнасцяў па выпуску вапны сухім метадам?

— Так званую «этажэрку» — таксама новую і вельмі высокапрадукцыйную лінію — увялі ў лік дзейных у канцы мінулага года, зараз ідзе асваенне. Гэта пілотны праект, установўка — доследная. Такога абсталявання, якое б працавала на вільготным, рыхлым меле, няма не толькі на прасторах СНД. Аўтары ідэі — беларускія вучоныя з навукова-даследчага інстытута будаўнічых матэрыялаў (знакамітага НІІСМа), ажыццяўленне яе належыць нашым распрацоўшчыкам. Падгледзець няма ў каго, да ўсяго даводзіцца даходзіць сваім розумам і сваімі рукамі. У самым пачатку эксплуатацыі сутыкнуліся са складанасцямі, якіх нават не чакалі. Напрыклад, атрымалі прадукт надзвычай тонкага памолу, які, магчыма, нават і не патрэбен для тэхналогіі, бо ў выніку не зусім адэкватна паводзяць сябе цыклонныя ўстаноўкі. Так што ідзе далейшая «шліфоўка» працэсаў.

Галоўны інжынер будаўнічага ўпраўлення «Спецбудмантаж» Міхаіл СТРОК і брыгадзір Юрый КІСЯЛЕЎСКІ займаюцца мантажом абсталявання склада вугалю.

Зараз ужо маем паказчыкі прадукцыйнасці лепшыя, чым спачатку, актыўнасць прадукту ў асобных партыях вышэй за 90 працэнтаў. Але працаваць ёсць над чым. Напрыклад, пры вельмі тонкім памоле асноўнай масы трапляюцца буйныя часцінкі. Усё гэта патрэбна «лавіць», не спаць, церабіць навуку, самім думаць і шукаць.

«Асуан» у Краснасельскім

Услед за гэтым Расціслаў Куцалай запрасіў журналістаў на будаўнічыя аб'екты аб'яднання. Пачалі нашу «экскурсію» з вугальнага аддзялення. Напомнім, што менавіта з вугалем у «Краснасельскбудматэрыялах» звязваюць надзеі на больш таннае паліва для сваёй энергаёмістай вытворчасці, таму такая ўвага надаецца ходу будаўніцтва аддзялення.

— Мы павінны будзем спажываць больш за тысячу тон вугальнага паліва ў суткі. Калі дакладна, то 1300 — 1350 тон, а гэта 22 паўвагоны. Плюс вагоны з гіпсам, гануляваным шлакам і іншымі дабаўкамі... Так што пад'язныя шляхі і ўся інфраструктура да іх зроблены з разлікам, каб маглі прыняць да ста вагонаў у суткі. Як бачыце, вядуцца работы ў прыёмным аддзяленні вугалю, вядзецца мантаж вагонаперакульвальніка — даволі арыгінальнага механізму для разгрузкі.

Вугаль пасля выгрузкі будзе падавацца ў драбільнае аддзяленне. Затым транспарцёры пададуць яго на млын, і пасля размолу і сушкі паліва паступіць у гаряўкі печы. Тут абсталяванне ўсё кітайскае. Ступень гатоўнасці аб'екта — больш чым 80 працэнтаў.

Расціслаў Уладзіміравіч паказвае памяшканні сушылкі-драбілкі, вузла перасыпкі, лабараторыі вугалю. Непадалёку — помпавая станцыя водапаніжэння, бо побач працякае рака, а многія аб'екты заглыблены на добры дзясятак метраў у зямлю, і спатрэбілася адпампоўваць ваду з воданасычаных гарызонтаў. А вось і сам склад вугалю. Складское памяшканне — з металапрофілю, высокае і прасторнае, бо прадугледжаны месячны запас паліва.

— Маючы на ўвазе, што сюды, на разгалінаваныя пад'язныя шляхі, можна будзе падаваць не толькі вугаль, але і вагоны і паўвагоны з граншлакам, якога мы атрымліваем да 200 тысяч тон у год, і іншымі дабаўкамі для цэменту, мы зрабілі падаўжэнне на 28 метраў суседняга склада клінкеру, што дазволіць адначасова цэнтралізаваць і нават аўтаматызаваць значную долю разгрузачных работ. Склад ужо амаль «намаляваўся», засталіся бетонныя работы, і ў верасні прыйдуць чатыры краны для яго. На іншых аб'ектах па ступені гатоўнасці напарадзе «крочаць» цеплаабменнік і сама печ, за імі — млын памолу вугалю. Крыху меншая гатоўнасць у нашай «кухні», сыравіннага аддзялення, дзе

ўсё замешваецца. Там самая вялікая напруга. Яна звязана з тым, што пазнавата паступіла праектная частка. І там значнае заглыбленне ў грунт — мінус 21 метр ад нулявой адзнакі. Гэта стварае некаторыя складанасці. У пачатку будаўніцтва адкачвалі каля 800 кубоў вады ў гадзіну. Зараз з бетоннымі і іншымі работамі выходзім фактычна на «нуль». Як толькі паступяць транспарцёры, можна будзе пачынаць мантаж. Найбольш адказнае абсталяванне на цэментнай «кухні» — еўрапейскае.

Сыравіна іншы раз падкідвае такія казусы ў ходзе вытворчасці, што патрэбна мець запас тэхналагічнай трываласці. Мы нічога лішняга не праектавалі, а прадугледзелі толькі тое, што дыктуюць наш асабісты вопыт і навуковыя распрацоўкі НІІСМа. Каб вытворчасць працавала надзейна, тэхналагічна і давала якасны прадукт.

Вось зараз мы праязджаем міма старой «печкі» — старой не па ўзросце, тут правільна будзе сказаць дзейнай, па мокрым спосабе вытворчасці. Яе габарыты 5х150 метраў (150 — гэта даўжыня). І яна дае 50 тон прадукту ў гадзіну. Альбо 1200 тон у суткі. А там, куды мы зараз накіроўваемся, новая печка будзе меншай — 72 метры ў даўжыню і 4,8 дыяметрам. А прадукцыйнасць яе — 208 тон у гадзіну, альбо 5 тысяч тон у суткі. Параўнайце самі. Сёння нашы чатыры дзейныя столькі не даюць. І пры гэтым мы застаёмся буйнейшым вытворцам цэменту ў краіне. Зразумела, што такі наш статус толькі ўмацуецца.

...Грандыёзнае відовішча чакала нас на ўзвышаным месцы, з якога адкрывалася агульная панарама будаўніцтва самой лініі. Сапраўды: там, дзе зусім нядаўна было голае поле, зараз — палова завода. Вышэй заводскіх труб уздымаюцца карпусы цеплаабменніка — сінія металаканструкцыі з серабрыстай начынкай — і рукаўнага фільтра магутнасцю два мільёны кубічных метраў у гадзіну. Столькі ён будзе прапускаць праз сябе газаў.

Расціслаў Уладзіміравіч пазнаёміў з тэхналагічным ланцужком, паказаў нам «у натуры», дзе будуць памяшканні памолу і сушкі сыравіны, аператарная электрапамяшканняў, дзе будзе ўстаноўлена ГТУ — як мага бліжэй да абсталявання, якое яна абслугоўвае. Паказаў склад гамагенізацыі гліны: калі мясцовы мел даволі аднародны па саставе, то гліны тут «пярэстыя», утрыманне алюмінатаў хістаецца, і каб прывесці іх да нейкай адной велічыні, спатрэбіцца спецыяльны працэс. Падвёў да гіганцкіх сіласаў (складоў), якія ўжо ўзвышаюцца над будоўляй і чакаюць першую прадукцыю. Куцалай — сапраўдны паэт сваёй прафесіі, на прадпрыемстве — без малога 50 гадоў, і нават пра тэхналогіі ён распавядае з асаблівым смакам.

Такая апантаная ўлюбёнасць у сваю справу характэрная фактычна для ўсіх кіраўнікоў, спецыялістаў, рабочых акцыянернага таварыства, з якімі мы сустракаліся і на гэты раз, і ўсе папярэднія разы. Магчыма, у гэтым і сакрэт лідарства акцыянернага таварыства сярод аднатыпных прадпрыемстваў будаўнічай галіны.

— Хачу звярнуць вашу ўвагу на тое, што тут мы будуем яшчэ і байпаснае прыстасаванне — каб мінімізаваць выкіды хлору. Найбольшая колькасць хлору ўтвараецца пры спальванні прамысловых і бытавых адходаў, і менавіта байпаснае прыстасаванне — сапраўдная перспектыва. Тым больш што мы спальваем да 7 тысяч тон аўтамабільных пакрышак, якія адслужылі свой тэрмін, і эканомім на гэтым да тысячы кубоў газу ў гадзіну. На гэтую тэхналогію затрацілі па тым часе нямала — да трох з палавай мільярдаў беларускіх рублёў, але яны акупіліся. А пасля пуску новай лініі можна будзе спальваць у шэсць-восем разоў больш.

— А зараз давайце крыху пяройдзем і паглядзім на панараму прыёмнага аддзялення мелу, — запрашае Расціслаў Уладзіміравіч.

Калі папярэдняя панарама цешыла вока велічнасцю і нейкай грунтоўнасцю тэхналагічнага абсталявання, сабрана-га ў адзін «ланцужок», які імкліва расце ўверх, то гэтая — ашаламляла сваімі памерамі. Міжволі напрошвалася параўнанне з колішнім будаўніцтвам Асуанскай плаціны.

Аператар Яўген ВАЛОЙШЧЫК, майстар змены Аляксей КРАСНОЎСКІ і машыніст пнеўмакамернай установкі Сяргей ДАРАГОЙ займаюцца асваеннем прынцыпова новага абсталявання.

— Каб разгарнуць такі фронт работ, спатрэбілася заглыбіцца, вывезці сто тысяч кубоў пароды, абязводзіць катлаван. Тут будуць стаяць драбілкі, дазатары, фрэзерныя ўстаноўкі для папярэдняга драблення і шмат якога іншага абсталявання. А на глыбіні больш за 20 метраў пройдзе магутны транспарцёр, на які паступяць перапрацаваны мел, гліна і дабаўкі. Будуюцца тэхналагічныя склады, станцыя перасыпкі і іншыя аб'екты. Час падціскае, таму будаўнічыя брыгады працуюць у дастаткова высокім рытме.

«Этажэрка» паказвае характар

Наступны адрас нашай «вандроўкі» — установўка па вытворчасці вапны сухім метадам, якая была пушчана ў снежні. Бюджэт новабудоўлі — 53 мільярды. Зараз ідзе адладка абсталявання і тэхналагічнага працэсу.

— Гэтая лінія па вытворчасці вапны з рыхлага мелу сухім спосабам — першая ў Еўропе. Тэхналогія скарацечная, таму ўсё павінна быць адпрацавана да тонкасцяў. На самым пачатку эксплуатацыі заўсёды ўзнікаюць пытанні, па чарзе здымаем іх. Пачыналі з вельмі невялікіх аб'ёмаў — загружалі ўсяго па 4 тоны сыравіны, зараз загружаем па 16 — 18 тон. Але працэс пакуль ідзе няўстойліва. Уласна кажучы, наватарская тэхналогія толькі нараджаецца — на нашых вачах і з удзелам нашых спецыялістаў. Адзінае, чаго настойліва дабіваемся, — каб яна пасябравала з «капрызлівай» мясцовай сыравінай. Высветлілася, што патрэбен больш дасканалы дазатар, а ў нас у краіне і ў Расіі такіх не робяць... Я вам усё даволі падрабязна расказваю, каб не думалі, што наватарскія падыходы лёгка даюцца.

Ветэран вытворчасці, начальнік цэха абпальвання Фёдар КАЧАРОЎСКІ.

Лінія вельмі перспектыўная, і магчыма, што гэта наогул заўтрашні дзень вытворчасці вапны на Беларусі. Пасля таго, як яна запрацуе па-сапраўднаму, плануем заняцца будаўніцтвам яшчэ адной, на 200 — 250 тысяч тон вапны сухім метадам. Прадукт карыстаецца выключна вялікім попытам і ў нас, і за мяжой.

І для экалогіі такія ўстаноўкі больш бяспечныя. У самым пачатку сваёй працоўнай біяграфіі я запомніў такую лічбу: шкодныя выкіды аднаго старога цэментнага завода складалі каля 9000 тон у год. А зараз прадпрыемствы ўсяго аб'яднання разам выкідваюць у два разы менш: і цэментны, і вапнавы, і шыферная вытворчасць, і іншыя. Калі пусцім новую лінію на цэментным заводзе, то па нарматыве выкіды не павінны будуць перавышаць 30 міліграмаў на куб паветра. Гэта дзякуючы перш за ўсё змяншэнню расходу паліва, а таксама прымяненню больш эфектыўных фільтраў.

— Праектам прадугледжана ўзвядзенне аб'ектаў сацкультбыту?

— Мы пабудавалі 28-кватэрны домслупок, які зараз выкарыстоўваем як інтэрнат для будаўнікоў, а пасля ўводу лініі ў эксплуатацыю тут будуць кватэры.

Слова — вытворцам

ШЧАСЛІВАЯ ЛІЧБА ТРЫНАЦЦАЦЬ

На другі дзень мы пабывалі на дзейнай вытворчасці. Расказвае **дырэктар цэментнага завода Ігар КАРАЛЬЧУК**:

— Безумоўна, калі будаўнічая пляцоўка размяшчаецца побач з асноўнай вытворчасцю, гэта заўсёды ўскладняе задачу. Тым не менш дзейная вытворчасць працуе па-ранейшаму эфектыўна. Выпускаем паўтара дзясятка відаў прадукцыі. Акцэнт робім на дабавачных цэментах. Некалькі гадоў назад запусцілі так званы пясчаністы цэмент. Ён прайшоў выпрабаванне часам, і мы зараз выпускаем яго двух відаў, у значна большай колькасці. Частку дабавак, прадугледжаных тэхналогіяй, бяром зараз у сваіх кар'ерах і такім чынам замяшчаем імпартныя, якія раней набывалі за валюту.

Дырэктар цэментнага завода Ігар КАРАЛЬЧУК.

Выпускаць можам шаснаццаць марак, але пры гэтым арыентуемся на запатрабаванні рынку. Канкрэтна зараз на канвееры цэмент трынаццаці марак. Шэсць з іх — па еўрапейскіх нормах. Вытрымліваць такі асартымент даволі складана, але спраўляемся.

Бездабавачнага цэменту на ўнутраны рынак выпускаем два віды, гэта маркі 500 Д0 і 550 Д0. Выкарыстоўваюцца яны для вытворчасці спецжалезабетону, адказных жалезабетонных канструкцый.

Раней мы дадаткова куплялі клінкер у Расіі і ва Украіне. Зараз жа, каб павялічыць колькасць клінкеру, а гэта значыць і цэменту, адна з пячэй на вапнавым заводзе пераведзена на яго вытворчасць і адчувальна нам дапамагае.

У месяц даём прыкладна 55-58 тысяч тон сепарыванага цэменту, які карыстаецца павышаным попытам, бо мае больш аднародны састаў.

Па-ранейшаму выпускаем сульфатаўстойлівы партландцэмент — для агрэсіўнага асяроддзя. Сёння ноччу адгрузілі, здаецца, шэсць вагонаў.

Вясной, у маі, пачаты выпуск новага ПЦП-400. А калі новы від, то гэта і новыя тэхналогіі, альбо ўдасканаленне дзейных. Спажыўцы бяруць яго ўсё больш ахвотна, план на месяц — 49 тысяч тон, бо атрымаўся вельмі ўдалым. Калі мне дома спатрэбілася выканаць пэўныя работы, я купляў для сябе менавіта ПЦП-400.

Партландцэмент выпускалі ў Красным Сяле яшчэ ў 1922 го-

Расфасоўка цэменту ў папяровыя мяшкі даручана аўтаматычнай лініі, якую абслугоўвае Мікалай ВАРАПАЙ.

дзе, і даволі высокай якасці. Мы захоўваем традыцыі якасці, і нават рэцэптуры, удасканальваючы іх пад новыя тэхналогіі. Будаўніцтва, што вядзецца сёння, дазволіць выпускаць прадукцыю па тэхналогіі, якая з'яўляецца найбольш перадавой у свеце. Я быў на многіх цэментных заводах, у тым ліку за мяжой, і магу параўноўваць. Кожны завод працуе на нейкай сваёй сыравіне, яна абавязкова адрозніваецца ад іншай. А ў нас усё сышлося: і сыравіна высокай якасці, і сучасная, эканомная «сухая» тэхналогія.

ПУШКІ «РАССТРЭЛЬВАЮЦЬ» ЦЫКЛОНЫ

Гаворыць **дырэктар вапнавага завода Віталь НОСКА**:

— Калі леташнюю праграму калектыў адпрацаваў «на ўра», выпусцілі прадукцыі на 148 мільярдаў рублёў, то сёлета першае паўгоддзе давалася больш складана. Шмат рэсурсаў і намаганняў скіравана на асваенне новых магутнасцяў. Тым не менш, усе планавыя паказчыкі выконваюцца.

Наша перспектыва — гэта вытворчасць вапны сухім спосабам на новай доследна-эксперыментальнай установўцы. Пуска-наладачныя работы, як вы зразумелі, ідуць даволі-такі складана, бо аналагаў такім «этажэркам» у свеце сапраўды няма. У іншых краінах яны працуюць на даламіце, на вапняку, выпускаюць алюмініевую пудру, але на такім, як у нас, меле, які мае ўласцівасць зліпацца, злежвацца, не працуюць нідзе. Не выпадкова на асваенне адводзіцца два гады. Тым не менш, можна сказаць, што хуткасны агрэгат для абпальвання мелу мы асвоілі, выпусцілі першыя 300 тон. Частку паставілі ў Прыбалтыку і Польшчу, частку перапрацавалі ў сябе на гідратную вапну.

Праблемы вырашаем паэтапна. Напрыклад, зараз спыняем установўку на выкананне дадатковых работ — будзем устанаўліваць кампенсатары і дадаткова — пушкі для ўхілення наліпанняў у бункерах і цыклонах-цеплаабменніках.

Сутнасць усёй работы, якая праводзіцца, у тым, што сёння 77 працэнтаў сабекошту прадукцыі прыпадае на паліўна-энергетычныя рэсурсы. Мы расходуем паліва больш, чым цэментнікі. І канечны прадукт — вапна — працэнтаў на 80 больш дарагая, чым цэмент. Вось глядзіце: калі па старой тэхналогіі для вытворчасці адной тоны вапны мусім затрачваць 308-310 кілаграмаў умоўнага паліва, то тут, на новай вытворчасці, атрымаем вапну з расходам паліва 183 кілаграмы. Гэта важкае зніжэнне сабекошту.

Дырэктар вапнавага завода Віталь НОСКА.

Начальнік цэха па вытворчасці блокаў Васіль НАЗАРАНКА.

РАДУЕ, ШТО НА СКЛАДАХ — ПУСТА

Начальнік цэха па вытворчасці блокаў з ячэістага бетону Васіль НАЗАРАНКА сведчыць:

— У апошнія месяцы мы змаглі павялічыць выпуск сваёй прадукцыі і вось-вось павінны выйсці на праектную магутнасць. У суткі выпускаем 680 кубоў блокаў. Блокі нашы — адменнай якасці, ні ў чым не ўступаюць прадукцыі іншых вытворцаў. Я лічу, што і па знешнім выглядзе, па геаметрыі і па трываласных характарыстыках нашы нават лепшыя. У гэтым пераконваны і нашы спажыўцы, якія даволі часта прыязджаюць па прадукцыю з аддаленых рэгіёнаў краіны. Будаўнічыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, прыватнікі разбіраюць блокі «з колаў». Калі б мы зараз маглі выпускаць больш, то ўсё б разышлося. Адгружаем блокі маркі 400 і ў Калінінград. Іншыя прадпрыемствы такую марку выпускаюць рэдка. А самая распаўсюджаная марка ў нас 500. Затое памераў — вялікае мноства. І тры катэгорыі: першая і другая кладуцца на клей, трэцяя — на раствор. Відаць, сакрэт папулярнасці ў тым, што змаглі падабраць правільныя суадносіны цаны і якасці.

Аддзел галоўнага тэхнолага паставіў справу так, што на ўсіх этапах вытворчасці, на кожным пацоўным месцы тэхналагічныя параметры вытрымліваюцца самым строгім чынам. А агульны ўклад членаў калектыву ацэньваецца пры дапамозе каэфіцыента працоўнага ўдзелу. Рабочыя напрамую зацікаўлены ў выніках сваёй працы.

У цэху блокаў з ячэістага бетону кіпіць работа.

На кар'еры прадпрыемства вядзецца дабыча ўласнай высакаякаснай сыравіны.

ЛЕПШАГА ПАДАРУНКА ДА ЮБІЛЕЮ НЕ ПРЫДУМАЕШ

Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай і кадравай рабоце Мар'ян ЮРОЎСКІ:

— Усе новыя шматпавярховыя дамы, якія я вам паказваў у пасёлку, — гэта дамы, дзе жывуць нашы работнікі, мы разам з прафкамам арганізоўвалі кааператывы па іх будаўніцтве. Больш за 90 працэнтаў — маладыя сем'і. Апошнім часам ключы ад добраўпарадкаванага жылля атрымалі 204 сям'і. Для нашага пасёлка, у якім налічваецца 7 тысяч 300 жыхароў, гэта саліднае прыбаўленне жыллёвага фонду. Неўладкаванымі засталіся адзінкі, але і яны жывуць у асноўным у інтэрнатах, і перспектыва на атрыманне ўласнага жылля ў іх ёсць. Не параўнаеш, як у свой час пачыналі мы.

Удзел у кааператыўным будаўніцтве замацоўвае моладзь за прадпрыемствам, бо за жыллё патрэбна плаціць. Працэнт невысокі, як у сельскай мясцовасці, і прадастаўляецца растэрміноўка на 40 гадоў. Тым не менш, вяртаць крэдыт трэба, а на нашым прадпрыемстве заробкі неблагія.

Так што жыллёвая праблема ў асноўным вырашана, садаўская — таксама (у пасёлку тры дзіцячыя садкі, адзін — нашага прадпрыемства, але дапамагаем усім тром), школьнай праблемы наогул не існуе. Я не чуў, каб недзе ў іншым месцы паміж вытворчым прадпрыемствам і мясцовай сярэдняй школай быў заключаны дагавор і абсалютна за кожным класам былі замацаваны цэх ці іншае вытворчае падраздзяленне. Формы ўзаемадзеяння, дапамогі — самыя разнастайныя, іх вызначаюць дырэктар завода-філіяла ці начальнік цэха і класны кіраўнік. Але сутнасць адна — падрыхтоўка рабочай змены. Калі нехта з выпускнікоў не паступіў у ВНУ, стараемся прыняць на работу. Паступіў — таксама чакаем да сябе на працу. Не ўсім хапае інжынерных пасад — можна нейкі час пастажыравацца на рабочай, набрацца вопыту. У нас зараз 70 рабочых маюць вышэйшую адукацыю. Многія вучацца, у тым ліку завочна. Мы дапамагаем аплачваць вучобу, потым гэты доўг паступова пагашаецца. Існуе здаровая канкурэнцыя сярод людзей з дыпломамі, затое мы ўпэўнена сябе адчуваем у сэнсе рэзерву кадраў кіруючага звяна... Да слова, днямі на вапнавым заводзе прайшла шумная, вясёлая сустрэча з школьнікамі, былі сказаны добрыя словы і ў адрас выдатнікаў вучобы, і іх бацькоў, якія не менш паспяхова працуюць.

Кажуць, што стварэнне чалавеку нармальных умоў для жыцця — гэта і ёсць самая лепшая ідэалагічная работа. Магчыма, так яно і ёсць, але мы бяром трохі «шырэй». Імкнёмся не пакідаць членаў свайго калектыву сам-насам з рознымі іх клопатамі, таму стараемся, каб побач з імі пастаянна былі нашы грамадскія арганізацыі. У ліку самых актыўных варта назваць ветэранскую арганізацыю, якая налічвае 960 членаў. Саветам ветэранаў вельмі энергічна кіруе Людміла Сямёнаўна Апалка, былы дырэктар завода азбестацэментных вырабаў. Пасля таго, як перасялілася бібліятэка, вызваліліся два вялікія пакоі, і ветэранская арганізацыя атрымала свой клуб. Яны, што называецца, прыглядваюць адзін за адным, ведаюць пра здароўе і справы сваіх равеснікаў, і калі некаму патрэбна дапамога, Людміла Сямёнаўна абавязкова своечасова падкажа. Гэта асабліва важна яшчэ і таму, што жывыя 15 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Праўда, мы і без таго знаходзімся з імі на прамой сувязі. І мы, і пярвічная арганізацыя БРСМ, якая лічыць сваім абавязкам клопат пра ветэранаў вайны і працы.

Праходзяць сустрэчы ветэранаў розных вытворчых падраздзяленняў. Бывае, што людзі, якія ўсё жыццё адпрацавалі разам, потым па пяць гадоў не бачацца, а тут — калі ласка, цудоўна арганізаваная сустрэча ў заводскай сталовай. З удзелам свята 8 Сакавіка, Дзень маці, Дзень абароны дзяцей. Зараз пад кантролем — падрыхтоўка да школы. У нас у калектыўным дагаворы прадугледжана магчымасць аказання матэрыяльнай дапамогі тым сем'ям, якія ў ёй маюць патрэбу.

Праз тры гады нашаму калектыву споўніцца роўна сто. Да юбілею мала што засталося, але падрыхтоўку яшчэ не пачыналі — шчыра сказаць, пакуль не да таго. Увядзём у строй дзейных нашы новабудоўлі, асвоім новыя магутнасці — гэта будзе самым лепшым падарункам да свята.

Навасёлы: рабочы прадпрыемства Андрэй ГРЫГАРОВІЧ з сынам Раманам.

Намеснік генеральнага дырэктара Мар'ян ЮРОЎСКІ і галоўны ўрач санаторыя Віктар КУХАРЧЫК.

Малады зваршчык Аляксандр МАНЦЭВІЧ у складзе дружнай брыгады Валянціна ВАРАПАЯ займаецца мантажом яшчэ аднаго гіганцкага шагаючага экскаватара.

«ПРАЛЕСКА» — «РАБОЧЫ» САНАТОРЫЙ СЯМЕЙНАГА ТЫПУ

Чулі такі жартоўны мясцовы афарызм: «На цэментным варта працаваць, каб атрымаць пуцёўку ў «Пралеску». Сапраўды, райскі куток, нічым не саступіць крымскім здраўніцам.

Галоўны ўрач Віктар КУХАРЧЫК паведаміў:

— Сёлета ў красавіку мы вытрымалі экзамен і пацвердзілі свой статус — другую атэстацыйную катэгорыю, а ўвосень трэба будзе прайсці паўторнае ліцэнзаванне. Наша асноўная задача — падтрымліваць якасць курортна-санаторнага лячэння і ўдасканаленне работнікаў акцыянернага таварыства і ветэранаў на высокім узроўні. А яшчэ ў не простых рынкавых умовах стабілізаваць сваё эканамічнае становішча, пашырыць дыяпазон платных медыцынскіх паслуг для грамадзян з блізкага і далёкага замежжа. Гэта патрэбна, каб мы маглі развіваць матэрыяльна-тэхнічную базу, асвойваць новыя сучасныя тэхналогіі аздараўлення, ствараць больш камфортныя ўмовы пражывання для гасцей санаторыя. Хачу сказаць словы падзякі генеральнаму дырэктару акцыянернага таварыства Валянціну Алегавічу Вераціле за разуменне нашых патрэб і пастаянную дапамогу. Тое, што да нас па здароўе едуць грамадзяне Расіі, Польшчы, Украіны, Ізраіля (да 30 працэнтаў адпачывальнікаў — замежныя грамадзяне), — гэта агульная заслуга і медыцынскага персаналу, і кіраўніцтва таварыства.

Думаем над перспектывай. Нам патрэбна ўласная мінеральная вада, яна дазволіць атэставацца на першую катэгорыю. Усё астатняе для гэтага ёсць — высокапрафесійны персанал, які на рэгулярнай аснове праходзіць спецыялізацыю не толькі ў Мінску, але і ў Маскве. Ёсць прагрэсіўныя медыцынскія тэхналогіі, унікальнае абсталяванне — наогул моцная матэрыяльная база.

Да размовы далучаецца **намеснік галоўнага ўрача Валерыя СЛІВІНСКАЯ**:

— Склалася так, што санаторый набыў характар лячэбна-курортнай установы сямейнага тыпу. Вось і сёння адпачывае вельмі шмат сем'яў, маладых мам з дзецьмі, бабуль з унукамі. Мы сталі сямейным санаторыем перш за ўсё для работнікаў акцыянернага таварыства «Краснасельскбудматэрыялы». Але не адмаўляем і іншым.

Кожнаму пацыенту ўрачы «Пралескі» прапануюць індывідуальную праграму аздараўлення. Лячэбная база санаторыя дазваляе гэта зрабіць. Тут і водныя, і фізіятэрапеўтычныя працэдуры, электрасвятлолячэнне, магніталячэнне... Склалася даволі вялікая група адпачывальнікаў, якія прыязджаюць з зайздроснай перыядычнасцю. Напрыклад, спецыяльна на баракамеру, таму што яна дае станоўчы эфект пры лячэнні мігрэні, артэрыяльнай гіпертэнзіі, ішэмічнай хваробы сэрца і шэрагу іншых захворванняў. І потым чалавек на працягу шасці-васьмі месяцаў адчувае сябе дастаткова добра. Ён імкнецца замацаваць гэты эфект і прыязджае паўторна. А жыхары Ваўкавыска маюць магчымасць пасля санаторнага курса наведваць «Пралеску» амбулаторна.

Урач-тэрапеўт Ала КАЛІНОЎСКАЯ.

Медсястра Марына БАЯРЧУК праводзіць сеанс у СПА-капсуле.

— Імкнёмся зрабіць метады лячэння больш разнастайнымі, — працягвае Валерыя Уладзіміраўна. — Сёлета пачалі выкарыстоўваць пакетаваныя сапрапелевыя гразі, яны даюць эфект і пацыентам падабаюцца. Пачалі выкарыстоўваць і поравы раствор знакамітых сакскіх (крымскіх) гразяў: гэта светлы раствор, пастаўляецца ў флаконах. Мы выкарыстоўваем яго ў чыстым выглядзе ці камбінуем з іншымі метадамі лячэння. Напрыклад, прымяняем разам са святлолячэннем, ультрагукавой тэрапіяй.

Акрамя таго, прапануем паслугі касметычнага кабінета. Пачала карыстацца папулярнасцю наша навінка — вертыкальны салярый. А калі ўлічыць, што ў нас працуюць басейн, аквапарк, ёсць штучнае возера з уладкаваным пляжам, то ў спалучэнні з салярыем дасягаецца эфект наведвання паўднёвых курортаў.

— Вам даводзілася пераконвацца ў эфектыўнасці лячэння ў «Пралесцы» на нейкіх абсалютна канкрэтных прыкладах?

— Зараз за кошт новых метадаў стала лягчэй дыягнаставаць такую даволі масавую паталогію, як дыстрафічныя змены ў пазваночніку, наяўнасць грыж пазваночніка. Для іх найбольш кардынальнага лячэння дактары звычайна прапануюць аператыўнае ўмяшальніцтва. А мы пераконваем сваіх пацыентаў, што стойкі эфект даюць і курсы паўторнага лячэння ў нас. Прапануем магніталячэнне на апаратах «Алімп» ці «Артаспок» у спалучэнні з лячэннем лазерам.

Калі дазваляе стан пацыента, прымяняецца таксама іголкарэфлексатэрапія — як у класічным выглядзе, так і ў выглядзе мікрахвалевай рэзанансной тэрапіі. Прымяняюцца гразевыя аплікацыі, сухія вуглекіслыя ванны, прызначаецца лячэнне ў баракамеры. Усё гэта можам спалучаць з падтрымкай арганізму вітамінамі, сасудзістымі прэпаратамі. У выніку на 3-4 месяцы маем дастаткова ўстойлівы эфект, які дазваляе знізіць прыём абязбольвальных прэпаратаў. А каб атрымаць эфект стабілізацыі, курс лячэння можна паўтарыць праз 6-7 месяцаў.

...Пакуль фотакарэспандэнт робіць здымкі ў пакоях лячэбнага аддзялення, давайце паглядзім, на якія працэдуры так дружна з самага ранку ідзе народ. Рэа-бокс, інакш — сухія вуглякіслыя ванны. Паляпшаюць кіслародны абмен у тканках. SPA-капсула — шматфункцыянальны апарат для комплекснай аздараўленчай рэабілітацыі і касметалагічнай карэкцыі. Асноўныя віды яго ўздзеяння: вібрацыйны масаж, сухая саўна, аромацерапія, іонны ахалоджвальны душ для твару, хроматэрапія. Аснашчаны

Урач-неўролаг Таццяна КЛІНЧУК каля вертыкальнага салярыя.

кіраўніцтва, у тым ліку былых дырэктараў акцыянернага таварыства. Важна, што на гэтых сустрэчах і на іншых мерапрыемствах побач з ветэранамі — моладзь. Сумесныя вечары ветэранаў з заводскай моладдзю таксама праходзяць цікава. Тыя ж «Краснасельскія пасядзелкі», у праграме якіх і такі «дамашні» конкурс: хто што лепш прыгатаваў.

Клопат жаночага савета, якім кіруе Таццяна Іосіфаўна Нячай, начальнік гаспадарчага аддзела, — шматдзетныя сем'і. А таксама такія немалаважныя падзеі, як

лічыльнікам спальвання калорый.

А яшчэ народ ахвотна крочыць на вуглякіслыя ванны, на ўстаноўку гіпербарычнай аксігенацыі і апарат комплекснай дыягностыкі «Амсад», у пакой галатэрапіі, у турбасалярый. Пад наглядам дактароў займаецца стымуляцыяй імунітэту, прафілактыкай цэлюліту, спальваннем калорый... Прыемнага ўсім адпачынку.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Віктар ПАЗНЯКОЎ і Аляксандр ТАЛОЧКА (фота).

Санаторый «Пралеска», як спяваецца ў песні, «увесь пакрыты зеленню, абсалютна ўвесь».

Наўздагон

Праблемы — не прычына для спынення росту

Перад цырымоніяй узнагароджання лепшых прадпрымальнікаў 2010 года, якая праходзіла днямі ў Палацы Рэспублікі, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з некаторымі пераможцамі і лаўрэатамі пра іх бізнэс і пра тое, як яны адчуваюць сябе ў сённяшніх эканамічных умовах.

Пераможца ў намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у галіне аптавага і рознічнага гандлю», дырэктар ТАА «Дыямантпрам» Аляксандр КЛЕЙН лічыць, што атрыманае ганаровае званне практычнай дапамогі ў бізнэсе не зробіць:

— Я не сказаў бы, што званне «Лепшы прадпрымальнік года» дапамагае. Вядома, ёсць такі момант, калі прыходзяць нейкія правяраючыя органы з чарговай праверкай, то наяўнасць гэтага звання, у прынцыпе, настройвае правяраючых на такі лад, што ў нас кампанія не «ціхарыцца» недзе, а працуе на віду. Вось у гэтым аспекце ёсць нейкая карысць.

Паколькі кампанія Аляксандра Аляксандравіча займаецца імпартам, то «Звязда» не магла не пацікавіцца, як ідзе бізнэс у сувязі з сённяшнімі праблемамі на валютным рынку:

— Зараз у нас, безумоўна, цяжкія часы, як і ва ўсіх. Сёння пакуль працуем на старых запасах, на тым тавары, які завезлі яшчэ да пачатку вось гэтых не вельмі прыемных для ўсіх часін. У прынцыпе, мы ўсё разумеем і спадзяёмся на выпраўленне сітуацыі. Затое перагледзелі лагістыку, сталі адмаўляцца ад партнёраў, якія недастаткова добра прадаюць наш тавар... Запасаў хопіць да канца года, а там будзем бачыць.

Разам з тым, Аляксандр Клейн паведаміў, што ў яго кампаніі сур'ёзна распрацоўваецца пытанне пра тое, каб усё ж такі заняцца экспартам — бо для працы патрэбна валюта:

— Зараз шукаем розныя моманты, дзе мы можам заняцца экспартам, разглядаем розныя сферы. Бо для нашага асноўнага віду дзейнасці патрэбна валюта. Несумненна, дзяржава вельмі сур'ёзна сама ў гэтай сферы працуе, але мы таксама не сядзім склаўшы рукі, — сказаў ён, але не прызнаўся, што будзе экспартаваць — кажа, што гэтае пытанне дастаткова закрытае і кожны прадпрымальнік мае свае сакрэты на гэты конт.

Праблемы ў эканоміцы — не прычына для спынення росту, перакананы **адзін з заснавальнікаў ТАА «Контэ Спа» Вялянцін БАЙКО:**

— У нас таксама праблемы з валютай, але тым не менш у гэты час усё адно можна працаваць, развівацца, будаваць вытворчыя планы і рухацца наперад. Бо стаяць на месцы нельга: калі ты спыняешся, то наступным этапам будзе падзенне.

А вось некаторым арганізацыям, наадварот, сённяшняя сітуацыя на руку: у прыватнасці, турыстычная фірма ТАА «Віаполь», якая займаецца толькі ўнутраным турызмам, па словах яе **дырэктара Галіны ПАТАЕВАЙ,** ад крызісу не пацярпела:

— Эканамічная сітуацыя пагоршыла эканамічны стан людзей, у іх стала не хапаць грошай для таго, каб падарожнічаць за мяжой. А жыццё ідзе, жывём адзін раз, хочацца быць шчаслівым на гэтым свеце, таму многія павярнуліся ў бок экскурсій па Беларусі.

І Галіна Рамуальдаўна перакананая, што ў Беларусі ёсць што паглядзець і дзе адпачыць:

— У нас была згублена мода вандраваць па сваёй краіне. А мы вырашылі, што будзем ездзіць самі ў Турцыю, Францыю і іншыя краіны, вывучаць вопыт абслугоўвання турыстаў і спрабаваць рабіць такімі ж прывабнымі туры па Беларусі. І, у прынцыпе, можна сказаць, што мы гэтага дабіліся, бо каля 30 тысяч турыстаў абслугоўваем кожны год. Прычым наладзілі ўжо значны паток замежных турыстаў... Калі казаць пра ўнутраны ўязны турызм наогул, то тут сапраўды ў апошні час было зроблена некалькі важных рэчаў: падпісаны заканадаўчыя акты, якія сапраўды спрыяюць таму, каб людзі не толькі выязджалі за межы краіны, але каб яны вандравалі і па сваёй краіне, Таксама вельмі важна, каб сюды прыязджалі замежныя турысты. Акрамя таго, зараз адкрыты пасля рэканструкцыі Мірскі і Нясвіжскі замкі, будуюцца дарогі, паляпшаецца ў цэлым інфраструктура і г.д.

Што тычыцца непасрэдна конкурсу «Лепшы прадпрымальнік года», то Галіне Патаевай вельмі прыемна быць пераможцам:

— Я не думаю, што такія конкурсы нейкім чынам стымулююць працу, бо той, хто хоча працаваць, той будзе працаваць, а хто не хоча — не будзе. Але, безумоўна, мне вельмі прыемна, што нашу працу заўважылі. Такія конкурсы грэюць душу.

А як справы ў турыстычных агенцтваў, якія адпраўляюць беларусаў на адпачынак за мяжу? Па словах **Людмілы КАВАЛЁВАЙ, дырэктара прыватнага турысцкага прадпрыемства «Альта-тур»,** жыхары нашай краіны ранейшаму выязджаюць за мяжу, але выбіраюць больш танны адпачынак:

— Мы займаемся ўсімі відамі турызму: і знешнім, і ўнутраным. Вядома, сталі выбіраць больш такія бюджэтныя туры, як Крым, іншы раз Турцыю і Балгарыю. Але, нягледзячы ні на што, ёсць людзі, якія лятаюць і на Кубу, і на востраў Тэнэрыфэ. А што тычыцца цяжкай сітуацыі, то, магчыма, яна і не настолькі цяжкая, бо ў Мінску мы адкрылі новы офіс літаральна тры месяцы таму і жывём, плывём, стараемся, працуем. У нас ёсць магчымасць праводзіць разлікі і ў валюце, і ў беларускіх рублях. Вядома, гэта ў залежнасці ад таго, як пажадае кліент. Курс розны, у залежнасці ад аператара. Мы прымаем усё, што да нас нясуць, — сказала Людміла Кавалёва і дадала, што яна не заўважыла «перакосу» ў бок унутранага турызму: — Мы на сабе гэтага не адчулі, што людзі сталі больш адпачываць у Беларусі. Так, у Беларусі людзі адпачываюць, але, відаць, толькі на лецішчах. Усё-такі мы прадаём больш замежныя напрамкі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!

Внеочередное собрание акционеров ОАО «Белкотлоочистка» состоится 8 августа 2011 года по адресу: г. Минск, ул. Аранская, 22а, начало собрания в 10.00.

Повестка дня:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Наблюдательный совет ОАО «Белкотлоочистка»

УНП 100071353

К сведению акционеров ОАО «Универсам Рига»:

Выплата дивидендов по итогам работы за 1-ое полугодие 2011 года будет производиться с 03 августа 2011 года по 05 августа 2011 года с 10.00 до 17.00 по адресу: 220040, г. Минск, ул. Сурганова, 50, 2-й этаж, бухгалтерия.

УНН 100299678

САМЫ КАРЫСНЫ ВІТАМІН

ЯШЧЭ тыдзень, і бадай што самая карысная ягада — чорныя парэчкі — зможа радаваць нас толькі ў варэннях і кампотах. Чорныя парэчкі з'яўляюцца цудоўным сродкам прафілактыкі праблем з сардэчна-сасудзістай сістэмай, зрокам, дыябету, бо карысных вітамінаў і мінералаў у гэтых ягадах больш, чым у астатніх. Таму запасацца імі імкнуцца гаспадары як на сваіх падворках, так і на вялікіх прадпрыемствах. У садзе каля вёскі Яркова агракамбіната «Ждановічы» кожны дзень збіраюць каля дзвюх-трох тон вітаміннай ягады. Вялікае поле плошчай 18 гектараў могуць абслугоўваць тры чалавекі — кіроўца і два сезонныя рабочыя, бо збіраецца ягада пры дапамозе тэхнікі, якая замяняе каля ста чалавек. Увесь час трэба сачыць, каб разам з ягадай не падалі галінкі ці лісцікі, каб скрыні напаўняліся раўнамерна. Праход па полі туды-назад займае каля дваццаці хвілін — за гэты час скрыні напаўняюцца і іх адгружаюць, каб завезці на склады. А пасля ягады рэалізоўваюцца насельніцтву — па 8-9 тысяч беларускіх рублёў за кілаграм.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Мінскі раён.

Анатоль ЧЫКУН, вядучы аграном па садаводстве, не толькі кантралюе працэс, але і дапамагае ў зборы ягад.

Сузор'е беларусаў свету

КОЛАС ІВАН АНДРЭЕВІЧ

[5.6.1923, в. Каратыничы Мазырскай акругі, цяпер Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл. — 12.08.2007]

Адзін з арганізатараў партызанскага руху на Палессі ў Вялікую Айчынную вайну, разведчык, пісьменнік. Герой Расійскай Федэрацыі (1994), палкоўнік (1985).

І. Колас скончыў Мазырскае педагагічнае вучылішча (1939). З 1942 г. — на падпольнай рабоце ў тыле ворага ў Харкаўскай вобласці, потым у Лельчыцкім раёне — камандзір партызанскіх атрадаў імя Кутузава, імя Калініна і інш. У 1943—1944 гг. вёў падпольную і разведвальную работу на акупаванай тэрыторыі Пінскага, Баранавіцкага, Лідскага, Ваўкавыскага раёнаў, у Польшчы. У верасні 1944 г. падчас Варшаўскага паўстання па заданні Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання скочыў з парашутам у палаючую Варшаву. Потым да канца вайны вёў разведку ў Берліне. З 1949 г. у Галоўным разведупраўленні Міністэрства абароны СССР. Быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза, але па шэрагу кан'юнктурных прычын Залатой Зоркі не атрымаў.

У пасляваенны час стаў пісьменнікам, выдаў шэраг кніг успамінаў, якія выйшлі ў Мінску і Маскве. Аўтар кніг пра Вялікую Айчынную вайну «Варшава ў агні» (1956), «Рэйкавая вайна на Палессі» (1962), «Па заданні цэнтра» (1989), «Вяртанне з пекла: Выбранае» (1996) і інш. У адной з апошніх кніг «Гаротны роздум франтавіка» шмат месца адводзіць сучаснаму жыццю роднага Лельчыцкага раёна, яго праблемам, пераважна ў духоўным, маральным плане. У сувязі з 80-годдзем у Беларусі быў адзначаны ордэнам Францыска Скарыны.

Жыў у Маскве.

Аксана СПРЫНЧАН.

Вядучыя рубрыкі Святлана КАРПУЧОК і Яраслаў МАЛЬДЗІС.

Ён + Яна

Тры галоўныя якасці жонак

Нямецкія сацыёлагі апыталі мужчын ва ўзросце ад 25 да 50 гадоў, каб высветліць, на якіх трох кітах, на іх думку, трымаюцца ідэальныя адносіны? Высветлілася, што моцная палова чалавецтва прытрымліваецца дастаткова традыцыйных поглядаў.

Мужчыны вылучылі тры галоўныя якасці ідэальнай жонкі.

Кулінарныя здольнасці. Усе цудоўна ведаюць, што шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз яго страўнік. Калі вы ўмееце выпякаць розныя кулябякі і цудоўна гатуеце боршч, то за сваю будучыню можаце моцна не хвалявацца, — мужчына ніколі не пакіне вас, таму што «надта ж усё смачна». Гэта ж так?

Сэксуальнасць. У кожнай жанчыны свае чары. Безумоўна, дама вагой з тону не зможа выклікаць у мужчыны жадання зацалаваць яе да смерці (хоць, пра густы не спрачаюцца). Жанчына павінна сачыць за сваёй знешнасцю, займацца спортам, быць разняволенай у пасцелі, не баяцца эксперыментаў, і тады мужчына ні за што не будзе глядзець па баках.

Захапленне мужам. Так, прадстаўнікі моцнага полу таксама любяць камплименты. Мужчыны адзначылі, што калі жонка будзе паважаць мужа, захапляцца ім, падтрымліваць яго і быць яму «крыху мамай», то ён ніколі не пойдзе з сям'і.

Жанчыны выбіраюць гаспадарлівых

Чым больш эмансіпаванымі і самастойнымі становяцца жанчыны, тым мацней ім хочацца адчуваць не фінансавую падтрымку, а цвёрдае мужчынскае плячо. Апошнія даследаванні ў галіне сэксалогіі паказалі, што сучасныя дамы аддаюць перавагу не спешчаным багацеям, а суровым рабочым.

Амаль 65% рэспандэнтак заявілі, што хутчэй завялі б раман з «рукастым» мужчынам накшталт «зрабі сам» (з садоўнікам або рабочым), чым з багатым адвакатам. Да таго ж, тры чвэрці жанчын прызналіся, што іх больш прывабліваюць мужчыны, якія зарабляюць фізічнай, а не інтэлектуальнай працай.

Згодна з вынікамі апытання, самыя сэксуальныя мужчыны, з пункту гледжання жанчын, працуюць пажарнымі, пасля іх ідуць урачы і паліцэйскія. Жанчыны вельмі практычныя: яны прытрымліваюцца той думкі, што плаціць прафесіяналам нават за дробны рамонт па гаспадарцы вельмі стратна. Прасцей і выгадней мець пад рукой гаспадарлівага і моцнага кавалера. Амаль усе апытаныя прызналі, што гатовы кінуць мужчыну, калі ён не зможа выканаць самую простую работу па доме: палічку павесіць, цвік забіць або кран адрамантаваць.

Дайце каханку панюхаць... гарбуз

Пах гарбуза здольны выклікаць у мужчын сэксуальную пажаднасць, сцвярджаюць вучоныя з Чыкага.

«Выкіньце ўсю парфуму і прыгатуйце гарбузовы пірог!» — раіць Алан Хірш, кіраўнік даследавання, якое праводзілася з мужчынамі ва ўзросце ад 18 да 64 гадоў. Кожны з удзельнікаў эксперымента надзяваў спецыяльную араматызаваную маску, праз якую нейкі час вымушаны быў дыхаць. Даследчыкі тэставалі 24 водары на прадмет іх уплыву на ўзровень мужчынскай сэксуальнай пажаднасці.

Высветлілася, што водары гарбуза і лаванды найбольш сэксуальна стымулююць і выклікаюць адказ мужчынскага арганізма ў 40% выпадкаў. Таксама аказаліся даволі эфектыўнымі пахі ванілі і карыцы, а яшчэ клубніц.

«Калі ў вас бываюць праблемы з эрэкцыяй, завязіце ў спальні водаралямпу з эфірным алеем карыцы і пахкія палачкі з водарам гарбуза», — прапануюць вучоныя. Даследчыкам пакуль цяжка патлумачыць феномен моцнай сэксуальнай пажаднасці мужчын у адказ на пахі. Верагодна, у многім гэта тлумачыцца абуджэннем прыемных успамінаў і асацыяцый.

Бландзінкі — для забаў, брунеткі — для хатняй утульнасці

У чарговы раз уладальніцы светлых валасоў аказаліся незаконна пакрыўджанымі прадстаўнікамі моцнага полу. Мужчыны, якія праяўляюць павышаную цікавасць да бландзінак як да сябровак, катэгарычна адмовіліся ўспрымаць іх у якасці сваіх палавінак: маўляў, для гэтай ролі бландзінкі недастаткова сур'ёзныя і разважлівыя...

У апытанні брытанскай фірмы, якая выявіла гэты факт, узялі ўдзел тры тысячы мужчын. Яны і расказалі даследчыкам пра тое, што лічаць бландзінак лепшымі сяброўкамі, аднак аддаюць перавагу жанчына з брунеткамі.

Так, прыкладна кожны пяты прызнаўся, што бландзінкі больш сэксуальныя і лягчэй ідуць на кантакт. Аднак што датычыцца шлюбу, то ў ім мужчыны лічаць за лепшае мець справу з жанчынай цёмнавалосай, бо менавіта яна здаецца прадстаўнікам моцнага полу больш надзейнай і разважлівай.

Чым выкліканы падобныя асацыяцыі ў мужчын? Псіхолагі лічаць, што доўгавалосыя бландзінкі ўспрымаюцца часцей за ўсё як асобы з крымінальнымі схільнасцямі або нават як дамы лёгкіх паводзін. Яны ўздзейнічаюць на ўяўленне мужчын эратычна, у той час як цёмнавалосыя жанчыны ўнушаюць адчуванне цяпла і бяспекі, якія маюць важнае значэнне пры арыентацыі на стварэнне сям'і.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Грунвальдскую бітву адновяць у Дудутках

Фестывалі

Шэрагі крыжакоў пахіснуліся!.. Воіны Тэўтонскага ордэна, якія наводзілі страх на працягу двух стагоддзяў на жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, не разумелі, што адбываецца з імі на Грунвальдскім полі. Вось толькі што яны былі ўпэўнены ў сабе, у моцы свайго ордэна, у непераможнасці сваёй зброі — і раптам усё змянілася. Ліцвіны з палякамі мала таго, што трымаюць абарону, дык акрыялі і не баяцца злоснага, добра абучанага ворага — і ў нейкі момант пачалі браць верх...

Тое, што адбывалася 600 і адзін год таму, можна будзе паглядзець на свае вочы падчас рэканструкцыі Грунвальдскай бітвы на Трэцім фестывалі славы беларускай зброі ў Дудутках. Ліпень — менавіта той месяц, калі адбылася легендарная перамога над Тэўтонскім ордэнам аб'яднаных сіл Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. Сёлета фестываль «Наш Грунвальд» пройдзе ў выхадныя 30 і 31 ліпеня. Гэта магчымасць не проста дакрануцца да гісторыі, але пагрузіцца ў яе: дух сярэднявечнага горада дапаможа стварыць ярмарка майстроў, гасцям будзе прапанавана традыцыйная беларуская ежа і напоі. Напэўна, так маглі сілкавацца рыцары, якія збіраліся на абарону роднай зямлі. Але ж і яны самі будуць!

Сучасныя нашчадкі тых рыцараў памятаюць пра славу беларускай зброі і імкнуцца яе падтрымліваць. Праўда, ім выпала шчасце ўдзельнічаць у рыцарскіх турнірах (пешых, камандных) не з ворагамі, а з аднадумцамі, такімі ж захопленымі старадаўняй гісторыяй і, у прыватнасці, гісторыяй рыцараў. Ім выпала неваяваць асабіста, а рэканструяваць бітву, якая адбылася ў 1410 годзе. І кожны, хто трапіць на гэты фэст, зможа адчуць смак далёкай перамогі. А пасля бітвы што маглі рабіць рыцары? Натуральна, святкаваць — з музыкай і песнямі. Акурат так і задумана: 30 ліпеня ўвечары, калі ўсталюецца мір, адбудзецца «Пір пасля бітвы». Гэта канцэрт, дзе выступяць гурты «Стары Ольса» ды «Зніч», «Cornucopia» ды «Di smeraldo».

Што ж можна будзе рабіць на наступны дзень, пасля такога святкавання? Паглядзець на канцэрт лучнікаў ці конны турнір, паназіраць за масавай рыцарскай бітвай, пахварэць за некага падчас розных конкурсаў — напрыклад, на лепшы гістарычны касцюм.

Два дні свята для некага могуць стаць часам знаходжання на свежым паветры ў атмасферы, блізкай да аўтэнтычнай беларускай. Ці рыцарскай. Таму што калі хто збіраецца ехаць у Дудуткі на два дні, то можа спыніцца ў палаткавым лагеры, які адмыслова будзе арганізаваны для ўдзельнікаў. Прадуманы месцы для кемпінгу і для ахвотных тут спыніцца. А ўваходны білет на два дні фестывалю будзе каштаваць 45 тысяч рублёў.

Усё-такі, каб зразумець, што прымушае сучасную моладзь ісці ў рыцары, трэба з імі і дзень прастаяць, і ноч пратрымацца...

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПРЕДЛОЖЕНИЯ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «ТРИКОТАЖТОРГ»

1. Покупатель акций — Открытое акционерное общество «Трикотажторг», г. Минск, ул. Платонова, д. 30, т/ф 292 45 90, тел. 292 82 13.

2. Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются, — Открытое акционерное общество «Трикотажторг», 220005, г. Минск, ул. Платонова, д. 30.

3. Цель приобретения — для последующего аннулирования с целью уменьшения уставного фонда.

4. Количество акций, которое намеревается приобретать, — 52 000 (Пятьдесят две тысячи) простых (обыкновенных) акций.

5. Цена приобретения акций — 40 000 (сорок тысяч) белорусских рублей.

6. Сроки, форма и порядок оплаты акций — оплата осуществляется в безналичной форме денежными средствами путем зачисления на вкладные счета акционеров в течение 3 (трех) банковских дней с даты регистрации договора купли-продажи акций депозитарием ОАО «АСБ Беларусбанк».

7. Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций, — ОАО «Акционерный сберегательный банк «Беларусбанк», 220050, г. Минск, ул. Мясникова, д. 32.

8. Срок предоставления предложений акционеров о продаже акций с 06.07.2011 г. по 07.08.2011 г. по адресу: 220005, г. Минск, ул. Платонова, д. 30, ОАО «Трикотажторг».

9. Дата начала покупки акций (заключения договора купли-продажи акций) — 09.08.2011 г.

10. Дата окончания покупки акций (заключения договора купли-продажи акций) — 12.08.2011 г.

УНН 100185103

Заместитель генерального директора по коммерческим вопросам Т.В. Нараб

Хозяйственный суд города Минска объявляет о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности, ОАО «МонолитГрад»

Лот № 1. Изолированное нежилое помещение, инвентарный номер 500/D-707996796, общей площадью 833,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, улица Казинца, 120, пом. 3Н, стоимостью 4 826 593 200 белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,

а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 17.08.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Сидорок И.В., тел.-факс: 294 93 29 (49), 8029177 32 61 ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

Наименование объекта	Изолированное помещение
Местонахождение объекта	Брестская обл., Ивановский р-н, д. Потаповичи, ул. Школьная, 2
Продавец объекта	Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта» тел. 80162 20-52-37, 20-57-21, 22-06-13
Начальная цена продажи, руб.	10 273 717
Сумма задатка, руб.	1 027 000
Сведения об объекте	Изолированное помещение в 1-этажн. здании смешанной конструкции (блок, кирпич); площадь 79,7 кв.м; 1/2 доля пристройки кирпичной
Организатор торгов	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 80162 20-87-85, 23-12-63, 23-44-78, www. brest–region.by

Аукцион состоится **30 августа 2011 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 29 августа 2011 г. включительно.

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов.

5. Иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык.

6. Представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Порядок проведения аукционных торгов определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30.03.2009 № 36.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу:

г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413, фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 29 августа 2011 г. включительно.

Міжнароднае махлярства

КУДЫ ГЛЯДЗІЦЬ ДЗЯРЖДЭПАРТАМЕНТ ЗША?

Дзясяткі беларусаў, якія мелі намер атрымаць Грын Кард, сталі ахвярамі махлярства міжнароднага ўзроўню. Дзярждэпартамент ЗША пры гэтым моцна падмачыў сваю рэпутацыю.

Алег зацікавіўся магчымасцю іміграцыі ў ЗША з дапамогай Грын Кард («Зялёнай карты»). Паводле яго слоў, прынцып гэтай шматгадовай латарэі даволі просты: «Хочаш у Амерыку? Дашлі сваю анкету і фота і чакай, пакуль цябе выберуць». Куды дасылаць? На электронны адрас камерцыйнай ізраільскай арганізацыі USAFIS, якая аказвае платныя паслугі ўдзельнікам латарэі. Працуе з кліентамі праз інтэрнэт. На іх сайце можна запоўніць кароткую анкету, пакінуць прозвішча, імя, адрас электроннай пошты і тэлефон. Далей табе павінны пазваніць або даслаць электроннае пісьмо і прапанаваць аплаціць паслугу па ўдзеле...

Дзякуючы маштабу рэкламнай кампаніі і таму, што ў наведвальніка запытваюць кантактную інфармацыю яшчэ да таго, як той разумее, што тут давядзецца нешта аплаціць, у згаданай арганізацыі ўтварылася велізарная база звестак аб патэнцыйных кліентах. Размова ідзе без перабольшання пра мільёны прозвішчаў, імёнаў, адрасоў і тэлефонаў...

Яшчэ ў студзені на сайце USAFIS была выяўлена ўцечка інфармацыі. Уцечку спынілі. Аднак хто ведае, колькі махляроў адначасова ці паслядоўна яшчэ маглі скарыстацца магчымасцю «прабіць» вышэйзгаданы сайт? З пачатку гэтага года тым, хто пакідаў інфармацыю на сайце, дасылалася камбінацыя з двух пісьмаў. Спачатку прыходзіць адно, затым, праз нейкі час, другое. Першае маскіруецца пад пісьмо, адпраўленае ад імя USAFIS: выкарыстоўваецца лагатып арганізацыі — гэта слова ёсць у назве электроннай скрыні і подпісе. Праўда, сама электронная скрыня створана не на сапраўдным сайце гэтай арганізацыі, а на розных падстаўных сайтах і бясплатных паштовых сэрвісах, напрыклад, accountant.com, post.com і інш.

У пісьме, дарэчы, утрымліваецца цікавая інфармацыя: у радку, які пачынаецца словамі «You accepted to receive messages from», мяркуючы па ўсім, падумаў Алег, утрымліваецца дакладны час, калі ён пакідаў інфармацыю аб сабе на вышэйназваным сайце. А ў радку «For reference, your computer IP» утрымліваецца інфармацыя аб IP адрасе, якім карыстаўся наведвальнік у той момант, калі пакідаў інфармацыю пра сябе. Відавочна, гэтая інфармацыя ўтрымлівалася ў базе USAFIS, і зламыснікі здолелі атрымаць да яе доступ. Але пра гэта Алег на той момант не думаў. Пісьмо паведамляла аб тым, чаго ён так чакаў: ён выйграў Грын Кард і хутка атрымае пісьмо ад Дзярждэпартамента ЗША з далейшымі інструкцыямі. І сапраўды, праз нейкі час прыйшло другое пісьмо. Добра замаскіраванае пад адпраўленае Дзярждэпартаментам. Паколькі ў зламысніка ёсць персанальная інфармацыя аб чалавеку, яны з поспехам яе выкарыстоўваюць. Алег убачыў афіцыйную сімволіку Дзярждэпартамента ЗША, сваё імя, свой тэлефон, вялікае прыгожае пісьмо, у рэшце рэшт... Адкуль ён мог ведаць, што такія пісьмы адпраўляюцца з розных электронных адрасоў — dvstate.gov.usa@post.com, gov.states.visa@usa.com, usagov.states@usa.com і г.д? З выкарыстаннем слоў visa, gov, usa, dv, state можна нарадзіць не адну назву...

Такім чынам, у пісьме ўтрымліваецца падманная інфармацыя аб тым, што чалавек стаў пераможцам латарэі і цяпер яму «свецяць жыллё, праца і страхоўка. Зноў жа, Алег нават не задумаўся, што ўжо адны гэтыя абяцанні — суцэльная лухта, паколькі нічога такога пераможцам латарэі Грын Кард не абяцаецца. Далей «шчасліўчыку» даводзяць, што для таго, каб скарыстацца выйгрышам, неабходна перавесці па сістэме Western Union пэўную суму. Сумы, дарэчы, у розных пісьмах называюцца розныя. Атрымальніку паведамлення прапануецца даслаць на ўказаны электронны адрас нумар адпраўніка, а таксама імя атрымальніка (імёны гэтыя, зразумела, таксама мяняюцца ад пісьма да пісьма), памер плацяжу. Пры гэтым указваецца, што плацеж трэба адправіць на адрас у Лондане. Адрас супадае з адрасам Пасольства ЗША ў Лондане. Гэта, вядома ж, маскіроўка, паколькі плацяжы Western Union ніяк не звязаны з фізічным адрасам, бо адрас пры адпраўцы па такой сістэме не мае ніякага значэння.

Такім чынам, чалавек, які хацеў выйграць Грын Кард і які стаў ахвярай махляроў, ажыццяўляе перавод на прыдуманае імя. На ўказаны ў пісьме электронны адрас ён дасылае нумар пераводу і інфармацыю аб сабе. А валодаючы такімі звесткамі, няцяжка атрымаць перавод. Не выключана, што ў некаторых краінах наогул не патрабуецца прад'яўляць дакумент, які пацвярджае асобу, і атрыманне пераводу па выдуманым імені робіць гэтую аперацыю цалкам даступнай. Нельга выключаць і тое, што ў злачынцаў ёсць змова з работнікамі аднаго з аддзяленняў Western Union... Як і хто менавіта атрымлівае грошы грамадзян свету, у тым ліку і беларусаў, сказаць пакуль цяжка, бо патрабуецца як мінімум цеснае ўзаемадзеянне ўсіх структур, чыя рэпутацыя аказалася падмочанай у махлярскай справе.

Алег, вядома, званіў у расійскае прадстаўніцтва Western Union. І пачуў: «Выбачайце, мы не можам вярнуць плацеж. Звяртайцеся ў праваахоўныя органы...». Было і пісьмо ў Дзярждэпартамент, які займаецца правядзеннем латарэі: «Мы ведаем пра сітуацыю, звязаную з падманнымі паведамленнямі аб выйгрышы. Пераможцы будуць аб'бірацца пазней, і інфармацыя аб выйгрышы не будзе рассылацца па электроннай пошце, а павінна правярацца кожным асабіста па рэгістрацыйным нумары». Пытанне аб тым, як персанальныя звесткі трапілі ў рукі зламыснікаў, засталося без адказу...



Завітаў Алег і ў мінскі «Цэнтр Грын Кард». «Мы фіксуем масу зваротаў у гэтай сувязі. На нашым сайце мы падрабязна тлумачым, што мае быць махлярства. Чаму няма інфармацыі ў прэсе? Выбачайце, мы не займаемся інфармаваннем за свой кошт».

Быў зварот і ў Пасольства ЗША ў Мінску. «Выбачайце, мы не займаемся візавай латарэяй. Звяртайцеся ў Пасольства ЗША ў Варшаве або напрамую ў Дзярждэпартамент».

Грошы растварыліся, а ў Алега засталося шмат пытанняў. А самае важнае для такіх, як ён, наступнае: «Чаму ніхто не займаецца расследаваннем, пошукам злачынцаў?» Усё, на што аказаўся здатны Дзярждэпартамент ЗША — гэта ануляваць вынікі ранейшай латарэі і прызначыць час аб'яўлення новых пераможцаў.

Сяргей ІВАНОЎ.

алімпіец

ЗВЯЗДА

ВЫПУСК № 2 (11)

27 ліпеня 2011 г. ЗВЯЗДА

7

Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

„ГОД ДА ПАЧАТКУ АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ — ГЭТА ЯШЧЭ ДАСТАТКОВЫ АДРЭЗАК, КАБ ТРЭНЕРАМ ПРЫ НЕАБХОДНАСЦІ НЕШТА ПАДКАРЭКТАВАЦЬ У ТРЭНІРОВАЧНЫМ ПРАЦЭСЕ. А ДЛЯ СПАРТСМЕНА, ЯКІ ЗБІРАЕЦЦА АБАРАНЯЦЬ ГОНАР СВАЁЙ КРАІНЫ, ГЭТА ПЭЎНЫ РУБЕЖ, КАБ АЦАНІЦЬ СВАЕ МАГЧЫМАСЦІ"

„НА ПАЎНАЦЭННУЮ ДЗЯРЖАЎНУЮ ПАДТРЫМКУ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА РОЗНЫЯ ЦЯЖКАСЦІ, МОЖА РАЗЛІЧВАЦЬ КОЖНЫ СПАРТСМЕНЦІ ТРЭНЕР, ЯКІ ЎНОСІЦЬ СВОЙ ВАЖКІ ЎКЛАД У ПАДТРЫМКУ АЙЧЫННАГА СПОРТУ І АЛІМПІЙСКАГА РУХУ"

НАСУСТРАЧ АЛІМПІЙСКІМ ГУЛЬНЯМ-2012 У ЛОНДАНЕ

Алег КАЧАН, міністр спорту і турызму Беларусі:

«У Лондане Беларусь ведаюць як спартыўную краіну»

Гэтымі днямі алімпійская тэматыка актуальная, бадай, як ніколі. Лондан, як сталіца летняй Алімпіяды-2012, аб'явіў аб важнай «палітычнай» даце, што азначае: да пачатку гульняў у Вялікабрытаніі застаецца адзін год.
З якім багажом падыходзяць беларускія спартсмены да важнейшых стартаў чатырохгоддзя, як ідуць справы з завяаваннем алімпійскіх ліцэнзій, якія клопаты дзяржавы адчуваюць на сабе кандыдаты на паездку на XXX летнія Алімпійскія гульні? Пра гэта карэспандэнт «Звязды» гутарыць з міністрам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Алегам КАЧАНОМ.

— Алег Леанідавіч, як спартыўны функцыянер са стажам, якому да міністэрскага крэсла давялося пабываць у самых розных спартыўных іпастасях, адчуваеце ўжо подых алімпійскага агню ў Лондане? Усё ж такі 365 дзён — гэта невялікі адрэзак у параўнанні з чатырохгадовым інтэрвалам, які аддзяляе паміж сабой летнія ці зімовыя алімпіяды.

— Думаю, што мы вытрымліваем «вытворчы» графік не толькі па завяванні спартсменамі права выступаць у Лондане, але і, нягледзячы на ўсе эканамічныя цяжкасці, якія тычацца і нашай краіны, захоўваем «сацыяльны пакет» для атлетаў, што маюць віды на высокія вынікі і на медалі. У неабходнай меры забяспечваюцца зборы, у тым ліку і міжнародныя, спартсмены атрымоўваюць алімпійскія стыпендыі.

— Відавочна, што план на 25 узнагарод можа нагадваць дамоклаў меч. Ці не стане ён перашкодай у пакарэнні беларускімі атлетамі алімпійскіх вяршынь?

— Ведаеце, на гэты конт ёсць добрая народная мудрасць: «Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць». Таму не трэба зараз ні спартсменам, пра якіх дзяржава клапоціцца на працягу ўсяго перыяду падрыхтоўкі, ні трэнерам і спецыялістам, якія таксама не абдзелены ўвагай, думаць: «А раптам не атрымаецца?» Будзем аптымістамі. Вунь паглядзіце, што маглі сатварыць беларускія футбалісты на нядаўнім моладзевым чэмпіянаце Еўропы ў Данії, калі б не судзейскія рэпрызы. І тым не менш, хацелася гэтага каму ці не, але бронзавыя ўзнагароды каманда Георгія Кандрацьева прывезла на радзіму. Так што, як кажуць, пабольш аптымізму і агеньчыку ў вачах кожнаму з нас.

Зрэшты, год да пачатку Алімпійскіх гульняў — гэта яшчэ дастатковы адрэзак, каб трэнерам пры неабходнасці нешта падкарэктаваць у трэніровачным працэсе. А для спартсмена, які збіраецца абараняць гонар сваёй краіны, гэта пэўны рубеж, каб ацаніць свае магчымасці, яшчэ раз усвядоміць персанальную адказнасць за выступленні на такіх спаборніцтвах, як Алімпійскія гульні.

— У пачатку размовы вы падкрэслілі, што дзяржава, патрабуючы высокіх вынікаў, выконвае свае абавязкі па паўнацэнным забеспячэнні алімпійцаў усім неабходным: паўнацэннымі зборамі, стыпендыямі, фармакалогіяй...

— Абсалютна так. Я ўжо неаднаразова гаварыў і паўтараўся цяпер: сёння Рэспубліка Беларусь з'яўляецца краінай, у якой дзейнічае прынцып «умяшальніцтва» ў спартыўную сферу», але не хірургічнага. Гэта значыць, дзяржава бярэ на сябе адказнасць і абавязкі па яе развіцці. Мне здаецца, што такая мадэль узаемаадносін супадае з прыярытэтнай сістэмай поглядаў сучаснага свету, калі прысутнасць моцнай дзяржаўнай рукі ў спорце не столькі аб'ектыўная рэальнасць, колькі вострая неабходнасць. Яшчэ раз хочацца сказаць пра тое, што рэальную дапамогу ў забеспячэнні беларускіх спартсменаў усім неабходным у працэсе падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў аказваюць многія міністэрствы і ведамствы. У гэтым спісе — міністэрствы фінансаў, эканомікі, адукацыі, аховы здароўя, інфармацыі, унутраных спраў, нашы тэлевізійныя кампаніі, Нацыянальная акадэмія навук і некаторыя іншыя, за што ім вялікі дзякуй.

— Алег Леанідавіч, калі нашу размову перавесці ў плоскасць Алімпійскіх гульняў, якія пройдуць у Лондане?

— Для паспяховага выступлення беларускіх спартсменаў на XXX летніх Алімпійскіх гульнях-2012 Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным алімпійскім камітэтам Беларусі была распрацавана Праграма, зацверджаная пастановай Саўміна для поўнай і паўнацэннай падрыхтоўкі беларускіх атлетаў на бліжэйшае чатырохгоддзе. Галоўнай задачай сезона 2011 года мы лічым выкананне спартсменамі кваліфікацыйных патрабаванняў, устаноўленых Міжнароднымі спартыўнымі федэрацыямі для ўдзелу ў летніх Алімпійскіх гульнях. Для вырашэння гэтай задачы была вызначана група кандыдатаў у колькасці 275 чалавек па 31 відзе спорту, якія былі разбіты на 3 групы. Зразумела, што ў першым спісе — дысцыпліны, на якія мы разлічвалі. Сярод іх — бокс, лёгкая атлетыка, стральба кулявая, цяжкая атлетыка, мастацкая гімнастыка, веславанне акадэмічнае і на байдарках і каноэ. Праўда, жыццё ўносіць свае карэктывы ў такі расклад. Пасля завяавання нашымі маладымі футбалістамі бронзы на еўрапершынстве ў Данії футбол аўтаматычна з другой групы, дзе шанцы завяваць ліцэнзіі на алімпійскія гульні і паспяхова там выступіць былі невысокімі, перасоўваецца ў першую. І зараз, як бы гэта ні гучала, але краіна разлічвае на паспяховае выступленне беларускай «маладзёжкі» на Уэмблі. У той жа час такі каманды від спорту, як жаночы баскетбол, пасля няўдачы нашых дзяўчат на першынстве кантынента ў Польшчы, аўтаматычна выбыў з алімпійскай гонкі. Праўда, думаю, што каманда Анатоля Буяльскага свайго апошняга слова яшчэ не сказала. Упэўнены, што, дзякуючы апошнім поспехам нашых спартсменаў у футболе і баскетболе ў Лондане, Беларусь ведаюць як спартыўную краіну.

Зразумела, што менш за ўсё шанцаў на завяаванне алімпійскай ліцэнзіі ў прадстаўнікоў апошняй групы, куды ўваходзяць пляжны валейбол, воднае пола, бейсбол. Праўда, хачу яшчэ раз нагадаць: у выпадку, калі хто-небудзь з неперспектыўных груп пакажа высокія вынікі, то спартсмены і трэнеры ў аператыўным парадку будуць «пераключаны» на больш высокі ўзровень дзяржаўнага забеспячэння.

Мне хочацца падкрэсліць, што зараз для кандыдатаў-алімпійцаў ужо праведзены сотні вучэбна-трэніровачных збораў у рэспубліцы і за мяжой, забяспечаны ўдзел у шматлікіх міжнародных спаборніцтвах, актывізавана работа па навуковым забеспячэнні і справаджэнні нацыянальных камандаў па летніх відах спорту, удасканалена адзіная камп'ютарная сістэма кантролю ў вобласці медыцынскага забеспячэння, нямала робіцца для антыдопінгавага суправаджэння нашых алімпійцаў.

Упэўнены, што такія дзяржаўныя клопаты аб беларускіх алімпійцах паспрыяюць завяванню ў многіх дысцыплінах, пераважна з першай групы, неабходнай колькасці ліцэнзій, якія даюць права на ўдзел у Алімпіядзе.

— Алег Леанідавіч, вы, як шэф місіі на бліжэйшых Алімпійскіх гульнях, можаце сказаць, якой па колькасці будзе беларуская дэлегацыя і як яна будзе дабірацца ў Лондан?

— Нават пры вялікім жаданні сказаць пра гэта не магу, бо спартсмены толькі пачалі завaёўваць алімпійскія ліцэнзіі. Лічыце, яшчэ ў некаторых атлетаў ёсць цэлы год, каб ва ўпартай барацьбе заваяваць такое права. Традыцыйна спартсмены складаюць дзве трэці ад усёй дэлегацыі. Думаю, што так будзе і на гэты раз. З вялікай доляй верагоднасці можна казаць, што для дастаўкі каманды, трэнераў, медыцынскага персаналу, журналістаў будзе выбрана нацыянальная авіякампанія «Беларавія». Так што ў паветры нашым алімпійцам прыйдзецца правесці няшмат часу. Упэўнены, што беларусы, асабліва спартсмены, паспяхова і камфортна дабяруцца ў Лондан, дзе будуць дастойна прадстаўляць нашу краіну на ўсіх без выключэння алімпійскіх стартах.

Да пачатку летніх Алімпійскіх гульняў у Лондане застаецца 365 дзён. Наколькі гатовы за адзін год да важнейшых стартаў чатырохгоддзя беларускія алімпійцы? Абмеркаванню гэтых пытанняў, а таксама шэрагу іншых, у якіх адлюстроўваецца жыццё айчыннага спорту, прысвечаны сённяшні спецвыпуск, гасцямі якога сталі вядомыя ў краіне дзеячы спорту і алімпійскага руху.

Алімпійская мазаіка

ТАЛІСМАНЫ — З ГОРАДА І ВЁСКІ

Талісманы Гульняў былі зацверджаны ў маі 2010 года. Імі сталі, як заяўляюць аўтары, дзве кроплі вады з Болтана па імені Венлок і Мандэвіль. Яны названы ў гонар горада Мач-Венлок, у якім прайшлі першыя спаборніцтвы накшталт Алімпійскіх гульняў, і вёскі Сток-Іпндэвіль — там прайшлі першыя на тэрыторыі Вялікабрытаніі Паралімпійскія гульні.

У абодвух талісманаў па адным воку, яны носяць веласіпедныя шлемы, на іх намаляваны лагатыпы Гульняў.

Ігар ЗАІЧКОЎ, першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі:

«Беларускія алімпійцы павінны праявіць сябе на Гульнях у Лондане з самага лепшага боку»



Імклівае прыбліжэнне XXX Алімпійскіх гульняў у Лондане, без сумненняў, надае дадатковы імпульс для атлетаў многіх краін, якія збіраюцца скараць спартыўны алімп. Пэўна, што беларусы ў гэтым спісе — не выключэнне. Аб тым, як рыхтуюцца нашы алімпійцы-«летнікі» да паездкі на «Туманны Альбіён» і на што яны могуць разлічваць, карэспандэнт «Звязды» гутарыць з першым віцэ-прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь, памочнікам Прэзідэнта краіны па пытаннях спорту, фізічнай культуры і турызму Ігарам Заічковым.

— Ігар Мікалаевіч, год, што застаўся да пачатку Алімпіяды ў Лондане, накладвае свой адбітак на ход падрыхтоўкі беларускіх алімпійцаў. Магчыма, у нейкіх дысцыплінах патрэбна фарсіраваць падзеі?

— Ведаеце, у народзе наконт такой «прапановы» звычайна кажуць: «Не наеўся — не наліжашся». А калі без жартаў, то ніякай спешкі ў давядзенні айчынных спартсменаў да неабходных кандыцый не патрэбна: да алімпійскіх стартаў яшчэ цэлы год. У свой час на дзяржаўным узроўні была прынята праграма падрыхтоўкі да Алімпіяды ў Лондане, трэнеры, спецыялісты і атлеты распрацавалі і прынялі індывідуальныя планы, якія зараз рэалізуюцца. А кіраўніком дзяржавы ў 2010-2011 г. г. падпісаны шэраг указаў аб дзяржаўнай падтрымцы спартсменаў-ваеннаслужачых, аб імянных стыпендыях, аб узнагароджванні вядучых спартсменаў і трэнераў. Ды і што казаць: павелічэнне памеру прызавых (150 тысяч долараў ЗША за залаты медаль, 75 тысяч — за сярэбраны і 50 тысяч — за бронзавы) — ці не гэта лепшы стымул для атлетаў і іх настаўнікаў у дасягненні высокіх вынікаў, і асабліва ў завяванні алімпійскіх медалёў? Не магу адказваць за кожнага з іх, але «гарачы» подых Алімпіяды ў Лондане, магчыма, для кагосьці стане тым момантам, калі варта зрабіць нейкія карэкціроўкі ў працы.

— У лічбах маглі б абмаляваць карціну агульнай падрыхтоўкі беларусаў да важнейшых стартаў чатырохгоддзя?

— Безумоўна. Ні для каго не было сакрэтам, што на XXX летнюю Алімпіяду з самага пачатку былі адабраны 275 спартсменаў ў 31 відзе спорту, сярод якіх як медальныя дысцыпліны, так і менш перспектыўныя, у якую, дарэчы, футбол не ўваходзіў. Як ні круці, а сітуацыя з завяаванем беларускімі футбалістамі моладзевай зборнай бронзавых медалёў еўрапейскага першынства і пуцёўкі ў Лондан — лішняе пацвярджэнне таго, што на паўнацэнную дзяржаўную падтрымку, нягледзячы на розныя цяжкасці, можа разлічваць кожны спартсмен ці трэнер, які ўносіць свой важкі ўклад у падтрымку айчыннага спорту і алімпійскага руху.

Як вядома, першым пуцёўку на Алімпіяду-2012 заваяваў наш вядомы сралок Сяргей Мартынаў. Сёння ў нас алімпійскіх ліцэнзій ужо звыш 50 у 6 відах спорту. Думаю, што нам па сілах не толькі паўтарыць, але і перакрыць дасягненне папярэдніх Гульняў у Пекіне, калі беларусы ўдзельнічалі ў 112 дысцыплінах па 26 відах спорту.

Забягаючы наперад, хачу падкрэсліць: ніхто турыстам у Лондан за кошт дзяржавы не паедзе. Кожнаму атлету будзе пастаўлена адпаведная задача, якую ён абавязаны выканаць.

— Гэта значыць, што сёння суветны спорт — гэта цэлая індустрыя, у развіццё якой укладваюцца велізарныя фінансавыя сродкі, і ад такіх грашовых уліванняў чакаецца адпаведная аддача.

— Безумоўна. Жыццё ў спорце, як і час, бяжыць імкліва. Як вынік, метафары ў сённяшнім спартыўна-алімпійскім руху паступова страчваюць сваё першапачатковае значэнне. Таму і крылаты выраз заснавальніка алімпійскага руху П'ера дэ Кубертэна «Хутчэй, вышэй, мацней!» мае крыху іншы сэнс: абавязковае дасягненне высокага выніку, а яшчэ лепш — медаля.

Зразумела, што гэта ў ідэале. У рэальным жыцці часта атрымліваецца не так, як хочацца. Хоць, наколькі мне вядома, зараз ніхто з кіраўніцтва федэрацый, асацыяцый і саюзаў «турыстаў» на міжнародныя спаборніцтвы стараецца не вазіць.

— Палітыка дзяржавы ў гэтым плане зразумелая. Праўда, каб не было «турыстаў», трэба мець адпаведную праграму развіцця галіны.

— Паўтараўся, што ў Беларусі ёсць адпаведная дзяржаўная Праграма, якая ахоплівае не толькі 2011-2012 г. г., але і скіравана на падрыхтоўку да Алімпійскіх гульняў-2014 ў Сочы. Несумненна, што яна дазваляе паўнацэнна развівацца многім спартыўным дысцыплінам, дасягаць пэўных поспехаў у развіцці фізкультурнага руху ў краіне, аздараўленні нацыі. Дзеля гэтага з падачы Прэзідэнта краіны пабудавана шмат аб'ектаў спартыўнага прызначэння. Прычым, у роўнай меры як зімовага, так і летняга. Вяртаючыся да тэмы спорту вялікіх дасягненняў, хочацца сказаць, што усе прынятыя дакументы, накіраваныя на развіццё алімпійскага руху ў краіне, не толькі ахопліваюць задачы, што стаяць перад намі, але і маюць намер аб'яднаць намаганні ў дасягненні канчатковай мэты розных міністэрстваў і ведамстваў, некаторыя кіраўнікі з якіх выбраны на кіруючыя пасты многіх федэрацый для больш аператыўнага і эфектыўнага прыняцця правільных рашэнняў.

— Ігар Мікалаевіч, Прэзідэнт Беларусі на алімпійскім сходзе агучыў самую важную задачу — завяваць у Лондане 25 алімпійскіх медалёў. Зразумела, што пытанне наконт рэальнасці яе выканання можа насіць правакацыйны характар...

— Думаю, што кіраўнік дзяржавы сказаў гэта не проста так. Ён штодня ў курсе ўсіх падзей, што адбываюцца ў тым ліку і ў спорце вялікіх дасягненняў. Ды і ў нашай краіне вельмі шмат робіцца для мадэрнізацыі спартыўных баз, узвядзення новых спартыўных аб'ектаў, дастойнага забеспячэння сертыфікаванымі фармакалагічнымі і неабходнымі медыцынскімі прэпаратамі. Да таго ж Беларусь можа пахваліцца не толькі тым, што ёй дасталася багатая спартыўная спадчына ад былога Савецкага Саюза і традыцыі перамагаць, але і тое, што ў нас цяпер выхавана свая плеяда атлетаў у многіх дысцыплінах, якія паказваюць высокія вынікі на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету і Еўропы.

Безумоўна, не ўсё яшчэ адрэгулявана належным чынам у спартыўнай галіне. Ёсць пытанні ў павышэнні аплаты працы дзіцячых трэнераў, у высокай арэнднай плаце за спартыўныя аб'екты, замацаванні трэнерскіх кадраў у дарослых камандах і г.д. Не скажаш, што гэта дэталі і пытанні вырашацца самі сабой. Тым не менш, лічу, што ўвогуле спартыўная галіна і алімпійскі рух у нашай краіне развіваюцца ў правільным кірунку. Ды і нядаўні Указ кіраўніка дзяржавы аб значным павышэнні прэміяльных спартсменам за залатыя, сярэбраныя і бронзавыя алімпійскія медалі дасць дадатковы штуршок у дасягненні высокіх вынікаў. А яшчэ многія пытанні, у тым ліку і фінансавыя, могуць вырашацца на ўзроўні федэрацый. Па прыклад далёка хадзіць не будзем. Вось Беларускую федэрацыю барацьбы ўзначальвае вядомы ў краіне бізнэсмен Юрый Чыж, які ў сябе на радзіме ў горадзе Бяроза адкрыў спартыўны комплекс, дзе ёсць зала і для заняткаў барацьбой. Дык вось, Юрый Аляксандравіч знаходзіць магчымасць, каб матэрыяльна падтрымліваць маладых трэнераў, якія вядуць заняткі. Чым гэта не прыклад для іншых прадпрымальных асоб?!

— Трэба меркаваць, што дадатковы матэрыяльны стымул будзе немалаважнай дэталлю для паспяховага выступлення беларускіх алімпійцаў праз год у Лондане?

— Я ў гэтым не сумняваюся. Хоць, выходзячы з сённяшніх рэалій у айчынным спорце, магу сказаць, што мы павінны пастаянна ўдасканальвацца і імкнуцца павышаць сваё майстэрства не толькі дзеля грошай, але і каб падкрэсліць сваім натхненнем і ўпартасцю ўласную годнасць перад супернікамі.

— Значыць, фінансавая зацікаўленасць — не самы важкі аргумент у дасягненні адпаведных вынікаў?

— Я сказаў бы інакш — не галоўны. Так, вельмі важна, каб спартсмен, які для падрыхтоўкі да важных стартаў патраціў нямала крыві і поту, ведаў: твае памкненні і жыццёвыя мары ўраз могуць збыцца, калі выйграеш алімпійскае «золата». Але ж, мне здаецца, для дасягнення гэтай мэты трэба мець адказнасць перад сабой за краіну, сцяг якой ты абараняеш. І як бы гэта пафасна ні гучала, у першую чаргу ты павінен быць патрыятычна загартаваны, аддаваць сябе барацьбе не дзеля банкаўскай карткі, а для падтрымання высокай рэпутацыі настаўнікаў, што цябе вучылі, і, у рэшце рэшт, дзеля самога сябе, свайго «Я» ў гэтым жыцці.

Тым не менш, я ўпэўнены, што беларускія алімпійцы павінны праявіць сябе на Алімпійскіх гульнях у Лондане з самага лепшага боку.

— Вашы спадзяванні грунтуюцца на нейкім унутраным пачуцці?

— Давайце зыходзіць з таго, што мы ўжо даўно не навічкі ў гэтай справе. Як-ніяк, а маючыя адбыцца старты ў Лондане — гэта шостыя Алімпійскія гульні. Таму ўсе ці амаль усе нюансы і магчымыя «сюрпрызы», якія могуць зыходзіць ад арганізатараў, суддзяў, прадстаўнікоў допінг-лабараторыі і г.д., — сёння мы можам прадбачыць і прыняць неабходныя меры загадзя.

Яшчэ раз паўтару старую ісціну, што кожны — каваль свайго шчасця. Хоць алімпійскі прынцып П'ера дэ Кубертэна «Галоўнае — не перамога, а ўдзел» ніхто не адмяняў, але ў любым выпадку раздзіма будзе чакаць ад кожнага з айчынных алімпійцаў дастойнага выступлення.

На стане на 27 ліпеня 2011 года асноўныя алімпійскія кваліфікацыйныя нарматывы выканалі 53 спартсмены ў 6 відах спорту: стральба кулявая — 6 ліцэнзій; настольны тэніс — 2 ліцэнзіі; лёгкая атлетыка — 22 спартсмены выканалі кваліфікацыйны нарматыў «А»; плаванне — 2 спартсменкі выканалі кваліфікацыйны нарматыў «А»; стральба з лука — 1 ліцэнзія; футбол — 18 спартсменаў дапушчаны да фінальных алімпійскіх спаборніцтваў.

НАШЫ Б'ЮЦЬ!

Гэтымі днямі мінскі Палац спорту быў сапраўдным эпіцэнтрам майстроў скураной пальчаткі: пад зводамі манежу прайшоў імянны Міжнародны турнір па боксе, які, можна не сумнявацца, стаў сапраўднай візітнай карткай беларускай і сталіцы і ўсяго айчыннага спорту.

Як-ніяк, а турнір, прысвечаны Герою Савецкага Саюза Віктару Лівенцаву, мае багатую гісторыю і свае традыцыі. Чаго толькі варты выйгрыш мінчаніна Ігара Высоцкага ўзору 1976 года накаўтам у трохразовага алімпійскага чэмпіёна кубінца Тэафіла Стывенсана. Ды і цяперашні турнір, на які сабраліся атлеты з Еўропы, Азіі, Афрыкі і Аўстраліі, меў пэўны алімпійскі статус: ганаровым госцем на баксёрскім святе быў першы і адзіны беларускі алімпійскі чэмпіён 1988 года ў Сеуле Вячаслаў Яноўскі (на фота зверху). Ён адзначыў, што і мінулы моладзевы чэмпіянат Еўропы, які праходзіў у Мінску, і цяперашні турнір наглядна паказалі, што бокс у Беларусі развіваецца. Хоць дастаткова і праблем, але маладыя хлопцы ўпэўнена крочаць наперад. Яны — дастойная змена цяперашнім лідарам. Пацвярджэннем гэтых слоў сталі 11 медалёў беларускай каманды, з якіх 6 — залатыя.

Патэнцыйным удзельнікам АГ-2012 у Лондане выплачваецца 40 стыпендый Гродзенскага аблвыканкама

Пачынаючы з 1964 года, у дзесяці летніх алімпіядах удзельнічалі 108 спартсменаў Гродзенскай вобласці. Яны заваявалі 29 медалёў з якіх 12 залатых.

10 стыпендый таксама прызначыў Гродзенскі гарвыканкам. А 22 спартсмены, якія рыхтуюцца да XXX летніх Алімпійскіх і XIV Паралімпійскіх гульняў 2012 года ў Лондане, замацаваны за прадпрыемствамі абласнога цэнтра і атрымліваюць фінансавую падтрымку ад гэтых арганізацый. Аблвыканкам выдзеліў 3 мільярды рублёў на пакупку высакаякаснага інвентару — веласіпедаў, лукаў, фехтавальнага абсталявання, лодак для акадэмічнага веславання, спецыяльнага лёгкаатлетычнага абутку, барцовак, патронаў для кулявой стральбы. Акрамя таго, за два апошнія гады палепшаны жыллёвыя ўмовы 62 спартсменаў, трэнераў і спартыўных работнікаў. Аб гэтым «Звяздзе» паведаміў намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар ЖУК.

— Ігар Георгіевіч, на якое прадстаўніцтва алімпійцаў у Лондане разлічваюць на Гродзеншчыне і ці многія з патэнцыйных кандыдатаў ужо атрымалі адпаведныя ліцэнзіі?

— Спіс спартсменаў для падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў (53 кандыдаты па 14 відах спорту) быў вызначаны ў 2009 годзе. А па выніках леташніх спаборніцтваў адбылася пэўная карэкцыя: у групу «А» ўключана 29 спартсменаў, у групу «Б» — 20, адпаведна па дзевяці і адзінаццаці відах спорту.

Паводле апошняй інфармацыі, алімпійскія нарматывы выканалі 10 спартсменаў вобласці: 8 — у лёгкай атлетыцы. На моладзевым чэмпіянаце Еўропы па футболе ў Данії зборная каманда Беларусі заняла трэцяе месца і заваявала права ўдзельнічаць у Алімпійскіх гульнях. У складзе каманды выступалі чатыры выхаванцы Гродзеншчыны: Алег Вераціла, Яўген Савасцянаў, Сяргей Палітэвіч, Юрый Астравух. А вось баскетбалісткам, сярод якіх пяць гродзенскіх спартсменак, атрымаць алімпійскую ліцэнзію, на жаль, не ўдалося.

Па многіх відах спорту адбор на Алімпійскія гульні 2012 года працягваецца. Напрыклад, да ўдзелу ў чэмпіянатах свету, дзе будуць разыгрывацца алімпійскія ліцэнзіі, рыхтуюцца Аляксандр Мотыль, Аляксей Ісаеў (барацьба вольная), Максім Кажарскі, Іван Гузаў, Аляксандр Грабовік (барацьба грэка-рымская). Разлічваем, што 27 — 30 спартсменаў Гродзеншчыны выканаюць алімпійскі нарматыў і 18 — 20 чалавек (лёгкая атлетыка, барацьба вольная і грэка-рымская, грэбля на байдарках і каноэ, футбол, кулявая стральба, цяжкая атлетыка) паедуць на Алімпійскія гульні.

— Ці адпавядае сучасным патрабаванням матэрыяльна-тэхнічная база спартыўных аб'ектаў на Гродзеншчыне? Наколькі плённа ідзе падрыхтоўка спартыўнага рэзерву?

— У прыватнасці, у гродзенскім спартыўным комплексе «Нёман» праведзены капітальны рамонт залаў боксу, фехтавання, барацьбы (дзюдо), цяжкай атлетыкі, спартыўнай гімнастыкі, гасцініцы. Купілі неабходны інвентар і абсталяванне — баксёрскі рынг, татамі, батуты, трэнажоры, фехтавальнае і гімнастычнае абсталяванне. Больш чым на 740 мільёнаў рублёў набыта медыцынскага абсталявання для абласнога дыспансэра спартыўнай медыцыны, за ўрачамі якога замацаваны ўсе спартсмены, капітальна адрамантаваны стралковы цір таварыства «Дынама». Добрая спартыўная база пабудавана ў Лідзе.

На базе Гродзенскага лядовага Палаца спорту і СДЮШАР № 10 арганізаваны абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па хакеі. А сёлета на базе Мастоўскай СДЮШАР № 1 з 1 верасня створаецца абласны цэнтр па вяслярных відах спорту.

Аднак, нягледзячы на станоўчую дынаміку рэсурснага забеспячэння, узровень матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацый фізічнай культуры і спорту ў большасці раённых цэнтраў, спецыялізаваных вучобна-спартыўных устаноў усё яшчэ не адпавядае сучасным патрабаванням. Найбольш актуальнай праблемай для пераважнай колькасці дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ з'яўляецца старэнне асноўных фондаў (залы, басейны, стралковыя ціры, вяслярныя, веласіпедныя базы), востры дэфіцыт інвентару і абсталявання, спартыўнай формы. Пры гэтым асноўная доля фінансавання спартыўных школ ідзе на зарплату трэнерам, і толькі мізэр — на аснашчэнне інвентаром і абсталяваннем, без чаго немагчыма падрыхтаваць спартсмена.

Праблема і ў тым, што многія спартыўныя школы ажыццяўляюць сваю працу ў асноўным з групамі пачатковай падрыхтоўкі і вучэбна-трэніровачнымі аднаго, двух гадоў навучання і ўжо да дзявятага класа адзінкі школьнікаў працягваюць займацца спортам.

На Гродзеншчыне 37 аддзяленняў па відах спорту маюць статус спецыялізаваных алімпійскага рэзерву, і толькі ў паловы з іх ёсць групы спартыўнага ўдасканалення. А гэта юніёры, моладзь, дарослыя, якія фарміруюць каманды вобласці для ўдзелу ў рэспубліканскіх спаборніцтвах і ў саставах зборных Беларусі ўдзельнічаюць у афіцыйных міжнародных спаборніцтвах.

Стрымлівае падрыхтоўку спартыўнага рэзерву і тое, што прыярытэты фінансавання накіраваны ў бок спорту вышэйшых дасягненняў, але, на жаль, не на карысць дзіцяча-юнацкаму спорту. Даводзіцца адпраўляць не толькі зборныя каманды абласцей на рэспубліканскія спаборніцтвы, але і спартсменаў, якія выязджаюць на чэмпіянаты свету, Еўропы ў складзе нацыянальных каманд. Хоць гэтыя сродкі маглі быць накіраваны на дзіцячы спорт.

Сёлетні год будзе вызначальным у падрыхтоўцы да летніх Алімпійскіх гульняў у Лондане, і таму неабходна стварыць максімальна камфортныя ўмовы для падрыхтоўкі вядучых спартсменаў вобласці да галоўнага старту чатырохгоддзя. Адна з галоўных задач — забяспечыць правядзенне якаснага вучэбна-трэніровачнага і спаборніцкага працэсу, для чаго патрабуюцца значныя фінансавыя затраты і кансалідацыя намаганняў розных устаноў.

Беларускай асацыяцыі спартыўнай прэсы — 20 гадоў

Ліпень 2011 года для шматлікіх беларускіх журналістаў, якія ўваходзяць у грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя спартыўнай прэсы» (БАСП) і не па чутках ведаюць, што такое масавы спорт і спорт вялікіх дасягненняў, стаў у некаторым сэнсе знамянальным. І прычына таму вельмі простая: арганізацыі, якая аб'ядноўвае ў сваіх радах як «акул пяра», так і навічкоў, споўнілася 20 гадоў.

У дзень свайго нараджэння БАСП, у склад якой уваходзяць амаль паўтары сотні прадстаўнікоў айчынных мас-медыя, сабрала ўсіх сваіх сяброў і спонсараў у Музеі алімпійскай славы Беларусі.

А галоўнай дзейнай асобай, дзякуючы чаму мерапрыемства набыло святочнае адценне, стаў прэс-аташэ футбольнага клуба «Мінск» Аляксандр Томін. Ён падрыхтаваў выставу, прысвечаную 100-годдзю беларускага футбола. Цікава адзначыць, што ў асабістай калекцыі футбольнага «калекцыянера» налічваецца каля 5000 «профільных» праграмак і афіш, а таксама больш за 3000 кніг аб гульні нумар адзін.

Заслугі футбольнага прэс-аташэ былі адзначаны Старшынёй ГА «Беларуская асацыяцыя спартыўнай прэсы» Пятром Рабухіным, які ўручыў віноўніку ўрачыстасці Ганаровы дыплом Асацыяцыі і ўзнагародзіў журналіста каштоўным падарункам за ўклад у папулярызацыю футбола.

Як вядома, моладзевая зборная Беларусі па футболе нядаўна стала бронзавым прызёрам чэмпіянату Еўропы, які праходзіў у Данії, і заваявала пуцёўку на Алімпіяду ў Лондан разам з камандамі Іспаніі і Швейцарыі.

Азначыць гэты поспех і адкрыць выставу разам з членамі Беларускай асацыяцыі спартыўнай прэсы прыйшлі віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Генадзь Аляксеенка, Генеральны сакратар НАКа Рэспублікі Беларусь Георгій Катулін, а таксама кіраўніцтва асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» — намеснік старшыні АБФФ Сяргей Куніца, генеральны дырэктар АБФФ Андрэй Сідарэня і арбітр міжнароднай катэгорыі ФІФА Вадзім Жук.

Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь, Міністэрства спорту і турызму Беларусі, Беларуская федэрацыя футбола павіншавалі Асацыяцыю з першым «дарослым» юбілеем і ўручылі спецыяльныя ганаровыя дыпломы.

Матэрыялы падрыхтавалі У. ЗДАНОВІЧ, Б. ПРАКОПЧЫК, П. РАБУХІН.

СЦІПЛАЯ АБАЯЛЬНАСЦЬ ПРЫХАВАНАГА БАГАЦЦЯ

Ларыса ЦІМОШЫК

ЛЕТА. Усе абмяркоўваюць адпачынак. Хтосьці ўжо з'ездзіў і дзеліцца ўражаннямі. Хтосьці гэтае лета плануе правесці дома і з зайздрасцю слухае пра чужыя адкрыцці цікавых мясцін за межамі Беларусі. А хтосьці не зайздросціць!.. Таму што самыя нечаканыя адкрыцці зрабіў нікуды не выязджаючы. Наша родная краіна здольная іх падарыць. Справа толькі ў тым, ці гатовыя мы іх прыняць? Сёння ёсць цікавыя экскурсіі па Беларусі. І калі хтосьці вырашыў сэканоміць на адпачынку, але пры гэтым прагне ўражанняў, то гэта менавіта тое, што трэба. Экскурсія па Беларусі каштуе ў межах 100 тысяч на чалавека, людзі могуць дазволіць сабе такую паездку за ўвесь адпачынак. І гатовыя больш актыўна прыглядацца да роднай краіны, лічыць Алесь Варыкіш, кіраўнік фонду «Краіна замкаў», які і сам праводзіць экскурсіі. Мы з ім разважаем пра тое, чым прыцягальная Беларусь.

— За апошнія гады шмат новых маршрутаў было адкрыта, прапануюцца экскурсіі, якія сапраўды цікавыя. Вельмі прыгожыя зараз Астравецкі раён, Мосар, Гродна мяняецца і адбудоўваецца, ля горада адкрыўся цэнтр адпачынку, Каробчыцы былі даробленыя. За апошнія дзесяць гадоў вельмі пераўтварыўся Магілёў, стаў прыгожым, цікавым горадам. Ёсць цудоўнае месца — Пустынкі, якое было вельмі зарослае, запушчанае, а з 2003 года яго пачалі прыводзіць у належны стан — аднаўляецца праваслаўны манастыр, і людзям хочацца ўбачыць дзівосны абраз Хрыста, які праступіў на сцяне. Гэта пакідае моцнае ўражанне. Прыгожы горад Мсціслаў... Ды што казаць? У нас шмат мясцін, вартых таго, каб іх пабачыць.

— Калі вы асабіста сталі адкрываць для сябе Беларусь?

— У студэнцкія часы. У мяне была цудоўная кампанія, з якой мы вельмі шмат ездзілі, абы не сядзець на месцы: у Польшчы, Чэхіі бывалі, па Беларусі ездзілі. У тыя часы ў мяне атрымалася пабачыць вельмі шмат куткоў, якія мяне здзівілі. Я бачыў Любчанскі замак яшчэ ў той момант, калі ім ніхто не займаўся. Ён быў закінуты, зарослы ліпамі, кустамі. І ўвесь час пасля такіх вандровак з'яўляліся думкі: было б класна, каб нехта ўзяў і па гэтых мясцінах зрабіў экскурсійную праграму! Зразумелая справа: калі спадзяешся на некага — значыць, рабі сам. Так атрымалася, што з 2007-га года мы пачалі актыўна працаваць у гэтым накірунку.

— А ў вас самога ёсць любімы маршрут, які б вы параілі іншым?

— Я ў першую чаргу буду раіць экскурсіі з анімацыйнай праграмай. Я бачу, што гэта людзям вельмі падабаецца. Мая любімая праграма называецца «Шляхецкая гісторыя». Калі мы едзем па шляхецкіх дварах, праз Плябань, праз Залессе Агінскіх, праз Кушляны Багушэвіча, далей на Ашмяншчыну. Калі я там экскурсаводам працую, то іграю ролю пана Невяроўскага, і мая задача — прыжаніць майго брата, пана Грабоўскага. Мы да гэтага Грабоўскага едзем у Плябань, з ім знаёмімся, гутарым, пасля ён згаджаецца паехаць на агледзіны, едзем у Залессе — там паненка, закручваецца інтрыга... У гасцей цэлы сюжэт разгортваецца перад вачыма, разварочваецца паралельна тым гістарычным аб'ектам, на якія яны глядзяць. Калі гісторыя пададзена ў тэатралізаванай форме, то яна ажывае на фоне архітэктурных аб'ектаў, пра якія часта даводзіцца чуць, што яны ў нас сціплыя (у параўнанні з іншымі краінамі). Напрыклад, мы выкупілі шляхецкі дом 1918 года, яго рэканструюем, рэстаўруем. Фінальны пункт гэтай праграмы адбываецца ў гэтым доме. Госці штурмуюць двор, дзе заселі жандармы, вызваляюць жаніха, пасля за сталы сядаюць — музыка тых часоў, танцы. Мы робім майстар-клас па старасвецкіх танцах: паланэз, кракавяк, падэспань. Гучаць жарты, тосты шляхецкія, каб адчувалася адпаведная культура, традыцыі, дух.

— Ведаю, што фонд «Краіна замкаў» бярэцца апекавацца нейкімі гістарычнымі будынкамі. Што гэта вам дае, акрамя галаўнога болю? І як рэагуюць на вашу актыўнасць мясцовыя жыхары?

— Мы можам запісаць на свой рахунак тое, што выратавалі тры шляхецкія сядзібы. Адну ў Валожынскім раёне разбівалі, мы яе банальна адбілі. Другую я дапамог чалавеку выкупіць на аўкцыёне — гэта будынак, які хутка збіраліся разбіраць на дровы ці яшчэ на што. Трэці дом таксама чалавек хацеў разбіраць і перавозіць у Смаргонскі раён — я яго выкупіў у гаспадыні. Усе тры аб'екты не мелі ахоўнага статусу. Але ўсе яны даволі цікавыя. Адзін — фальварак канца XIX стагоддзя, другі — гіганцкі панскі дом 1828-га года ў Бенюнах, на Ашмяншчыне. Трэці — шляхецкі хутар, пабудаваны ў 1918-м годзе.

Так, узяцца за ўсё адразу даволі складана. Адзін будынак пакуль закансервавалі, але трэба прымаць рашэнне, каб яго цалкам даводзіць да розуму. Мы разумеем, што на нейкую фінансавую дапамогу разлічваць не можам. Але нарматыўныя акты, прынятыя ў краіне, спрыяюць нам. Па-другое: адчуваем прыязнае стаўленне мясцовых адміністрацый. У Валожынскім і Ашмянскім раёнах мы сустракалі пазітыў і канструктыў. У Ашмянскім раёне былі канкрэтныя крокі, каб зэканоміць нашы сродкі, дапамагчы пры адбудове будынка. Маёнтак толькі купілі, а праз дарогу стаяў стары хлеў для кароў. Дык прыгналі трактар, каб яго знесці. Сваімі сіламі мы не змаглі б гэта зрабіць. Разбітая халупа стаяла б і псавала ўвесь выгляд. Мясцовыя жыхары таксама зацікаўлены — з аднаго боку, некаторыя з іх працуюць у брыгадзе на гэтым аб'екце. А з другога — прыязджаюць турысты, ім цікава і грошы зарабляюць.

— Турысты — людзі, якім вы адкрываеце Беларусь. Ці гатовыя яны здзіўляцца нашай краіне?

— Усё залежыць ад таго, як ты ўсё пакажаш, як падасі. Калі ты сам камплексуеш наконт сваёй гісторыі і свайго паходжання, то і іншыя будуць на цябе так глядзець. А калі з гонарам распавядаць, то і гісторыя ўспрымаецца адпаведна. Вось, напрыклад, мы пачалі распрацоўваць шляхецкую культуру: беларуская эліта, гусары, шаблі, — гэта ж рамантыка, паэзія. Але яшчэ трэба зважаць на той момант, што галоўныя нашы турысты — гэта рускія. Некаторыя моманты з нашай гісторыі ім цяжка зразумець. Напрыклад, у праграме «Шляхецкая гісторыя» ёсць некаторыя героі, якія чакаюць прыходу Напалеона. Расіянам цяжка гэта зразумець, як і расповеды пра нашы паўстанні.

— Бываюць ідэалагічныя спрэчкі?

— Час ад часу бывала. Калі мы распавядалі пра касцёлы, заходзілі то ў адзін касцёл, то ў другі, то нам чалавек з Расіі заўважыў, што мы займаемся прапагандай каталіцызму. Была група з Расіі, я сказаў, што некалі на нашай тэрыторыі славяне мяшаліся з балтамі, як у Расіі яны мяшаліся з фіна-угрмі ці татарамі. Да мяне на перапынку падыходзяць: «Навошта вы пра татар кажаце?...» Усю дарогу мы імкнуліся больш мякка падаваць некаторыя факты — паўстанні ды войны з Масковіяй.

А бываюць і кур'ёзы. Аднойчы мы праязджалі Іўе. Расійскія турысты пытаюцца: «Што гэта за назва горада — «Адзін у.е.?» Кажам, магчыма, распродаж... Ці аднойчы ішлі з групай да Нясвіжскага замка, а ехала пані на веласіпедзе. Я кажу: «Госці, расступіцеся, прапусціце, Радзівілы на каретах едуць». А жанчына са мной параўнялася: «З дарогі, смецце, шляхта едзе!» І паехала задаволеная.

— У расіян звычайна такое меркаванне, што беларусы і рускія — амаль адзін народ. Пасля экскурсій іх уяўленне пра беларусаў мяняецца?

— Гэтае меркаванне ўжо не звычайнае, бо час ідзе. У іх ёсць разуменне, што мы іншы народ, і не толькі наконт мовы, а наконт ментальнасці, звычак, тэмпераменту, традыцый і ўсяго разам. Мне нават казала жанчына, якая вазіла да нас групы з Расіі: «Як пачала да вас ездзіць, зразумела, што вы іншыя».

— Хто больш чуйна рэагуе на нашу гісторыю — расіяне ці беларусы?

— Нашы, дакладна. Для прыехаўшых гэта — забава. А для нас — прыцэл у сэрца. Былі ў мяне такія водгукі, калі людзі казалі: «За адзін дзень маё светаўспрыманне змянілася на 180 градусаў. Мы думалі, што наша гісторыя другасная. А тут аказваецца, што мы багатыя, ды толькі не ведаем пра гэта». Зараз у нашых людзей ёсць голад, прага да слаўнай сваёй гераічнай гісторыі. Нашым людзям цікава дазнацца пра свае карані.

— Хто звычайна ездзіць у такія вандроўкі?

— Калі мы пачалі рабіць анімацыйныя праграмы на экскурсійных маршрутах, то ў іх паехала шмат моладзі. Ездзяць кампаніяй, і ездзяць сем'і, і больш сталыя людзі. Прыемна бачыць, калі паехала моладзь на анімацыю першы раз, а потым паехала на наступную экскурсію, і яшчэ на адну. Таму што ёсць маладыя экскурсаводы, якія могуць цікава распавядаць. Цікавасць людзей залежыць ад экскурсавода, які здольны трымаць увагу. Таму што людзі ездуць на адпачынак, а ты мусіш іх перайграць, каб яны перад адпачынкам паслухалі і задумаліся.

— Але ж трэба казаць пра нейкія канкрэтныя гістарычныя факты? Пра іх таксама трэба ведаць экскурсаводу.

— Ёсць тэхналагічныя карты і метадычныя распрацоўкі, якія зацверджаны Нацыянальным агенцтвам па турызме, мы гэтага прытрымліваемся. Ёсць вельмі моцныя спецыялісты, якія дзесяцігоддзямі гэтым займаюцца. Трэба разумець, што ў глыбіні навукі мы ўсё-такі не лезем, мы займаемся папулярызацыяй гісторыі.

— Які з вашых маршрутаў найбольш хітовы?

— Анімацыя. Адзін з іх — «Шлях караля Міндоўга», калі мы едзем у Мір, замак Любча, Навагрудак, Свіцязь. У Любчы мы сустракаем Міндоўга, у Навагрудку мы яго караную, пасля ён гіне. На Свіцязі вольны час, фаер-шоу. Мы пяты год праводзім яго, і ёсць цікавасць. Гэты маршрут ужо сёлета можа стаць міні-фэстам.

— А паездкі да помнікаў, да якіх сёння скіраваная асаблівая ўвага дзяржавы — Мір, Нясвіж?

— Вядома, ёсць. Нават калі іх яшчэ не падымалі, то мы вазілі экскурсіі. У Ружаны ёсць экскурсія, называецца «Архіпелаг Сапегаў». Зараз Косава аднаўляюць, можна паглядзець вакол замка, зайсці ў музей Касцюшкі, пасядзець на востраве кахання, зайсці ў карчму. У Ружанах руіны зараз адкрыты і можна зайсці ў музей, паглядзець экспазіцыю.

— Ёсць меркаванне, што беларуская гісторыя — не вельмі цікавая для турызму глеба, у адрозненне ад прыроды. Ці можа беларуская гісторыя прыносіць прыбытак турызму краіны?

— Наш прыклад, лічу — самы яскравы. Гісторыя прыносіць дывідэнды. На гэтых вобразах, на рыцарах, на старасвецкай музыцы, на дудах, танцах мы трымаемся. У чыноўнікаў можа быць адно меркаванне, у практыкаў — іншае. Гісторыя наогул ураўнаважвае. Не ведаю, як трэба чытаць і не разумець, не любіць яе. У нас была свая шляхта, рыцарства, то гетманы, то паўстанцы... Была свая эліта. Столькі захапляльных інтрыг!

Такія вобразы з гісторыі, як у нас, не ў кожнага народа (нават еўрапейскага) ёсць.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.14	21.17	16.03
Віцебск —	4.57	21.13	16.16
Магілёў —	5.04	21.07	16.03
Гомель —	5.08	20.57	15.49
Гродна —	5.31	21.31	16.00
Брэст —	5.39	21.25	15.46

Месяц

Маладзік 30 ліпеня.
Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Анісіма, Івана, Сцяпана.*
К. *Марты, Наталлі, Юліі, Рудольфа, Фелікса, Юрыя.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



27 ліпеня

Дзве даты

1990 год — Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У Дэкларацыі гаварылася, што Вярхоўны Савет абвяшчае «поўны дзяржаўны суверэнітэт БССР як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах» і заяўляе аб імкненні стварыць прававую дзяржаву. Такім чынам Канстытуцыя і законы рэспублікі набылі прыярытэт над заканадаўствам СССР. Суверэнітэт зацвярджаўся ў імя найвышэйшых мэт — свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна рэспублікі на аснове забеспячэння правоў асобы. Прыняцце Дэкларацыі абумовіла развіццё прававых нормаў: грамадзянства Беларусі, непадзельнасць і недатыкальнасць тэрыторыі, уласнасць беларускага народа на зямлю, нетры, паветраную прастору, нацыянальныя, культурныя і гістарычныя каштоўнасці, права на стварэнне сваіх фінансава-крэдытнай і грашовай сістэм, права заключаць саюзы з іншымі дзяржавамі і выходзіць з іх і г.д. 5 жніўня 1991 года 5-я пазачарговая сесія Вярхоўнага Савета Беларусі надала Дэкларацыі статус канстытуцыйнага закона.

1147 год — як сцвярджаецца ў аповесці «Сказ аб забойстве Данілы Суздальскага і пачатку Масквы», у гэты дзень была заснавана Масква.

Цытата дня:

«Аб кім бы мы ні плакалі, мы плачам аб сабе».
Эміль Кроткі (1892—1963), рускі паэт-сатырык.

ШТРАФ І КАНФІСКАЦЫЯ «ШЭРЫХ» ТЭЛЕФОНАЎ

У 25-гадовага магілёўчаніна канфіскавана партыя нелегальных мабільных тэлефонаў і аксесуараў да іх на суму ў 14 мільёнаў рублёў.

Супрацоўнікі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Магілёўскай вобласці ўстанавілі, што 187 адзінак тэхнікі рэалізоўваліся без дакументаў, якія б пацвярджалі іх якасць, і без дзяржаўнай рэгістрацыі прадаўца ў якасці прыватнага прадпрымальніка.

Магілёўчанін займаўся такой дзейнасцю каля паўгода, і ў яго знойдзены 13 SIM-карт тэлефонаў, нумары якіх размяшчаліся ў рэкламных аб'явах. За гарантыю пакупнікі звычайна плацілі дадаткова 5 долараў, хоць абмену тэлефоны ніяк не падлягалі, таму што выраблялся ў Кітаі і набываліся на аптовых рынках Масквы без суправаджальных дакументаў.

Суд вырашыў прыцягнуць парушальніка да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў 175 тысяч рублёў, з канфіскацыяй тэлефонаў.

Ілона ІВАНОВА.

ГРЭЧКА

Грэчка ці грэцкая каша ў народнай культуры заўсёды былі сімвалам і ўвасабленнем дабрабыту і багацця. Увогуле, з грэчкай у славян было звязана шмат паданняў. Часцей за ўсё падкрэсліваюць паходжанне грэчкі з татарскіх земляў і яе часам завуць «татаркай». У адной з казак распавядаецца, што яна паходзіць ад «быццам бы ўзятай у палон злосным татарынам царс кай дачкі Крупянічкі, ператворанай дзеля выратавання ад татарына ў грэцкае зернятка. Сталая жанчына, якая праходзіла праз Залатую арду Басурманскую, прынесла зярнятка на Святую Русь, схавала яго на святой зямлі, на шырокім прывольным палетку. І пайшло тое зярнятка ў рост, і вырасла з яго грэчка на 77 зярнятак. Павеялі вятры з усіх бакоў, разнеслі тыя 77 зярнятак на 77 палеткаў. З тых часоў на Святой Русі распладзілася грэчка».

● Акуліна-грачышніца. Усе звычаі гэтага дня былі звязаны з грэчкай. Яе маладыя парасткі не вытрымліваюць нават лёгкіх маразоў, а ў сярэдняй паласе Расіі замаразкі заканчваюцца толькі ў сярэдзіне чэрвеня. Але да гэтага часу мінаюць усе тэрміны сяўбы збожжавых культур. І таму з пасевам грэчкі трэба было быць вельмі асцярожнымі.

● Сяляне, улічваючы шматвяковы вопыт, казалі: «Сей грэчку на Акуліну», а яшчэ дакладней: «Грэчку сей ці за тыдзень да Акуліны, ці на тыдзень пазней».

● Калі грэчка пачынала квітнець, з поля зрывалі невялікія пучкі і ўпрыгожвалі ў хаце вобраз святой Акуліны.

● Аднак непасрэдна на Акуліну што-небудзь рабіць у полі ці на агародзе забаранялася: «На Акуліну не працуй, каб грэчка добра радзіла».

● У гэты дзень у імя святой Акуліны нашы продкі-славяне варылі «мірскую кашу» — для бедных і вандроўнікаў. Да гэтага часу ў сялян ужо заканчваўся мінулагодні ўраджай, і «мірская Акулініна каша» варылася з апошніх, прыхаваных да гэтага часу круп. Святую пакутніцу Акуліну ўсхвалялі грэцкай кашай — «галоўнай» з сялянскіх каш.

● Аб карысных для здароўя чалавека якасцях грэчкі было вядома здавён. Грэцкую кашу лічылі ежай волатаў.

● Часцей за ўсё грэчкай лячылі захворванні страўніка: пякотку і жаўтуху.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

НАШ КАНСУЛЬТАНТ

Ім з'яўляецца Аляксандр Палявы. Свой шлях у шашках ён пачаў з завочнай гульні, турніры па якой праводзіў часопіс «Шашкі» (Рыга). Паступова выканаў норму кандыдата ў майстры. У 1977 годзе пасля заканчэння Фрунзенскага палітэхнічнага інстытута працаваў на інструментальным заводзе інжынерам-канструктарам, выступаў за прадпрыемства па шашках і адразу пацвердзіў сваё спартыўнае званне (тады ў Кіргізіі спаборніцтвы з нормай майстра не праводзіліся). Адначасна захапіўся задачамі, калі ў кнізе Б. Герцэнзона «Поспеши, Юлиус!» азнаёміўся з задумкай Г. Бяляніна. Свае ўласныя творы друкаваў у тым жа выданні, якое фактычна было ўсесаюзным. Ідэя стварыць электронную базу задач узнікла пасля набыцця праграмы «Аўрора». У 2009-м яму стаў дапамагаць Юрый Голікаў (Расія). Яны аб'ядналіся з Антанасам Гімбутасам (Літва) і Аляксандрам Ляхоўскім (Беларусь) і цяпер учатырох збіраюць не толькі задачы, але і эцюды і праблемы на 64 і 100-клетачных дошках. Іх картатэка, бадай, самая багатая ў свеце, яна паказвае колькасны і якасны стан шашачнай кампазіцыі, ахоўвае правы яе аўтараў. Нарадзіўся кампазіцыянер у 1952 годзе, жыве зараз у Ізраілі ў г. Арадэ.

Звяздоўскую рубрыку «Шашкі» праглядае на сайце «Шашки в России», дзе яе змяшчае пастаянны чытач нашай газеты з Наваполацка Пётр Шклудаў. Свае заўвагі аналітык дасылае нам па электроннай пошце. Напрыклад, у пазіцыі № 7 І. Івацкі (выпуск шашак за 16. 06. 2011 г.) ён знайшоў прыватную пабочную развязку: 1. 43-39 44:13 2. 17-12 36:38 3. 12:05 06:17 4. 24-20 25:14 5. 05:30 (5. 05:26 40-44 6. 26-17х) 5...35:24 6.45:34х.

Адна з задач А. Палявога змешчана ў кнізе Г. Далідовіча і І. Стрэльчыка «Задачы-мініяцюры ў міжнародных шашках» (Мінск, «Полымя», 1985). Развяжыце яе ў якасці бліца-62/2:

Белыя: 9, 15, 17, 23, 31, дамкі 16, 18 (7). **Чорныя**: 5, 6 (2). Замкнуць сваю простую.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ-2011»

Гэты конкурс рашэнняў на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) мы праводзім у восьмы раз. Сёння прапануем заданне № 11: **Белыя**: a7, c5, c7, f4, h6 (5). **Чорныя**: a3, b4, c3, f2, f8, g7, h4 (7). Выйгрыш.

АЎТАРСКІ-14

Яго працягвае міжнародны майстар Віктар Шульга (Мінск) заданнем № 16:

Белыя: 45, дамка 50 (2). **Чорныя**: 9, 13, 25, 30 (4). Таксама перамога белых.

8 ліпеня змешчаны: у натацыі — заданне № 9 конкурсу «Пагода ў доме-2011» і № 15 аўтарскага-14, на дыяграмах — № 10 першага конкурсу і № 22 аўтарскага-13.

***

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: ***220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».***

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Бліц-60/4 (М. Грушэўскі): 1...f4-g3!! 2.e5:a5 g3-h2 3. a5-b6 e7-f6 4. b6-c7 h2-g1 5. e3-f4 g5:e3 6. d2:f4 g1-h2=. Заўважыў майстар ФМЖД С. Бурко (Орша).

«Пагода ў доме»-8/6 (М. Грушэўскі): d8, e5, b4!, b8 (d4) f4 (c3) c1x.

Аўтарскі-13/20 (Л. Вітошкін): b8 (b2A) f6, a1x. A(f6) d8 (d2B) b4, f6, c1x. B(b2) b4, b4, b6, a1x.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Амальгама. Фішар. Пара. Гол. Зона. Гук. Корт. Вада. «Ява». Таль. Цені-кан. Ара. Піла. Анод. Ліла. Адзе-жа. Цукар. Кліск. Кедр. Даміно. Ліда. Ака. Пляж. Дакат. Пагоня. Акра. Жах. Карціў. Таварыш. Ара. Арфа. Анаід. Атака. Іргаз. Зумер. Куб. Абшар. Арама. Оля. Тар. Рот. Акоп. Вата. Пара-да. Гальк. Сок. Лоціка. Спаскі. «Ліда». Катрынка.

Па вертыкалі: Тэлескоп. Ліцей. Кроль. Кума. Абарыгенка. Оля. Тар. Рот. Акоп. Вата. Пара-га. Зумер. Куб. Абшар. Арама. Ара. Арфа. Анаід. Атака. Іргаз. Карціў. Таварыш. Кедр. Даміно. Ліда. Ака. Пляж. Дакат. Пагоня. Акра. Жах. Кліск. Цукар. Пляж. Гол. Зона. Гук. Корт. Вада. «Ява». Таль. Цені-кан. Ара. Піла. Анод. Ліла. Адзе-жа. Фішар. Пара. Гол. Зона. Гук. Корт. Вада. «Ява». Таль. Цені-кан. Ара. Піла. Анод. Ліла. Адзе-жа. Амальгама.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3570. Нумар падпісаны ў 19.30 26 ліпеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Здарэнне

ВЫРАТАВАЛІ МАЦІ З МАЛЕНЬКІМ СЫНАМ

Пра пажар у кватэры па вуліцы Чарняхоўскага ў Віцебску ў 3.45 у мясцовае падраздзяленне МНС паведаміла суседка.

Ахопленыя полымем вокны на чацвёртым паверсе пяціпавярховага жылога дома, моцна задымлены пад'езд — такую карціну ўбачылі выратавальнікі, якія былі на месцы здарэння праз тры хвіліны. З апошняга паверха яны выратавалі жанчыну з аднагадовым сынам, яшчэ пяць чалавек эвакуіравалі. Як мяркуецца, прычына пажару — кароткае замыканне халадзільніка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Усміхнёмся

У Расіі два лепшыя заспакаяльныя — мацюкі і гарэлка.

☺

Двое сяброў.
— Прывітанне! Як жыццё?
— Ды вось, з'явілася стварэнне, пра якое трэба клапаціцца, зарабляць грошы...
— Ну, нарэшце! Віншую! Як яе завуць?
— «Мазда»!

☺

— Каханая, ты заблакавала наш камп'ютар?
— Так.
— І які пароль?
— Дата нашага вяселля.
— Халера... Ненавіджу!

☺

Колькі Пятровіч ні спрабаваў зрабіць з вады, дражджэй і цукру квас — увесь час атрымлівалася самагонка.